
ВАСІЛЬ СУПРУН

За смугою часу



ВАСІЛЬ СУПРУН

За смугою часу

(ДАСЛЕДАВАННІ І МЕРКАВАННІ)

МІНСК
„ПОЛЫМЯ“
1994

ББК 63.3(4 Беи)
С 89
УДК 947.6+902(476)

Прадмова Г. Каханоўскага

Супрун В.
С 89 За смугою часу: (Даследаванні і меркаванні) / Прадм. Г. Каханоўскага. — Мн.: Полымя, 1994. — 144 с.: іл.
ISBN 5-345-00716-0.

Кніга з'явілася вынікам шматгадовых археалагічных і гістарычных даследаванняў аўтара. У ёй робіцца спроба асвятліць многія яшчэ не да канца вывучаныя моманты беларускай даўніны; прычым выказваюцца неардынарныя меркаванні па тых ці іншых пытаннях мінулага. Адкуль пайшлі беларусы, ці існуе залежнасць паміж перамяшчэннем скандынаўскіх вікінгаў і ўсходнеславянскіх русаў, як узніклі старажытныя княжацкія імёны, дзе знаходзіцца гістарычны цэнтр Слоніма (аказваецца, не там, дзе яго шукалі археолагі), хто з'яўляўся фундатарам Сынковіцкага і Маламажэйкаўскага храмаў-крэпасцей і калі на самой справе яны былі заснаваны, гістарычны лёс Жыровіцкай святыні — сусветна вядомага манастыра — вось няпоўны пералік тэм артыкулаў і нарысаў, сабраных пад адной вокладкай.

С 9470600000 — 010 / М306(03) — 94 00 — 94

ББК 63.3(4 Беи)+63.4(4 Беи)

ISBN 5-345-00716-0

© В. Р. Супрун, 1994

СЛОВА ПРА АЎТАРА

Ужо даўно я сустракаў у друку імя Васіля Супруна. Ён тады падпісваўся сціпла — рабочы, краязнавец. Мяне гэта інтрыгавала, бо, згадзіцеся, не зусім звычайнае захапленне — помнікі археалогіі роднага краю. Сустракацца з ім неяк не выпадала, і я доўга нічога не ведаў пра яго. Жыве сабе ў Слоніме нейкі аматар і ўсё. Толькі ў апошнія гады Васіль Рыгоравіч падзяліўся сваімі ўспамінамі пра перажытае. Трохі стала ясней пра гэтага чалавека. Неўзабаве і асабіста ўдалося з ім сустрэцца ў Акадэміі навук.

А перажыць яму было што. Найстрашнейшыя сталінскія катоўні ў Інце і Варкуце. А потым цяжкая паласа непрызнання. Усялякага хлеба перакаштаваў. Каля 25 гадоў працаваў на будоўлях, быў шахцёрам, вартаўніком, настаўнікам, навуковым супрацоўнікам музея і інш. Скончыў Слонімскую настаўніцкую семінарыю, Ганцавіцкае педвучылішча, Менскі педінстытут. У 1986 годзе пайшоў на пенсію. Кароткі пералік штрыхоў біяграфіі краязнаўца, але штрыхі тыя сядзяць рубцамі ў яго памяці. Напорыстасць і любоў да родных ваколіц ніколі не пакідалі Супруна. Які рабочы пасля нялёгкага дня адважыцца, сеўшы на веласіпед, ехаць кудысьці далёка, рабіць разведку і зацемкам вяртацца дамоў, каб назаўтра зноў узяцца за кельму. А Васіль Рыгоравіч знаходзіў час і сілы, каб усё выяўленае і даследаванае ў сістэматызаванай форме данесці ў Акадэмію навук на канферэнцыі археолагаў. Ды яшчэ і публікаваўся. Атрымаў нават адкрыты ліст на правядзенне раскопак.

І вось яна, першая кніга ўпартага краязнаўца.

Большасць артыкулаў ужо раней публікаваліся. Цяпер жа будзе больш выразней выглядаць асоба следапыта. Не з усімі яго высновамі можна пагадзіцца, але ж калі нешта забараняць і не друкаваць, то тады ніколі не пачуем жывы голас і думкі даследчыка. Так што няхай ідзе да чытача так, як мяркуе сам Васіль Рыгоравіч Супрун. Гэта яго права. Мяне ў ім падкупляе захопленасць ідэяй, добрай справай. А яшчэ наш аўтар — паэт. Не выключана, што чытач атрымае адразу дзве яго кніжкі.

Генадзь Каханоўскі,
доктар гістарычных навук

ПРЫЦЯГНЕННЕ

(ЗАМЕСТ ПРАДМОВЫ)

Была вясна 1963-га. Недзе далёка засталіся Інта, Варкута, Імжа і балючы смутак па Беларусі і волі. Зноў перад вачыма Слонімшчына — цудоўны край маіх бацькоў і дзядоў. Як ніколі раней, захацелася прыслухацца да голасу роднай зямлі, улавіць і зразумець тую магутную сілу, якой яна на працягу стагоддзяў прыцягвала да сябе маіх продкаў і якой так моцна прычаравала мяне. Ніколі не забываючы Бацькаўшчыну, я на чужыне сэрцам адчуваў яе пяшчотнае цяпло. І як жа дорага ў расстанні адно толькі разуменне, што ты часцінка, прадстаўнік Беларусі! Можа гэта і дапамагло выжыць, дапамагло застацца сабой і пранесці чыстую любоў да ўсяго свайго, беларускага.

І вось тады, вярнуўшыся ў родныя мясціны, але не маючы ніякуткай магчымасці для духоўнай творчасці на карысць свайго народа, яго культуры, я вырашыў здзейсніць даўнюю мару — заняцца даследаваннем старажытнасцей краю. Гэта было зусім апалітычна і не пагражала новымі рэпрэсіямі ні сям'і, ні акружэнню, а для душы давала такую неабходную аддушыну. Праўда, пільнае вока нагляду вельмі абмяжоўвала магчымасць задумы. Ды і ў першую чаргу належала клапаціцца аб сродках для існавання. Працаваць жа дазвалялася толькі на цяжкіх фізічных работах і на відавоку агентаў. Аднак прага духоўнага жыцця і хоць абмежаванай патрыятычнай дзейнасці перамагала ўсе перашкоды, акрыляла мяне. Хацелася паспрабаваць свае сілы ў зусім незнаёмай галіне — археалогіі. Тым больш што на вачах старанна знішчаліся адзіныя сведкі сівой даўніны: старажытныя гарадзішчы ператвараліся ў жвіравыя кар'еры, могільнікі — у зрэзаныя бульдозерамі пустэльні, стаянкі і селішчы — у будаўнічыя пляцоўкі пад свінарнікі. Я прагнуў пранікнуць у таямніцы археалагічных культур, знайсці адказы на шматлікія загадкі мінулага, раскрыць хоць


некаторыя белыя плямы ў гісторыі нашага народа. Канешне, без спецыяльнай падрыхтоўкі і ведаў рабіць тое даволі складана, але пры жаданні набываецца ўсё.

Цяжка працуючы на будоўлі, я ўсё ж пасля работы садзіўся на веласіпед і да змяркання даследаваў наваколле, фіксуючы і апісваючы ўсе выяўленыя археалагічныя помнікі, у першую чаргу курганы, старыя грунтовыя могільнікі, умацаваныя гарадзішчы і яўна выражаныя селішчы. Адкрыццё кожнага новага, раней невядомага помніка падбадзёрвала — гэта быў крок да пазнання мінулага.


Я прагна вышукваў і перачытваў спецыяльную літаратуру. Асабліва цікавай і карыснай для мяне аказалася выдадзеная ў 1962 годзе кніга ленінградскага вучонага, спецыяліста па археалогіі Прыбалтыкі і Беларускага Панямоння Ф. Д. Гурэвіч «Древности Белорусского Понеманья». У ёй даваліся не толькі апісанні помнікаў, іх здымкі і замалёўкі знаходак, у тым ліку і са Слонімшчыны, але і рабілася спроба вызначыць і датаваць археалагічныя культуры. Карацей кажучы, кніга стала маім першым падручнікам і археалагічным даведнікам. Звяртаючыся да яе, можна было параўноўваць вынікі сваіх даследаванняў і атрыманыя матэрыялы, рабіць пэўныя меркаванні і нейкія высновы.

З часам даведаўся, што Слонімшчына ўжо даследавалася шэрагам археолагаў, але імі знойдзена толькі нязначная частка існаваўшых помнікаў краю. Дэталёвай жа археалагічнай разведкай не займаўся ніхто, бо гэта патрабавала нямала часу. Я ж, пачынаючы такую вялікую працу, не імкнуўся да сенсацыйнага эфекту, бо нават не меркаваў, што на маю долю засталося так многа яшчэ невыяўленага і зусім невядомага.


Адкрыўшы для сябе гэткі цікавы і захапляючы напрамак духоўнай дзейнасці, я аддаўся ёй поўнасцю. Кожны дзень пасля работы спяшаўся ў поле, лес, ці на луг, захапіўшы з сабой невялічкую рыдлёўку, пачак пустых пакетаў, блакнот і аловак. Вяртаўся вечарам змучаны, але з настроем, хоць не заўсёды такая вандроўка была плённай. Потым да глыбокай ночы матэрыялы апрацоўваў, апісваў і зарысоўваў, складаў планы на заўтра. І так кожны дзень — у пагоду і ў дождж, у выхадныя і ў час водпуску. За вясну, лета і восень 1963 года даследаваў значную частку Слонімшчыны, нанёс на схему раёна і апісаў дзесяткі выяўленых помнікаў, сабраў некалькі скрынак археалагічных матэрыялаў, пераважна керамікі, крамянёвых вырабаў шлакаў ад выплаўкі жалеза з балотнай руды, крыц і каменных адбойнікаў.




Гарадзішча XI—XIII стст. на ўскраіне Слоніма, побач з Косаўскім трактам



Роў і валы гарадзішча XI—XIII стст. каля вёскі Збочна Слонімскага раёна



Від на гарадзішча "Акоп" паблізу вёскі Асабнякі Слонімскага раёна




Хутар на тэрыторыі гарадзішча каля вёскі Пархуты
Дзятлаўскага раёна

Зімой прадставіў справаздачу з апісаннем праведзенай археалагічнай разведкі, малюнкамі і цікавейшымі знаходкамі ў сектар археалогіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Навукоўцы з цікавасцю разглядвалі ўсё, распытвалі, здзіўляліся майму энтузіязму. Матэрыялы даследаванняў адобрылі, мне адразу ж выдалі адкрыты ліст на права афіцыйнай археалагічнай разведкі і шурфоўкі ў сезоне 1964 года. Завязалася добрае і цёплае супрацоўніцтва з дружным невялічкім калектывам беларускіх археолагаў.

Я зразумеў, што, працуючы ў гэтым напрамку, змагу ўнесці свой пасільны ўклад у беларускую археалагічную навуку, але патрэбна мець вышэйшую гістарычную адукацыю.

Наступны год быў яшчэ больш паспяховым. Не звальняючыся з будаўнічай арганізацыі, я змог паступіць на завочнае аддзяленне гістарычнага факультэта Мінскага педінстытута. Да таго ж удалося абследаваць значную плошчу свайго раёна. Асаблівую ўвагу прыцягнула парэчча ракі Шчары і бліжэйшае яе наваколле. Пясчаныя пагоркі хавалі тут нямала цікавых старонак старажытнай гісторыі краю. Раней я не мог нават меркаваць, што маляўнічае ўзбярэжжа гэтага буйнейшага левага прытока Нёмана было так шчыльна заселена людзьмі ўжо ў эпоху неаліту (новага каменнага веку) — 5—6 тысяч гадоў назад. Стаянкі першабытных людзей раскіданы тут на невялікай адлегласці адна ад другой.

Па ўсім відаць, што русла паўнаводнай Шчары з найдаўнейшых часоў служыла галоўнай воднай магістраллю, якая злучала басейн Прыпяцкага Палесся з Панямоннем. І адразу стала зразумелай важнасць згаданых мясцін як старажытнай кантактнай зоны між палескай і нёманскай культурамі. Археалагічныя помнікі басейна ракі, такім чынам, маглі стаць падказкай у гістарычных даследаваннях далёкага мінулага. Аднак тут неабходны грунтоўныя археалагічныя пошукі, а яны непасільны аднаму чалавеку. Я ж меў на мэце зрабіць чарнавую работу, даць у рукі вучоных схему наяўнасці і размяшчэння археалагічных помнікаў розных эпох з тым, каб на аснове ўжо праведзенай мной разведкі лягчэй было арыентавацца ў сітуацыі. Разумеў, што падняць такі пласт пры маіх магчымасцях і транспарце будзе надзвычай складана. Гэта вымагала не толькі фізічнага і маральнага напружання, але і матэрыяльных выдаткаў, падтрымкі блізкіх людзей, бо стварала пэўныя сямейныя нязручнасці. Ды ў тым і заключаўся сэнс ахвярнасці, патрыятычнага парыву.



Курганы ва ўрочышчы Соміна на ўскраіне Слоніма

1964 год як найбольш насычаны цікавымі вынікамі ўжо ставіў мяне на цвёрды грунт краязнаўства. Адначасова з археалагічнымі пошукамі я вывучаў і вёў улік архітэктурных і гістарычных помнікаў краю, сёе-тое фатаграфаваў.

За 1963—1964 гады даследаваў тэрыторыю, што ахоплівала большую частку басейна сярэдняга цячэння ракі Шчары, выходзячы за межы Слонімскага раёна. Удалося выявіць і апісаць 43 стаянкі першабытных людзей, якія адносіліся да эпох мезаліту, неаліту і бронзы, каля 120 селішчаў пазнейшага часу, 17 гарадзішчаў, 23 курганныя могільнікі, 4 грунтовыя могільнікі з каменнай выкладкай, больш за 10 кустоў па выплаўцы жалеза з балотнай руды і кавальскай яго апрацоўцы. Праўда, невялікая частка з пералічанага была ўжо адшукана раней, але апошняй разведкай пацвярджалася іх наяўнасць, удакладнялася апісанне і месца знаходжання.


Мая калекцыя так званага пад'ёмнага матэрыялу — керамікі, вырабаў з крэменю, каменных прылад, жалезных крыц і шлаку — прыцягнула ўвагу археолагаў. Для праверкі дадзеных па шэрагу выяўленых і апісаных мной аб'ектаў прайшлі затым спецыялісты з сектара археалогіі Акадэміі навук.



Курганы каля вёскі Піронім Слонімскага раёна



Курган у вёсцы Рахавічы Слонімскага раёна



Размяшчэнне археалагічных помнікаў пры ўпадзенні ракі Грыўды ў Шчару на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна (рабочая схема складзена пасля дзённай разведкі 20 жніўня 1965 года)





Схема размяшчэння археалагічных аб'ектаў у басейне ракі Шчары

Паколькі тэрыторыя маіх пошукаў усё пашыралася, а транспартныя магчымасці заставаліся тымі ж, вынікі 1965 года аказаліся больш сціплымі. На значную адлегласць можна было планаваць выезды толькі ў выхадныя дні і то не ў любую пару года, таму за сезон удалося знайсці толькі 16 стаянак эпох неаліту і бронзы, 4 селішчы пазнейшых часоў і 2 курганныя могільнікі. Маю ўвагу прыцягнуў мнагаслойны археалагічны помнік каля вёскі Русакова Слонімскага раёна. На невялікім пагорку між поплаву Шчары ў кратавінах адначасова з так званай кружальнай керамікай раннефеадальнага перыяду сустракалася і неалітычная. Шурфоўка пацвердзіла наяўнасць значнага культурнага слою і перспектыўнасць больш грунтоўнага даследавання, ды і не парослы хмызняком пагорак свабодна мог раскопвацца. З'явілася думка: а ці не паспрабаваць самому раскапаць хоць частку аб'екта, каб мець больш выразнае ўяўленне аб помніках такога тыпу і зарыентаваць вучоных ужо канкрэтнымі вынікамі.


Работы ў Русакове можна было планаваць толькі на 1966 год. Папярэдне належала ўсё ўзгадніць з Акадэміяй навук, пракансультавацца ў навукоўцаў, атрымаць адпаведны адкрыты ліст, які выдаецца акадэміяй і рэгіструецца ў Міністэрстве культуры рэспублікі.

Маю прапанову ўхвалілі і абяцалі патрэбную дапамогу. Зацікаўленасць часткова выклікалася і тым, што ўсе мае работы на працягу згаданых гадоў ні Інстытуту гісторыі, ні дзяржаве не каштавалі ні рубля.

У сакавіку 1966 года Акадэмія навук Беларусі меркавала правесці ў Мінску навуковую канферэнцыю па археалогіі Беларусі і сумежных тэрыторый. Меўся адбыцца навуковы абмен думкамі і навінамі апошніх даследаванняў не толькі між беларускімі археолагамі і гісторыкамі — туды запрашаліся і навукоўцы з суседніх рэспублік і Польшчы. Для мяне значэнне такой канферэнцыі мела надзвычайную вартасць. Па-першае, знаёмства з вядучымі спецыялістамі ў археалагічнай навуцы, іх падыходам да ацэнкі гэтай важнай гістарычнай галіны. Па-другое, з жывых вуснаў у дыскусійнай форме можна было б уведаць аб навейшых археалагічных адкрыццях, пачуць ацэнку працы беларускіх археолагаў. А што значыць пабыць ў самой атмасферы навуковага свету?! Аб удзеле ў такім форуме я мог толькі марыць. Бо вельмі нязначным быў мой уклад у навуку. Я гэта разумеў, хоць і адчуваў добразычлівасць адносін усяго калектыва сектара археалогіі. Таму вельмі здзівіла нечаканае афіцыйнае запрашэнне на канферэнцыю, ды



Мезалітычныя і неалітычныя крамянёвыя знаходкі са стаянкі Дабрынева-2 Івацэвіцкага раёна: *1—4, 7, 8* — наканечнікі стрэл; *5, 6, 9* — трапецападобныя пласцінкі; *10—18, 22* — скрабкі; *19* —разец; *20* — пласцінка; *21* — нуклеус



План курганнага могільніка паблізу вёскі Орлавічы Слонімскага раёна

яшчэ з дакладам-інфармацыяй аб сваёй рабоце і яе выніках.

На канферэнцыі прысутнічалі і рабілі даклады вучоныя з Беларусі (Мінск, Брэст, Ваўкавыск), Расіі (Масква, Ленінград, Смаленск), Украіны (Кіеў), Літвы (Вільнюс), Латвіі (Рыга). У спрэчках выступілі і навукоўцы з іншых месцаў, напрыклад Е. Антаневіч з Польшчы. Прысутнічала шмат гасцей, супрацоўнікаў музеяў суседніх краін.

Маё выступленне суправаджалася мноствам пытанняў. Вучоных цікавіла ўсё: і помнікі, і характар знаходак, і





Схема раскапанага ў 1965 годзе кургана (№ 1) каля вёскі Орлавічы: *а*) — размяшчэнне каменнай кладкі; *б*) — рэшткі розначасовых пахаванняў; *в*) — курган у разрэзе

метад разведкі. Асабліва запомніліся шчырыя і зацікаўленыя гутаркі з такімі вядучымі спецыялістамі, як Н. Гурына, П. Траццякоў, В. Сядоў, якія абяцалі сваю падтрымку ў публікацыі матэрыялаў. Аднак падрыхтавацца да друку я такі не сабраўся — не хапіла часу. Тэзісы майго даклада «Памятники каменного века и эпохи бронзы в бассейне среднего течения р. Щары. По материалам разведки 1963—1965 гг.» змешчаны ў матэрыялах канферэнцыі «Древности Белоруссии» (1966).

Археалагічны сезон 1966 года складваўся для мяне нялёгка. Праследаванні з боку палітычных органаў і ўлад узмацняліся. Але ўсё ж удалося атрымаць адкрыты ліст па форме № 1, які даваў права самастойна весці археалагічныя работы. Выязджаючы на выхадны дзень, я адзін пачаў раскопкі стаянкі-селішча Русакова-2. Помнік аказаўся цікавым. Магутнасць культурных напластаванняў дасягала 70—80 сантыметраў. Вялікая колькасць розначасовых матэрыялаў сведчыла аб тым, што помнік мнагаслойны — людзі жылі тут недзе з неаліту (каля 6 тысяч гадоў назад), магчыма, з перарывамі, аж да раннефеадальнага перыяду.

Размяшчаецца помнік на невысокім пагорку (у навакольлі называецца Літоўскі Груд або Марозава горка) у абалоне ракі Шчары. Калісьці пагорак прымыкаў да правага берага цяпер высахлага невялічкага прытока Шчары — Русакоўкі. Ад левага берага Шчары помнік аддалены прыблізна на 250—300 метраў. Раскопкі я распачаў у канцы лета і ўскрыў усяго 40 квадратных метраў. Аднак здабыў вялікую колькасць керамікі — ад вострадоннага гладкасценнага глінянага посуду з дамешкамі травы ў рошчыне да вядомых кружальных вырабаў, распаўсюджаных сярод славянскага насельніцтва перыяду Кіеўскай Русі. Знайшоў нямала рэчаў і з заштрыхаванай паверхняй, якая захоўвала сляды ад загладжвання сфармаванага вырабу змочаным пэндзлем. Посуд меў розныя памеры і формы, быў як багата арнаментаваны, так і зусім без арнаменту, з рознай таўшчынёй сценак і рознымі дамешкамі да гліны (раслін, жарствы, пяску). Натрапіў на некалькі фрагментаў так званай шурпатай керамікі, не характэрнай для данай тэрыторыі, а таксама на крамянёвыя скрабкі, разцы, праколкі, ножападобныя пласціны, рубячыя прылады, наканечнікі стрэл. Сустракаліся і каменныя шліфаваныя адбойнікі, гліняныя прасніцы і грузілы, жалезныя рыбалоўныя кручкі і інш.

Матэрыялы аб тых раскопках надрукаваны пад загалоўкам «Поселение Русаково-II» у кнізе «Вопросы истории» (Мн., 1969).



Керамічныя, каменныя і іншыя знаходкі са стаянак і селішчаў Слонімшчыны (Русакова, Шылавічы, Паўлава)

У 1967, 1970 і 1977 гадах работы на згаданым помніку прадоўжыў археолаг М. Чарняўскі.

На жаль, 1967 год прынёс мне яшчэ большыя праследаванні з боку ўладаў, што змусіла мяне пакінуць Беларусь. Прыйшлося часова выехаць у Крым, прапісацца ў Алушце. Там вывучаў чужую гістарычную спадчыну, каб затым яшчэ больш цаніць сваю. Аднак у адрыве ад Бацькаўшчыны я жыць не змог.

На Гродзеншчыну вяртацца было безнадзейна, хоць там засталіся сям'я, набытыя вынікі археалагічных пошукаў і душа. Там снаваў чорны цень праследаванняў за любоў да Беларусі, за патрыятызм. Слонімшчыну ўзялі на мушку спецкадры асобага гарту. Я тое адчуў не толькі духоўна, але і фізічна.

Затрымаўся на суседняй Берасцейшчыне. Тут дыхалася вальней. Праца ж на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка па помніках у Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі давала магчымасць працягваць археалагічныя даследаванні ў паўднёвым напрамку, хаця і заганяла ў кут матэрыяльна.

Вельмі цяжка складваўся 1968 год. Але, выконваючы планавыя работы, усё ж удавалася павярхоўна знаёміцца з археалагічнымі помнікамі краю. Абследаваў Брэсцкі, Камянецкі, Пружанскі, Івацэвіцкі, Жабінкаўскі і Столінскі, а пазней Баранавіцкі і Ляхавіцкі раёны, а менавіта ўжо Палессе і паўночную яго перыферыю. Мяне тутэйшая даўніна цікавіла не менш, чым старажытнасці Панямоння. Шчара якраз злучала два гэтыя археалагічныя масівы. Уплывы палескіх культур на культуру басейна Шчары льга ацаніць, толькі ведаючы асаблівасці археалагічных помнікаў Палесся.

Праўда, для сур'ёзнага аналізу і вывадаў не хапала дэталёвага вывучэння археалагічных комплексаў розных часоў, але тое было немагчыма ў маіх умовах. Хацелася ж выхапіць хоць частку з таго, што цікавіла. У тым сезоне ўдалося выявіць і павярхоўна даследаваць 19 курганных могільнікаў, 10 стаянак эпохі каменя і бронзы, 1 селішча жалезнага веку, 1 гарадзішча і 2 умацаваныя феадальныя сядзібы. За выняткам некалькіх, аб згаданых аб'ектах раней археолагі не ведалі.

Асобную і малавядомую мне групу помнікаў складалі курганныя могільнікі з каменнай абкладкай насыпаў ля падножжа або суцэльным вымошчваннем буйнымі камянямі ўсёй паверхні кургана. Яны сустракаліся пераважна ў Камянецкім раёне. Прытым форма насыпаў і памеры іх неаднолькавыя — ад невялікіх і расплывістых да значных па дыяметры і вышынёй больш за метр. Трапляліся такія

могільнікі ўперамежку з курганамі без камянёў, што магло сведчыць аб колішнім змешаным насельніцтве краю.

Праведзеныя раней — у 1959—1962 гадах — супрацоўнікамі Брэсцкага краязнаўчага музея раскопкі паказалі: і пахавальны абрад, і рэчавы матэрыял з так званых каменных курганоў блізкія да славянскіх. Найбольш характэрныя могільнікі такога тыпу меліся каля вёсак Трасцяніца, Свішчова, Лысоўчыцы, Ратайчыцы, Кустычы, Гуркі, Баранкі (некаторыя раскапаны).

Пэўны інтарэс выклікала абнесеная высокім земляным валам (да 3 метраў) тэрыторыя плошчай каля 8 гектараў паблізу вёскі Крыўляны Жабінкаўскага раёна. Верагодна, тут стаяла сядзіба аднаго з мясцовых землеўладальнікаў, хаця слядоў нейкіх забудоў не знойдзена. Вылучаюцца ў гэтым раёне ў археалагічным плане і ваколіцы вёскі Мышыцы. Ва ўрочышчах Заставочча і Грудзіца выяўлены 3 неалітычныя стаянкі, а побач з вясковымі могілкамі — 12 нізкіх (40—80 сантыметраў) расплывістых круглых курганоў дыяметрам 7—15 метраў. Падобнай формы помнікі мне не сустракаліся нідзе.

Не менш цікавым і багатым на археалагічныя аб'екты аказаўся і Столінскі раён, асабліва наваколле вёсак Вялемічы, Дубой, Атвержычы, Хатомель. Селішчы, гарадзішчы і курганы тутэйшых мясцін прыцягвалі ўвагу не толькі беларускіх археолагаў, але і ленінградскіх, маскоўскіх. Вынікі маёй разведкі, праведзенай у 1968 годзе, сталіся даволі сціплыя. Наступны год не абяцаў паляпшэння сітуацыі. Планавая работа забірала ўвесь час. Вялася паспартызацыя помнікаў Леніну і ахвярам другой сусветнай вайны. Толькі ў асобныя дні ўдавалася вырвацца на археалагічныя пошукі, каб азнаёміцца хоць з тымі помнікамі, якія ўжо вывучаліся спецыялістамі — Ю. Кухарэнкам, І. Біруляй, В. Нікіцінай, П. Лысенкам.

За сезон 1969 года паспеў абследаваць тэрыторыю басейна верхняга цячэння Шчары — Баранавіцкі і Ляхавіцкі раёны, у археалагічным плане маларазведаныя. Паўднёвая частка іх уключала палескія балоты аж да Выганаўскага возера. У параўнанні з суседнім Слонімскім раёнам і басейнам сярэдняга цячэння ракі Шчары згаданыя мясціны бяднейшыя на археалагічныя помнікі, асабліва тыя, што належалі да каменнага веку. Значна больш тут курганных могільнікаў і гарадзішчаў.

Склалася ўражанне, што край гэты ляжаў нібы ўбаку ад важных старажытных шляхоў і быў малазаселены. Вялікая колькасць раннефеадальных гарадзішчаў сведчыла аб нейкай варожай пагрозе яму ў далёкія часы.

Удалося выявіць і абследаваць у тых двух раёнах 4



Мезалітычныя і неалітычныя крамянёвыя знаходкі са стаянкі Заставоча каля вёскі Мышыцы Жабінкаўскага раёна: *1—9, 13* — наканечнікі стрэл; *10—12* — праколкі; *14—17* — скрабкі



Крамянёвыя знаходкі са стаянкі Грудзіца-2 паблізу вёскі Мышыцы Жабінкаўскага раёна: *1—5* **— наканечнікі стрэл;** *6, 8, 27* **— разцы;** *9* **— наканечнік кап'я;** *10, 11* **— трапецападобныя пласцінкі;** *12—15, 17, 18, 22, 28, 31* **— скрабкі;** *7, 16, 19, 23* **— праколкі;** *20, 21, 24—26, 29, 30, 32, 33* **— ножападобныя пласцінкі**

селішчы эпохі бронзы і пазнейшага перыяду, 1 селішча жалезнага веку, 9 гарадзішчаў, замчышча ў Ляхавічах і 12 курганных могільнікаў, некаторыя з якіх размешчаны на дзеючых могілках. Дарэчы, гарадзішчы лакалізуюцца нібы на двух напрамках — паўночным (гарадзішча — Мыш у Баранавіцкім раёне) і паўднёва-ўсходнім (Ляхавічы — гарадзішча ў Ляхавіцкім раёне). Амаль усе яны захоўваюць рэшткі матэрыяльнай культуры, характэрнай для феадальнага перыяду (XI—XIV стст.).

У 1969 годзе мною падрыхтавана і здадзена на Мінскую картаграфічную фабрыку краязнаўчая нагрузка для вучнёўскай фізічнай карты Брэсцкай вобласці, дзе акрамя важнейшых археалагічных аб'ектаў пазначаны і апісаны цікавейшыя гістарычныя, архітэктурныя, ландшафтныя, прыродазнаўчыя і іншыя помнікі краю. Таксама апрацаваны і сістэматызаваны матэрыялы раскопак, праведзеных работнікамі абласнога музея ў 1959—1962 гадах. Гэта быў апошні год маіх шырокіх археалагічных даследаванняў.

Зноў вярнуўшыся ў Слонім, я ў вольны час заняўся больш паглыбленым аналізам сабраных матэрыялаў. На яго аснове, а таксама на аснове вывучаных пісьмовых крыніц у мяне сфарміраваліся свае погляды на многія загадкі нашага мінулага, яшчэ так мала даследаванага. У прапануемых нарысах я і спрабую выказаць уласныя меркаванні па некаторых пытаннях даўніны. Буду ўдзячны лёсу, калі кніга ўнясе хоць маленькі ўклад у наша краязнаўства ці абудзіць у некага пачуццё цікавасці да сваёй гістарычнай спадчыны. Адрасую зборнік усім, хто цікавіцца мінулым сваёй Бацькаўшчыны, і ў першую чаргу нашай дасціпнай моладзі, якая прадоўжыць даследаванні, але ў значна лепшых умовах.

ЦІ БАЛЦКІ Ў НАС СУБСТРАТ?

Гісторыя беларускай нацыі заблытаная і сфальсіфікаваная. Пісалася яна, асабліва ў апошнія стагоддзі, чужымі рукамі і пад абавязковую дыктоўку суседзяў-апекуноў, якія ніколі не былі зацікаўлены ў аб'ектыўным яе асвятленні. Хутчэй наадварот. Паколькі ад гістарычнай памяці народа залежыць яго нацыянальная самасвядомасць, патрыятызм і імкненне да волі, а гэтыя пачуцці беларусаў былі не да спадобы тым, хто хацеў ўладарыць над імі, дык рабілася ўсё, каб укласці ў тую памяць нешта іншае, чым было на самой справе.

Цяпер, калі час дае нам мажлівасць самім азірнуцца

на мінулае, разабрацца ва ўсім, неабходна перагледзець гісторыяграфію пачынаючы з найдаўнейшых часоў. Бо, магчыма, нават нашы вытокі не пазбеглі тэндэнцыйнага пераасэнсавання. Так, у гістарычнай навуцы склалася думка, што амаль на ўсёй тэрыторыі сучаснай Беларусі, ды і на суседніх землях славяне пасяліліся даволі позна. Да VI—VIII стагоддзяў на поўнач ад Прыпяці жылі нібы плямёны балтаў — продкі сучасных летувісаў і латышоў — яны нібыта засялялі Усходнюю Еўропу ад Балтыкі і нізоўяў Віслы да басейна верхняй Волгі. Лічыцца таксама, што славяне, пранікаючы на землі сваіх суседзяў, не выціскалі іх, а рассяляліся між карэнным насельніцтвам, утвараючы такім чынам этнічную балта-славянскую сумесь, якая затым даволі хутка цалкам славянізавалася. Балцкая аснова (субстрат) нібы і паслужыла галоўным фактарам фарміравання беларусаў як народнасці і вылучэння іх з агульнай старажытнарускай народнасці. Не даўнія суседскія ўзаемакантакты і ўплывы сталі прычынай шматлікіх культурных, моўных і бытавых запазычанняў паміж суседзямі, а балцкі субстрат (падспуд).

Засноўваецца тая гіпотэза найперш на лінгвістычных аналізах гідронімаў з агромністых славянскіх (цяпер) тэрыторый.

Першым штуршком узнікнення гіпотэзы можна лічыць часопісную публікацыю А. Качубінскага «Тэрыторыя дагістарычнай Літвы» (Журнал Министерства народного образования. 1891. № 1), у якой аўтар даў шэраг назваў беларускіх рэк і вадаёмаў з выразным літоўскім гучаннем і на падставе іх выказаў думку, што выяўленыя ім гідронімы сведчаць аб колішнім засяленні краю літоўцамі. Такім чынам упершыню дастаткова абгрунтавана пашыралася тэрыторыя «дагістарычнай Літвы» за кошт суседніх славянскіх земляў.

Узнятая А. Качубінскім тэма прыцягнула ўвагу многіх даследчыкаў, у тым ліку і вядомага літоўскага лінгвіста канца XIX — пачатку XX стагоддзя К. Бугі. Яго шматгадовай даследчыцкай працай тэрыторыя распаўсюджання балцкай гідранімікі была значна пашырана, а спіс прыведзеных А. Качубінскім балтызмаў дапоўніўся мноствам новых назваў.

Добра ведаючы дыялектныя асаблівасці літоўскай і латышскай моваў, тапаніміку Літвы, Латвіі і Усходняй Прусіі, прытым карыстаючыся старымі пісьмовымі крыніцамі, К. Буга гідраніміку з агромністых славянскіх тэрыторый (і ў першую чаргу беларускіх) нібы прасейваў праз густое сіта іх балцкага падабенства. Усё, што хоць крыху нагадвала балцкае гучанне, было блізкае да

тапонімаў з Прыбалтыкі, даследчык адносіў да балтызмаў, дапасоўваў да іх. Яго метадалагічным прынцыпам стаў не ўлік мясцовых моўных, этнаграфічных ці геаграфічных асаблівасцей, а выключна параўнанне з балцкімі лексічнымі адзінкамі, якімі аўтар валодаў дасканала. Прытым ён не звяртаў увагі на факты адваротнай запазычанасці. К. Бугу мала цікавіла спецыфіка гэтага краю, што ў падобных выпадках павінна ўлічвацца ў першую чаргу. Таму ў балтызмы вучонага трапіла нямала чыста славянскіх назваў, напрыклад Балачанка, Балоча, Валажоўка, Ваўчыца, Гаць, Дыма, Дыміца, Тур'я і інш.

І хоць даследаванні К. Бугі нельга лічыць бясспрэчнымі, іх без спробы крытычнага аналізу ўспрынялі многія вучоныя. Засноўваючыся на ўласных назіраннях і вывадах, літоўскі лінгвіст прыйшоў да высновы, што пачаткова балты жылі ў Верхнім Падняпроўі, адкуль пад націскам славян паступова перамясціліся ў Прыбалтыку. Згодна з яго меркаваннямі, у сярэдзіне першага тысячагоддзя нашай эры продкі сучасных літоўцаў яшчэ жылі ў басейнах Верхняга Дняпра, Бярэзіны, Сожа і на левабярэжжы вярхоўяў Заходняй Дзвіны. Старажытныя ж латышскія плямёны нібы засялялі тады сучасную Сярэднюю і Усходнюю Літву, і толькі прусы ўжо займалі ўласныя гістарычна вядомыя тэрыторыі.

Пункт погляду К. Бугі адносна наддняпроўскай прарадзімы балтаў быў падтрыманы нямецкім вучоным М. Фасмерам, паводле меркавання якога ў арэал прарадзімы балтаў неабходна ўключыць і басейны рэк Вялікай, Ловаці, Верхняй Волгі, Акі і Дзясны. Племя голядзь, вядомае па старажытных рускіх летапісах і размешчанае ў басейне ракі Протвы, ён лічыў рэшткамі колішняга балцкага этнасу.

Наогул тэма прарадзімы балтаў і балцкай гідранімікі на сучасных славянскіх землях прыцягнула ўвагу многіх вучоных і цесна пераплялася з праблемай этнагенезу славян, вызначэннем іх прарадзімы. Сярод шматлікіх лінгвістычных прац па згаданай праблеме неабходна назваць манаграфічнае даследаванне У. Тапарова і А. Трубачова «Лінгвістычны аналіз гідронімаў Верхняга Падняпроўя» (М., 1962), сустрэтае ў вучоным свеце з вялікай цікавасцю, хоць і ацэненае неадназначна. Аўтары зрабілі лінгвістычны аналіз паходжання амаль шасці тысяч гідронімаў з вялізнай тэрыторыі басейна Верхняга Дняпра, куды ўключаліся і такія прытокі, як Прыпяць, Бярэзіна, Сож, Дзясна. Вучоныя выявілі тут больш за семсот назваў балцкага паходжання, у тым ліку звыш чатырохсот найменняў з тэрыторыі Беларусі. Такая лічба не магла не

прыцягнуць увагу сенсацыйнасцю і не насцярожыць апанентаў.

Згаданая манаграфія разам з надрукаваным раней артыкулам вядомага эстонскага археолага Х. Моора «Пра старажытную тэрыторыю рассялення балцкіх плямёнаў» (Советская археология. 1958. № 2) па-свойму замацоўвала балцкую гіпотэзу як у лінгвістыцы, так і ў археалогіі. Мэта, пастаўленая аўтарамі, на першы погляд, была дасягнута. Аднак пры бліжэйшым знаёмстве з даследаваннем У. Тапарова і А. Трубачова складваецца ўражанне, што аўтараў захапляў пераважна колькасны эфект выяўлення балтызмаў, а не аб'ектыўны навуковы аналіз. Значная колькасць найменняў выкарыстоўвалася імі для пераканання ў праўдзівасці загадзя зададзеных вывадаў. Пры гэтым у аснову сваіх адкрыццяў даследчыкі закладвалі тую ж суб'ектыўную методыку К. Бугі. Фактычна рабіўся не навуковы аналіз паходжання гідронімаў, а адвольная дапасоўка іх да балцкай лексікі і тапанімікі.

І калі К. Бугу яшчэ можна зразумець, улічваючы яго нацыянальны патрыятызм і значную перавагу ў веданні дыялектных асаблівасцей балцкіх моў над славянскімі, то У. Тапарова і А. Трубачова зразумець цяжка. Лагічна нельга растлумачыць, чаму спецыялісты такога рангу, даследуючы этымалогію назваў, напрыклад, беларускіх рэк, ні разу не ўспомнілі аб існаванні ў краі сваіх моўных (беларускіх) дыялектаў, характэрнай мясцовай спецыфікі, а гэта ж павінна ўлічвацца ў першую чаргу. Вучоныя нібы забылі, што на Беларусі карыстаюцца беларускай, а не літоўскай мовай. Ва ўсіх выпадках чамусьці зноў крытэрыем для іх служыла толькі лексіка балцкіх народаў.

Дапасоўваючы славянскія назвы да розных балцкіх варыянтаў, даследчыкі мусілі ведаць, што тым самым парушаюць навуковую аб'ектыўнасць, аднак ішлі на гэта, інакш успрынятая імі гіпотэза губляла ў пераканальнасці. Дарма што пераканальнасць тая была ўяўнай. І сапраўды, дзеля чаго аўтарам спатрэбілася дапасоўваць да чужой лексікі такія славянскія найменні рэк у басейне Прыпяці, як Бежыца, Грыўка, Даколка, Дамашняя, Дарагабуша, Дарагань, Жэрдзь, Зольна, Золенка, Мытва, Мытвіца, Піна (ад палескага дыялекта «пінна» — пенная), Случ (ад слова «злучаць»), Сажалка, Смерць, Цемра, Турыя і інш.? Або ў басейне Бярэзіны: Бабруйка, Балоча, Балачанка, Бярэзіна, Беразня, Беразанка, Бярэжніца, Бурчак, Валажоўка, Гаць, Грыўка, Жардзянка, Моўча, Няміга, Осаўка, Рова, Сасна, Ужніца? Ці ў басейне Сожа: Бярэжніца, Беражоўка, Бяседка, Бесядзь, Бярложа, Вароніца, Ваўчыца, Вепранка, Выдра, Вярцейка, Гарыста, Дабранка, Добрыца,

Добрасосна, Дамашняя, Дарагань, Думанка, Жадунка, Зубер, Завуніца, Касіна, Касянка, Крутка, Лужынка, Нямейка, Палужжа, Польна, Рудзенка, Руплінка, Серпейка, Случ, Стомятка, Судзінка, Турыя, Шума, Чавенка?

Тут успомнена толькі невялікая частка «балтызмаў», выяўленых У. Тапаровым і А. Трубачовым у басейнах прытокаў Верхняга Дняпра. А гэта каля 10 працэнтаў згаданай імі агульнай колькасці. Узнікае пытанне: калі ўсе прыведзеныя назвы сапраўды балтызмы, то ці не ад балтаў паходзяць славяне наогул? Ці не блытаюць аўтары этымалагічны аналіз з дапасаваннем (падгонкай)? Нездарма беларускі лінгвіст В. Жучкевіч з 400 пералічаных аўтарамі балтызмаў, распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі, толькі 18 згодзен аднесці да балцкіх запазычанняў. Ён зазначае, што, карыстаючыся такой методыкай, можна ўсе славянскія назвы растлумачыць з пазіцый балцкіх моў. А вядомы археолаг В. Мельнікоўская ў сувязі з даследаваннем У. Тапарова і А. Трубачова прывяла наступнае выказванне лінгвіста Н. Надзеждзіна: «Слова — усё ў нашай уладзе. Яно безабаронна, і з яго этымалагічным катаваннем можна вымучыць розны сэнс».

На Беларусі, як і на сумежных тэрыторыях, гідронімаў з яўнымі прыкметамі запазычанняў з балцкіх моў сапраўды нямала. Аднак сітуацыю утрыраваць нельга. Вядома ж, працяглае славяна-балцкае тэрытарыяльнае суседства нават пры нейкай штучнай ізаляванасці не абышлося б без узаемаўплываў і запазычанняў. Гэта звычайная з'ява. У даным выпадку аб ізаляванасці гаварыць безпадстаўна. Так званыя кантактныя (сумежныя) зоны паміж згаданымі этнічнымі групамі маглі мець і, безумоўна, мелі змешанае насельніцтва, вельмі блізкія (знівеліраваныя) традыцыі, якія складваліся стагоддзямі.

Рэкі ж ва ўсе часы з'яўляліся не толькі важнейшымі камунікацыйнымі шляхамі, але і праваднікамі моўных запазычанняў. Таму ў іх назвах натуральна пакінулі след розначасовыя гістарычныя сітуацыі. Гідраніміка — адна з найбольш устойлівых крыніц гістарычнай памяці, але карыстацца ёю спрошчана нельга, тым больш у падобнай сітуацыі.

Славяне і балты былі суседзямі не толькі ў далёкай старажытнасці, у сярэдневякоўі іх таксама доўгі час яднала супольнасць інтарэсаў. Нельга забываць, што беларускія і сучасныя летувіскія землі ўваходзілі ў склад адной дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага, дзе адначасова з дзяржаўнай старабеларускай мовай існавала і мова балцкіх плямёнаў. Сярод знакамітых мужоў і вояў, якія валодалі надзеламі па ўсяму княству, меліся шматлікія выхадцы з

балцкага моўнага асяроддзя. У межах сваіх зямель яны маглі пакінуць пэўны тапанімічны след.

Вядома і тое, што ў старой славянскай тапаніміцы існавала шмат абсалютна аднолькавых назваў. Яны паўтараліся не толькі на значнай адлегласці, але і ў суседстве. З цягам часу гэта стала ўносіць блытаніну, замінаць купцам, падарожнікам, ды і ўладам ў іх геаграфічнай арыентацыі. Узнікла неабходнасць неяк разнастаіць аднолькавыя найменні, змяняючы то канчаткі, то суфіксы, то прыдаючы словам балцкае гучанне. З'явіліся, напрыклад, такія варыянты, як Варануса (замест Вароніца), Ваўчэса (замест Ваўчыца) і інш. Яшчэ ў мінулым стагоддзі траплялася такая дваістасць назваў: на адным адрэзку рака называлася мясцовым насельніцтвам у славянскім варыянце, а на іншым — у балцкім. Затым тутэйшыя славянскія найменні саступалі месца больш загадкавым балцкім.

Многае залежала і ад афіцыйнай рэгістрацыі гідронімаў. Дробныя рачулкі часта не мелі назваў. Мясцовыя жыхары называлі іх проста «рэчка» або «наша рэчка». Пры перапісах назвы ім даваліся адвольна, без уліку гістарычнай падасновы, часцей ад бліжэйшых і больш значных населеных пунктаў, найменні якіх цяпер нярэдка дубліруюцца.

Гісторыі вядомы і факты перасяленняў цэлых груп балцкага насельніцтва ў глыб славянскіх тэрыторый, як, напрыклад, прусаў на поўнач Слонімшчыны. Такія іншамоўныя астраўкі таксама пакінулі свой след.

Як відаць, шляхоў тапанімічных запазычанняў магло быць шмат. Таму гідронімы вельмі розныя — як па свайму балцкаму каларыту, так і па ступені славянізацыі. Калі б, паводле трактоўкі прыведзенай вышэй гіпотэзы, працэс запазычання гідронімаў праходзіў у адзін этап, калі б назвы перадаваліся «каланізатарам» з вуснаў абарыгенаў, то пласт гэтых гідронімаў выглядаў бы больш аднатыпна, не было б такой неверагодна шырокай гамы балта-славянскага каларыту. З другога боку, славянскія гідронімы на «каланізаваных» тэрыторыях мусілі б утвараць роўны пласт, чаго ніяк не скажаш, аналізуючы факты.

І яшчэ адна асаблівасць. Лінгвісты і археолагі схільны лічыць раку Прыпяць умоўным рубяжом, што аддзяляў балтаў ад славян. Аднак тыя ж У. Тапароў і А. Трубачоў далёка на поўдзень ад Прыпяці знайшлі нямала «балтызмаў», якія літаральна дубліравалі больш паўночныя варыянты. Зыходзячы з логікі прапанаванай гіпотэзы, балты засялялі і Валынь... Тады міжволі ўзнікае пытанне: а дзе ж шукаць прарадзіму славян, што пачынаючы з V стагоддзя ўсё актыўней давалі аб сабе знаць на шырокіх

прасторах Поўдня, а ў VI—VII стагоддзях шматлікімі полчышчамі трэслі магутную Візантыйскую імперыю і, руйнуючы яе цытадэлі, навадняліБалканскі паўвостраў?!

Прыведзеныя факты сведчаць аб навуковай зашоранасці даследчыкаў і недасканаласці гіпотэзы, аб уразлівасці аргументаў, пакладзеных у яе аснову.

І вось, грунтуючыся цалкам на балцкай гіпотэзе, а гэта значыць у першую чаргу на гідранімічных сведчаннях, некаторыя вучоныя пайшлі далей, заяўляючы, што ў аснове паходжання беларусаў, фарміравання іх этнакультурных і нават антрапалагічных асаблівасцей ляжыць балцкі субстрат. Нібыта менавіта ён стаў вызначаючым фактарам, што выдзеліў гэтую частку насельніцтва з усходнеславянскага, а затым і агульнарускага асяроддзя. Але прыхільнікам такіх высноў неабходна нагадаць: на падобным грунце развівалася, напрыклад, і насельніцтва сучаснага Падмаскоўя, якое, аднак, беларускім чамусьці не стала. Балтам жа, згодна гіпотэзе, належалі прасторы ад нізоўяў Віслы да верхняй Волгі.

Бясспрэчна, нельга адмаўляць уплыў балцкага этнасу на фарміраванне этнакультурных асаблівасцей асобных беларускіх рэгіёнаў, і ў першую чаргу паўночна-заходніх, як і ўвогуле ўплываў бліжэйшых суседзяў. Нельга адмаўляць і факт наяўнасці ўзаемных моўных запазычанняў. Аднак асноўная ідэя гіпотэзы патрабуе грунтоўнага перагляду, інакш многія пытанні балта-славянскіх узаемаадносін не толькі ў старажытнасці, але і ў сярэдневяковай гісторыі гэтых народаў не атрымаюць належнага адказу.

Многія археолагі доўгі час не падзялялі думку лінгвістаў аб балцкім засяленні агромністых тэрыторый Усходняй Еўропы. Так, ў 50-ыя гады XX стагоддзя П. Траццякоў, вядучы спецыяліст па ўсходнеславянскай археалогіі, лічыў, што Верхняе Падняпроўе ўжо ў пачатку нашай эры ў асноўным было славянскім і балцкая каланізацыя (экспансія) ішла з захаду, з Прыбалтыкі. Не мог пагадзіцца ён і з вялікім абсягам тэрыторый, адведзеных лінгвістамі балцкаму этнасу.

Аднак у той час былі іншыя меркаванні. У 20—30-ых гадах у асяроддзі археолагаў з'явіліся прыхільнікі сенсацыйных адкрыццяў лінгвістыкі. Яны імкнуліся прывязаць археалагічны матэрыял да лінгвістычных высноў. Пры даследаванні археалагічных помнікаў павышаная ўвага звярталася імі на так званую штрыхаваную (заштрыхаваную) кераміку, што асабліва часта сустракаецца на тэрыторыі Беларусі. Яе аднеслі да неславянскай, дакладней, даславянскай. Паколькі ж штрыхаваная кераміка для археалагічных помнікаў Палесся і мяркуемага славянскага

поўдня не была ўласціва, а арэал яе распаўсюджання заходзіў і на тэрыторыю Прыбалтыкі, яна і абвяшчалася балцкай. Вакол гэтага вызначальнага пытання якраз і канцэнтравалася пошукавая і тэарэтычная дзейнасць значнай колькасці навукоўцаў на працягу дзесяцігоддзяў. Было напісана нямала даследаванняў, распрацавана некалькі варыянтаў гістарычных схем, што дапасоўвалі археалагічныя сведчанні да лінгвістычнай гіпотэзы.

Варта прыгадаць, што сабой уяўляла штрыхаваная кераміка. Гэта гліняны посуд ручной лепкі, паверхня якога перад абпалам загладжвалася змочаным пэндзлем (травяным або іншым), пасля чаго на ёй звычайна заставаліся сляды ў выглядзе адвольных рысак — штрыхоў. Такі тэхналагічны прыём узнік на значнай тэрыторыі Беларусі і Літвы недзе ў IV—III тысячагоддзях да нашай эры і бытаваў, паводле даных беларускага археолага А. Мітрафанава, да V стагоддзя нашай эры. Але найбольш даследаваным пакуль з'яўляецца перыяд ранняга жалезнага веку (VII стагоддзе да нашай эры — V стагоддзе нашай эры).

Вобласць існавання культуры штрыхаванай керамікі ўпісвалася ў зону балцкай гідранімікі і ўтварала яе своеасаблівае ядро, дасягаючы на ўсходзе Падняпроўя, а на захадзе ўразаючыся ў тэрыторыі, заселеныя цяпер літоўцамі і латышамі. Здавалася і здаецца недарэчнасцю толькі тое, што прадметы такога тыпу знаходзяць чамусьці далёка не па ўсёй Прыбалтыцы, населенай балтамі, і тым больш не па ўсяму арэалу распаўсюджання балцкай гідранімікі. Такая акалічнасць выклікае ў асобных даследчыкаў (В. Булкін, Д. Мачынскі) насцярожанасць і альтэрнатыўныя ацэнкі.

Раскапаўшы у Беларусі нямала археалагічных помнікаў культуры штрыхаванай керамікі, А. Мітрафанаў зрабіў вывад: гэтая культура належала плямёнам усходніх балтаў, якія жылі тут да славянскай каланізацыі, але чамусьці ў V стагоддзі нечакана памянялі тысячагадовыя традыцыі ў ганчарстве. Вучоны быў упэўнены, што славяне засялілі згаданыя тэрыторыі не раней VII—VIII стагоддзяў. Атрыманыя матэрыялы сведчылі аб культурнай і традыцыйнай блізкасці раскапаных ім помнікаў з археалагічнымі помнікамі тагачасных мілаградскай і зарубінецкай культур, лакалізаваных на Палессі і ў Сярэднім Падняпроўі. Апошнія ж пераважнай большасцю даследчыкаў лічацца славянскімі старажытнасцямі.

Па-свойму кампрамісным тлумачэннем усёй сітуацыі гучыць выснова маскоўскага археолага В. Сядова, які, у прыватнасці, пісаў: «У залежнасці ад гістарычных абставін

зарубінецкае насельніцтва магло стаць і балтамі, і славянамі». Перыяд існавання зарубінецкай культуры датуецца прыблізна II стагоддзем да нашай эры — II стагоддзем нашай эры. Адсюль вынікае, што нават для пачатку нашай эры В. Сядоў дапускае наяўнасць нейкіх аморфных этнасаў, якія мянялі этнічнасць залежна ад абставін... Калі б нешта такое ў гісторыі сапраўды было магчыма, то чаму такіх фактаў не фіксуе гісторыяграфія?

Ужо згаданы эстонскі вучоны Х. Моора, спасылаючыся на лінгвістычныя і археалагічныя матэрыялы, спрабуе перакінуць у гэтай праблематыцы мост паміж лінгвістамі і археолагамі. На яго думку, недзе з II тысячагоддзя да нашай эры і да другой паловы I тысячагоддзя нашай эры балты сапраўды жылі на агромністых прасторах Усходняй Еўропы — ад Балтыкі да басейна Верхняй Волгі. Штрыхаваную ж кераміку, як і гідраніміку на тых тэрыторыях, ён лічыць бясспрэчным доказам грунтоўнасці сваіх вывадаў, замацоўваючы такім чынам балцкую гіпотэзу. Аднак даследчык чамусьці абыходзіць маўчаннем старажытныя пісьмовыя крыніцы.

Публікацыя Х. Моора схіліла многіх археолагаў у бок высноў лінгвістаў, але далёка не ўсіх. Шмат крытычных заўваг і сумненняў, асабліва у вызначэнні носьбітаў культуры штрыхаванай керамікі, выказалі археолагі Ф. Гурэвіч, П. Траццякоў, а пазней — вучоныя В. Булкін, Д. Мачынскі і Л. Побаль.

Вядома, археалагічныя сведчанні — адна з важных і дастаткова пераканаўчых гістарычных крыніц. Аднак пры вызначэнні моўных характарыстык этнасу яны, узятыя асобна, не з'яўляюцца непагрэшнымі і набываюць доказнасць толькі ў спалучэнні з іншымі (пісьмовымі ці тапанімічнымі) дадзенымі. Найбольш акрэсленымі і дакладнымі ўсё ж трэба лічыць пісьмовыя дакументы, аб чым гаворка пойдзе далей.

У публікацыях А. Мітрафанава сцвярджалася, што традыцыя штрыхавання керамікі на тэрыторыі Беларусі абрываецца недзе ў V стагоддзі. Прытым прычына канкрэтна не называлася, падкрэсліваліся толькі некаторыя змены ў іншых праявах культуры. Гэта дало вучоным падставы аднесці пазнейшы перыяд да новай культуры тыпу верхніх напластаванняў Банцараўшчыны і Тушамлі, якія нібыта ўсё яшчэ належалі ўсходнім балтам. Славяне ж прыйшлі сюды толькі ў VII—VIII стагоддзях і не выціскалі мясцовае балцкае насельніцтва, а паступова асіміляваліяго. Працэс той асіміляцыі закончыўся ў асноўным у IX—X стагоддзях.

Такім чынам, працэс фарміравання славянскіх племян-

ных аб'яднанняў на тэрыторыі сучаснай Беларусі, вядомых па старажытнарускіх летапісах, адносіўся даследчыкам да пазнейшых часоў, што не зусім упісваецца ў гістарычны кантэкст.

Археолагі Прыбалтыкі таксама засведчылі пэўныя змены, якія мелі месца недзе ў сярэдзіне I тысячагоддзя нашай эры. Так, на думку літоўскага вучонага А. Таўтавічуса, штрыхаваная кераміка на тэрыторыі Літвы знікла ўжо ў IV стагоддзі нашай эры, гэта значыць раней, чым у Беларусі. Паводле меркаванняў І. Цымермане, Я. Граўдоніса, Р. Волкайце-Кулікаўскене і іншых спецыялістаў, прыблізна з V стагоддзя на тэрыторыі Літвы і Латвіі перастае існаваць так званая тэкстыльная кераміка (археолагі лічаць яе адным з характэрнейшых атрыбутаў фінскага этнасу).

Супадзенне фактаў, засведчаных археалагічнымі даследаваннямі на керамічным матэрыяле, дапаўняецца і зменай у той час іншых традыцый, напрыклад у будаўніцтве, пахавальнай абраднасці, быце, ювелірнай і іншых вытворчасцях, прытым на значных тэрыторыях Прыбалтыкі і суседняй Беларусі.

Мною ж у басейнах левых прытокаў Нёмана — Шчары і Зэльвянкі выяўлены фрагменты глінянага посуду са слядамі штрыхоўкі і на селішчах другой паловы I тысячагоддзя нашай эры, якія, бясспрэчна, можна лічыць славянскімі. Гэтая акалічнасць дае падставы зірнуць на факты з іншага боку: а ці не была штрыхаваная кераміка адным са старажытнейшых атрыбутаў славянскага этнасу або часткі яго? Безумоўна, на тым нязначным матэрыяле, атрыманым пры шурфоўцы некалькіх помнікаў, нельга рабіць катэгарычныя вывады ці тым больш абвяргаць актыўна падтрыманую вучонымі балцкую гіпотэзу. Аднак паставіць пытанне і адстойваць свой погляд цяпер ужо можна.

Складанасць у вызначэнні этнічнага складу насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў пачатку нашай эры і раней звязана з адсутнасцю канкрэтных даных. Вывады і гіпотэзы грунтуюцца ў асноўным на меркаваннях, параўнаннях, разважаннях, заснаваных ва ўскосных доказах, якія кожны даследчык выкарыстоўвае ў адпаведнасці са сваёй навуковай пазіцыяй. Каб дакапацца да ісціны, неабходна па магчымасці ўлічваць большую колькасць першакрыніц. Таму і звернемся да пісьмовых дакументаў старажытнасці, якія некаторымі даследчыкамі абвяшчаліся недакладнымі, бо не адпавядалі іх тэарэтычным палажэнням.

На вялікі жаль, і пісьмовыя сведчанні таксама далёка

не заўсёды канкрэтныя. Тэрыторыя сучаснай Беларусі на рубяжы нашай эры была аддалена ад важнейшых цэнтраў тагачаснай цывілізацыі, мізэрныя звесткі пра гэтыя мясціны даходзілі да рымлян і грэкаў у расплывістай форме.

Фрагментарна і скупа пра тэрыторыі, блізкія да нашай Бацькаўшчыны, у самым пачатку новай эры згадвалі Пліній Старэйшы, Тацыт і Пталамей. Так, Пліній у напісанай ім у 77 годзе нашай эры «Натуральнай гісторыі» размяшчаў ужо вядомых яму венедаў (верагодна, так тады некаторыя народы называлі славян) недзе ў паўднёвай ці паўднёва-ўсходняй частцы сучаснай Прыбалтыкі, у значным аддаленні на ўсход ад Віслы. Больш дакладных звестак ён, на жаль, не падае, венедаў успамінае між іншым.

Другі аўтар I стагоддзя нашай эры Тацыт у вядомым творы «Германія», нібы дапаўняючы скупую інфармацыю Плінія, вялікую этнічную групу венедаў лакалізаваў на значных землях Усходняй Еўропы, на поўдзень ад якіх жылі сарматы і бастарны (пеўкіны), на поўнач — фіны, а на захад — германцы. На ўсходзе вобласць рассялення венедаў гублялася ў невядомай яму далечыні. Прытым зазначалася, што венеды многае ўспрынялі ад дзікіх сармацкіх нораваў, аднак больш набліжаліся да германцаў, бо будавалі сабе жыллё і змагаліся пешшу, а не конна, як сарматы. Такім чынам, велізарная тэрыторыя, акрэсленая Тацытам, уключала ў сябе ўсю сучасную Беларусь, якая, згодна з гэтымі данымі, знаходзілася нібы амаль у цэнтры венедскай зямлі. Звесткі рымскага гісторыка ўжо значна больш канкрэтныя, бо акрэсліваюць венедскае (славянскае) наваколле.

Грэчаскі вучоны II стагоддзя нашай эры Пталамей «вялікі народ венедаў» размяшчаў уздоўж узбярэжжа Венедскага заліва — так тады называлася Балтыйскае мора. Ён пісаў, што народ той займае агромністую тэрыторыю еўрапейскай Сарматыі і вельмі шматлікі. Паводле Пталамея, асноўныя славянскія (венедскія) землі ляжалі не толькі ўздоўж узбярэжжа Венедскага заліва, але і распасціраліся далёка на паўднёвы ўсход і ўсход, недзе аж да сармацкага поўдня. На тых тэрыторыях грэчаскаму вучонаму было вядома і насельніцтва пад загадкавай назвай «ставаны», якое жыло паміж Венедскім залівам і аланамі Прычарнаморскіх стэпаў. Многія даследчыкі ў тым найменні схільны бачыць саманазву славян, пераказаную ў не зусім дакладным вымаўленні, а такое ў старажытных пісьмовых крыніцах сустракаецца часта.

З паведамлення Пталамея відаць, што пры запісанні адзначаных мясцін ён карыстаўся двума патокамі інфармацыі: рымскім, які ішоў недзе з прывенедскіх

(паўночных) тэрыторый, і грэчаскім — паўночначарнаморскім. У прыбалтыйскіх народаў (фінаў, германцаў) тады існаваў тэрмін «венеды», які яны ўжывалі для абазначэння славян, а на тэрыторыю Паўночнага Прычарнамор'я пранікала, хоць, можа, у недакладным гучанні, сапраўдная саманазва славян. Фактычна ж гаворка ішла аб адным і тым жа народзе, менавіта аб славянах.

Паколькі вызначаныя ўказанымі аўтарамі землі венедаў (ставанаў) блізкія да адведзеных сучаснымі лінгвістамі і археолагамі шматлікім балтам, узнікла неабходнасць ці абвясціць старажытныя дакументы памылковымі (бо яны не супадаюць з балцкай гіпотэзай), ці пад венедамі разумець балтаў, у крайнім выпадку — балтаў, славян і германцаў. І хоць падобныя тлумачэнні не вытрымлівалі навуковай крытыкі, гіпотэза працягвае існаваць, абходзячы старажытныя пісьмовыя крыніцы.

Готскі ж гісторык VI стагоддзя Іардан, нібы адказваючы на меркаванні сучасных вучоных, пісаў, што старажытныя венеды — у залежнасці ад плямёнаў і тэрыторый — сталі называцца склавенамі і антамі, пры гэтым размяшчаў склавенаў абапал Віслы і на ўсход ад яе, а антаў — на паўночны захад ад Понта (Чорнага мора).

Візантыйскі гісторык таго часу Пракопій Кесарыйскі, паведамляючы аб славянскай экспансіі на Балканскі паўвостраў у VI стагоддзі, пра венедаў не ўпамінаў зусім. Ды і іншыя грэчаскія аўтары VI — VII стагоддзяў не ўжывалі згаданай назвы, неславянскай па паходжанні.

З тае нагоды хацелася б выказаць сваё меркаванне пра ўзнікненне і значэнне тэрміна «венеды», якім карысталіся народы, што мелі ў старажытнасці трывалыя сувязі з узбярэжжам Балтыйскага мора (Венедскага заліва).

У лексіцы ўграфінскіх народаў, у прыватнасці эстонцаў, існуюць словы: «Venema» — у значэнні «Руская зямля», «Русь», «vene» — «русін», «рускі», «vend» — «брат», «vennad» — «браты». З'яўляючыся паўночнымі суседзямі славян (згодна звесткам Тацыта), фіны не маглі не ведаць сэнсавага значэння саманазвы — «славяне», што тлумачылася як «браты па слову», «родныя па мове». Нашы продкі называлі сябе так у адрозненне ад іншых народаў, што не карысталіся мовай, зразумелай для іх,— немцаў. У перакладзе на фінскую мову слова «браты» гучала як «vennad».

Гэтая фінская форма саманазвы славян магла быць з-за пэўных абставін успрынята мараходцамі іншых народаў. Мора ж, якое, верагодна, кантралявалася славянамі, атрымала найменне Венедскага (Славянскага). А паколькі назва «венеды» м ла паўночнае фінскае, паходжанне, яна

і адносілася ў асноўным да паўночнай часткі славянства. Адсюль і тагачасная невыразнасць у адрозненнях венедаў ад славян. На гэта ўказвае, у прыватнасці, гісторык Іардан. Самі ж славяне тэрмінам, дадзеным ім фінамі, відаць, не карысталіся, хоць, несумненна, ведалі пра яго існаванне.

Візантыйскія ж аўтары VI—VII стагоддзяў сутыкаліся непасрэдна толькі з паўднёвай часткай славянства і без іншамоўных пасрэднікаў, таму фінскае слова «венеды» у іх працах не распаўсюджана. Тут ведалі толькі саманазву славян і форму «анты», што калісьці аб'ядноўвала рознаэтнічнае насельніцтва супрацьлеглага ад Візантыі ўзбярэжжа Чорнага мора. Паколькі славяне ў той перыяд былі ў згаданых мясцінах дамінуючым этнасам, найменне «анты» перайшло на іх, стала адносіцца да прычарнаморскай часткі славян, з якімі сутыкнуліся візантыйцы.

Па не зусім яшчэ зразумелых прычынах візантыйскія падарожнікі і вучоныя не пранікалі ў глыб асноўных славянскіх тэрыторый. Таму інфармавалі яны пераважна пра быт і традыцыі перыферыйнай, паўднёвай, часткі славянства, якая экспансіўна пагражала паўночным тэрыторыям Візантыйскай імперыі.

Ужо «Пеўцінгеравы табліцы» — крыніца канца III ці самага пачатку IV стагоддзя — фіксуюць славян (венедаў) у двух геаграфічных рэгіёнах: на поўнач ад нізоўяў Дуная (Істра) і ў раёне Карпат, дзе некалькі стагоддзяў назад Тацыт размяшчаў бастарнаў (пеўкінаў).

Можна меркаваць, што недзе ў IV стагоддзі вялікія групы славян, перамяшчаючыся на поўдзень, выйшлі на суседства з насельнікамі тэрыторыі Візантыі, а шырокая экспансія ў VI—VII стагоддзях на Балканы — менавіта працяг планамернага руху па даўно разведаных абшарах. Гістарычныя звесткі аб сутычках антаў з готамі Германарыха і Вінітара — доказ таго.

Нават са скупых старажытных пісьмовых сведчанняў відаць, што ў пачатку нашай эры на землях сучаснай Беларусі і нават Прыбалтыкі ні аб якіх балтах ці іншых балтамоўных плямёнах не ўпамінаецца. Наадварот, пісьменнікі тае пары згадваюць аб засяленні адзначаных тэрыторый шматлікімі венедамі і іх паўночнымі суседзямі — фінамі. Пра тое сцвярджаюць не толькі аўтары I стагоддзя Пліній і Тацыт, але і аўтар II стагоддзя Пталамей. На іх думку, балты не былі суседзямі славян ні з поўдня, ні з захаду, ні з поўначы. Магчыма, толькі з усходу, дзе прасторы славян губляліся ў невядомай ім далечыні.

Характэрна, што вызначаныя названымі аўтарамі венедскія землі амаль накладваюцца на арэал, адведзены

балтам прыхільнікамі балцкай гіпотэзы. Яны ўключаюць і тэрыторыю балцкай гідранімікі, і тым больш вобласць распаўсюджання культуры штрыхаванай керамікі. Усё гэта яшчэ раз пераконвае ў наступным: балцкая гіпотэза патрабуе грунтоўнага пераасэнсавання і больш аб'ектыўнай аргументацыі. Бо нельга ж абвінавачваць усіх старажытных гісторыкаў у памылковасці іх звестак толькі таму, што яны пісалі не так, як хацелася аўтарам гіпотэзы.

Супастаўляючы звесткі са старажытных пісьмовых крыніц з данымі археалогіі, у прыватнасці з назіраннямі і вывадамі А. Мітрафанава і В. Сядова, паводле якіх паміж культурамі штрыхаванай керамікі, днепра-дзвінскай, мілаградскай і зарубінецкай агульнага значна больш, чым адметнага, можна зрабіць вывад: усе гэтыя археалагічныя культуры належалі славянскаму этнасу і рознілі іх толькі мясцовыя асаблівасці і традыцыі, непазбежныя на такіх агромністых тэрыторыях. Таму нельга не пагадзіцца з асцярожнымі заўвагамі Д. Мачынскага, В. Булкіна і Л. Побаля пра тое, што штрыхаваная кераміка магла быць адной з лакальных прыкмет старажытнай славянскай культуры. Неабходна яшчэ раз падкрэсліць: на тэрыторыі сучаснай Беларусі і паўднёва-ўсходняй Літвы традыцыя штрыхавання паверхні глінянага посуду ў працэсе яго фармавання і сушкі назіралася з найдаўнейшых часоў, ужо ў эпоху неаліту, г. зн. у IV—III тысячагоддзях да нашай эры. На некаторыя вырабы з гліны наносіліся выразныя штрыхі як з вонкавага, так і з унутранага боку. На ўсім працягу існавання традыцыі далёка не ўвесь посуд праходзіў такую апрацоўку. Значная частка керамікі мела гладкую і нават падглянцаваную паверхню, чым вельмі нагадвала больш паўднёвыя варыянты.

Нават пры павярхоўным знаёмстве з прыведзенымі вышэй лінгвістычнымі, археалагічнымі і старажытнымі пісьмовымі данымі заўважаюцца не толькі разыходжанні, але і несумяшчальнасць гіпотэзы аб шматлікіх балтах і тэрыторыі, што яны займалі, з сведчаннямі ў першую чаргу пісьмовых крыніц. Ды і археалагічныя матэрыялы ніяк не стасуюцца з меркаваннямі лінгвістаў. Усё гэта міжволі ставіць на парадак дня пошукі больш дакладнага адказу на вельмі важныя пытанні мінулага як славян, так і балтаў. Асабліва тое тычыцца ранняга перыяду гісторыі Беларусі. Бо не беспрычынна складвалася сітуацыя, што прывяла да ідэі стварэння Вялікага княства Літоўскага, дзе рознаэтнічныя групы плямёнаў і княстваў бачылі перспектыву і сэнс сумеснага вырашэння сваіх палітычных і эканамічных праблем. Да таго ж той «загадкавы» саюз праіснаваў больш за паўтысячы гадоў.

Складанасці ў вырашэнні праблемы заключаюцца цяпер не толькі ў адсутнасці канкрэтных і пераканаўчых даных, але і ў заблытанасці, нагрувашчванні розных інтэрпрэтацый таго нязначнага, што ёсць і магло б служыць зыходным арыенцірам у пошуках ісціны.

Навуковыя пошукі і дыскусіі вакол балтаў і іх прарадзімы вядуцца даўно. Адна гіпотэза змяняла другую, прытым кожная з іх абрастала шматлікімі тэарэтычнымі распрацоўкамі і трактоўкамі. Ужо ў XV—XVI стагоддзях шырока бытавала думка (аўтар яе Я. Длугаш), нібыта літоўцы і прусы паходзяць ад старажытных рымлян. Засноўваўся такі погляд на адносным падабенстве літоўскай мовы з лацінскай, а таксама на этымалогіі асобных уласных імёнаў і тапонімаў. Аднак найбольш актыўна праблема абмяркоўвалася ў XIX—XX стагоддзях. К. Грэвінгк у сваіх працах даводзіў, што літоўскія і латышскія плямёны перасяліліся ў Прыбалтыку толькі ў V—VI стагоддзях і прыйшлі яны недзе з усходу. Для таго часу ўсходнюю Прыбалтыку засялялі фіна-вугорскія плямёны.

А наогул тэрмін «балты» ад назвы Балтыйскага мора упершыню ўвёў у навуковы ўжытак як агульнае найменне суседняга этнасу нямецкі вучоны-філолаг Г. Несельман у 1845 годзе. Другі нямецкі філолаг і археолаг А. Бецценбергер у канцы XIX стагоддзя выказаў меркаванне, што балты на ўсходнім узбярэжжы Балтыкі жывуць з эпохі неаліту. У 30-ых гадах XX стагоддзя набыла шырокае распаўсюджанне гіпотэза К. Бугі, паводле якой згаданыя плямёны жылі ў басейне верхняга Дняпра і ў Прыбалтыку перасяліліся толькі прыблізна ў сярэдзіне I тысячагоддзя нашай эры пад націскам славян. Аднак меркаванні К. Бугі былі сустрэты вельмі крытычна. На думку археолагаў К. Энгела, Х. Моора і іншых вучоных, балты ўжо з эпохі бронзы жылі ў Прыбалтыцы і далей на ўсход, аб чым ужо гаварылася.

Над праблематыкай балтаў у апошнія дзесяцігоддзі працавалі Р. Рыманцене, Д. Крайноў, Я. Граўдоніс, Л. Ванкіна, В. Сядоў, І. Цымермане, А. Мітрафанаў, А. Таўтавічус, П. Траццякоў і іншыя спецыялісты, аднак сітуацыя, як бачым, праяснілася не да канца.

Многія даследчыкі задаюцца цяпер мэтай даказаць, што на тэрыторыі ўсходняй Прыбалтыкі (ва ўсякім выпадку на працягу некалькіх тысячагоддзяў) рэзкіх змен насельніцтва не было, што матэрыяльная культура ў археалагічных напластаваннях не дае падстаў гаварыць аб наяўнасці такіх змен. І ўсё ж большасць археолагаў Прыбалтыкі фіксуе такі факт: сярэдзінa I тысячагоддзя нашай эры стала рубяжом існавання шэрагу з'яў. Тое супадзенне пакуль не

атрымала належнага навуковага тлумачэння. Сюды трэба аднесці, з аднаго боку, абрыў традыцыі штрыхавання глінянага посуду, знікненне так званай тэкстыльнай керамікі, характэрнай для фінскага этнасу, з другога — з'яўленне новых, раней невядомых пахавальных звычаяў, новых відаў упрыгожанняў і прадметаў быту, змены ў будаўнічых традыцыях. Заўважана тэндэнцыя да перагрупоўкі плямёнаў, іх стракатасць.

Мовазнаўцы Прыбалтыкі схільны лічыць, што фарміраванне рэгіянальных дыялектаў таксама бярэ пачатак недзе ў сярэдзіне I тысячагоддзя нашай эры.

Чаму ж усё сходзіцца менавіта на сярэдзіне тысячагоддзя? Адказ на пытанне льга знайсці, звярнуўшыся да археалагічных помнікаў сярэдняй Беларусі, у прыватнасці Панямоння. Якраз недзе ў сярэдзіне I тысячагоддзя з'явілася тут мноства невядомых раней гарадзішчаў-сховішчаў. У іх не адзначаны культурныя напластаванні. Гэта гаворыць аб кароткім тэрміне выкарыстання і нейкай раптоўнасці небяспекі звонку, якая да тае пары мясцовасці не пагражала. Прыблізна ў той жа перыяд узнікла і вялікая колькасць новых селішчаў, значна аддаленых ад буйных рэк, што сведчыць аб прытоку насельніцтва.

Падзеі таго часу гісторыяграфіяй амаль не асветлены. Малавывучаны яны і ў археалагічным плане. Загадкай застаецца той факт, што старажытныя рускія летапісы чамусьці не фіксуюць у Панямонні прысутнасць славянскіх плямёнаў ці аб'яднанняў. Гісторыкі дапасоўваюць згаданыя мясціны то да дрыгавічоў, то да крывічоў, але робяць тое адвольна. Неверагодна, каб на такім напружана-небяспечным славянскім парубежжы не існавала, напрыклад, у VI—VIII стагоддзях ніякага племяннога аб'яднання. Думаецца, гэтаму павінна быць нейкае гістарычнае тлумачэнне. Летапісы ж абходзяць Наднёманскі край маўчаннем. Між тым якраз тут выспявалі падзеі, якія потым, у палове XIII стагоддзя, прывялі да ўзнікнення загадкавага па сваёй структуры і этнічнаму складу насельніцтва Вялікага княства Літоўскага.

Вернемся ж да праблем суседніх балтаў, чый лёс тут вельмі цесна пераплёўся з лёсам суседніх славян, продкаў беларусаў. Прыгадаем яшчэ раз: ужо ў XIX стагоддзі К. Грэвінгк лічыў, што балты ў пачатку нашай эры яшчэ не засялялі Усходнюю Прыбалтыку. Яны прыйшлі сюды з усходу толькі ў V—VI стагоддзях. Падобнай думкі прытрымліваліся і літоўскі лінгвіст К. Буга, і нямецкі М. Фасмер. Паводле іх меркаванняў, прарадзімай далёкіх продкаў літоўцаў, латышоў з'яўлялася верхняе Падняпроўе.

Ці выпадковым быў такі пункт гледжання? Безумоўна, не. На тое меліся бясспрэчныя аргументы. І сярод важнейшых — пісьмовыя крыніцы, якія ў Сярэдняй Еўропе на пачатку нашай эры кампактнай групы балцкіх плямёнаў не фіксавалі, тым больш у такой агромністай масе. Тэрыторыя Усходняй Еўропы была падзелена паміж іншымі народамі. Невядомым заставаўся толькі ўсход указанага абшару.

Верагодней за ўсё, да IV стагоддзя нашай эры балцкія плямёны кампактна засялялі міжрэчча верхняга Дняпра і Волгі. З поўначы і паўночнага ўсходу іх суседзямі былі фіна-вугорскія плямёны, з захаду і паўднёвага захаду — славяне, з поўдня і паўднёвага ўсходу — іранамоўныя плямёны поўдня і іншыя народы. Аб фінскіх, славянскіх і іранскіх моўных запазычаннях сведчыць нават сучасная лексіка балцкіх народаў.

Недзе прыблізна ў IV стагоддзі пад уздзеяннем страшэннай пагрозы з усходу (магчыма, з боку качавых народаў) балты мусілі, сарваўшыся з абжытых мясцін, паспешліва адкатвацца ў процілеглым ад ворага напрамку — на захад, на заселеныя славянамі тэрыторыі. Агромністы людскі паток, набраўшы разгон, па інерцыі рухаўся да тае пары, пакуль не ўткнуўся ў марскую перашкоду — Венедскі заліў. Напрамак перамяшчэння балтаў ляжаў, відаць, па водараздзеле рэк Заходняй Дзвіны і Нёмана. Тут, у Прыбалтыцы, гэтая людская маса спрасоўвалася, часткова выціскаючы абарыгенаў (славян і фінаў), затым расцякалася па ўжо заселеным наваколлі. Частка ж патоку, абагнаўшы мора з поўдня, працягвала рух, пранікаючы на заходнеславянскія і германскія землі. Адарваўшыся ад асноўнай сваёй этнічнай масы, тыя перыферыйныя астравы-калоніі з цягам часу растварыліся ў іншамоўным асяроддзі, хоць яшчэ потым давалі пра сябе знаць. Тапаніміка фіксуе сляды балцкіх калоній як на тэрыторыі заходніх славян, так і на германскіх землях.

Спрасаваны інэрцыяй руху балцкі масіў у прымор'і амаль выціснуў зусім славян і фінаў, прымусіўшы іх таксама стыхійна адступіць на поўдзень і поўнач. І, магчыма, пэўная колькасць фінаў перасялілася ў глыб славянскіх тэрыторый, дзе існавала як асобная невялікая калонія, а славян — у глыб фінскіх зямель. Нібы па плячах адыходзячых славян і фінаў расцякалася і значная частка балтаў. Пранікаючы на суседнія тэрыторыі, яны абжывалі іх, утвараючы змешанае насельніцтва. У залежнасці ад адлегласці канцэнтрацыя такіх каланістаў змяншалася. Але, напэўна, былі выпадкі, калі адрываліся ад асноўнага масіва і цэлыя групы (невялікія плямёны), што, нават




Схема размяшчэння этнічных груп на сумежжы Беларусі ў IV ст. і напрамак перамяшчэння балтаў

асеўшы ў славянскім асяроддзі, захоўвалі сваю самабытнасць даволі доўга (магчыма, так можна растлумачыць з'яўленне ятвягаў сярод славян).

Раптоўным уварваннем такі магутны іншамоўны этнічны паток не мог не парушыць нармальны рытм жыцця краю. І гэта ў першую чаргу мусіла адбіцца на суседніх з Прыбалтыкай землях.

Само ўзбярэжжа Балтыкі, відаць, у асноўным засяляў фінскі этнас. Славянскі ж масіў выходзіў да мора толькі па вусцях буйнейшых рэк — Нёмана (Гуда) і Заходняй Дзвіны (Рубона), а ў асноўным быў нібы аддалены ад такой небяспечнай стыхіі. Гэта не выключае і змешанасці насельніцтва ў прымор'і да прыходу сюды балтаў. Напэўна, славяне ў Прыбалтыцы колькасна пераўзыходзілі фінаў, і, магчыма, таму заліў (мора) атрымаў назву Венедскага, а не Фінскага.

Менавіта пра такую этнагеаграфічную сітуацыю ў Прыбалтыцы ў пачатку нашай эры згадваюць і старажытныя пісьмовыя крыніцы, якія размяшчаюць венедаў то на ўсход ад Балтыкі, то на поўдзень ад фінаў, то між імі ў раёне Прыбалтыкі. Так меркаваў і мовазнавец Ф. Філін, гаворачы, што славяне не межавалі з морам. Да падобнай думкі можна прыйсці, аналізуючы археалагічныя даныя пачатку нашай эры, прыведзеныя А. Таўтавічусам.

На тэрыторыі пазнейшай Жэмайціі канцэнтрацыя балцкага этнасу была найбольшай, таму тут балцкія асіміляцыйныя працэсы выражаны найбольш яскрава, што ўдаецца прасачыць і на археалагічным матэрыяле. Верагодна, усё ж сам працэс асіміляцыі, як і балцкай каланізацыі, не з'яўляўся агрэсіўна-гвалтоўным. А гэта дазваляла на працягу пэўнага перыяду існаваць паралельна абарыгеннай і прышлай культурам і традыцыям. Толькі з цягам часу браў верх той ці іншы бок, часткова ўспрымаючы штрыхі іншай культуры. Узнікненне гарадзішчаў-сховішчаў і новых селішчаў у басейне левабярэжжа Нёмана — сведчанне тых гістарычных падзей.

Бясспрэчна, асіміляцыйныя працэсы ішлі з двух бакоў, і адгалоскі іх яшчэ добра чуліся ў сярэдневякоўі. Гэта быў цэлы гістарычны перыяд, які, на жаль, не асветлены ні ў хроніках, ні ў гісторыяграфіі. А якраз там і трэба шукаць адказ на многія загадкі ранняй гісторыі Беларусі і Летувы.

Калі аналізаваць гістарычную сітуацыю і славяна-балцкія ўзаемаадносіны менавіта з такіх пазіцый, што пацвярджаецца шэрагам прыведзеных сведчанняў, то відавочна адно: не балцкі субстрат стаўся асновай фарміравання беларускага этнасу. І ніякага балцкага падспуду на тэрыторыі сучаснай Беларусі не існавала. Балцкая гіпотэза павінна быць грунтоўна перагледжана.

Падыходзячы да падзей у русле выкладзенай перспектывы, без асаблівай складанасці можна вытлумачыць даўно хвалюючыя гісторыкаў загадкі: дзе фактычна размяшчаліся тэрыторыі славян на рубяжы дзвюх эр і ў пачатку нашай эры? чаму старажытныя пісьмовыя крыніцы тады не згадвалі пра балтаў як жыхароў Прыбалтыкі? чаму балцкая гідраніміка Задняпроўя больш архаічная (на гэта звярнулі ўвагу лінгвісты), чым на захадзе арэала? чаму ў Беларускім Панямонні такія старажытныя славянскія племянныя фарміраванні, як гуды і іншыя, не захавалі свае назвы да з'яўлення хронік? адкуль і калі ўзніклі між славян ятвягі? якому этнасу належала так званая штрыхаваная кераміка? чаму даследчыкі не заўважалі рэзкай змены насельніцтва ў Прыбалтыцы, хоць такое (часткова) мела месца? Падобны пералік пытанняў льга падоўжыць.

Сапраўды, цяжка было паверыць, каб «згубленыя» гісторыкамі недзе ва Усходняй Еўропе славяне, раптоўна з'явіўшыся ў VI стагоддзі, не толькі «каланізавалі» агромністыя прасторы балтаў, але і літаральна наваднілі Балканскі паўвостраў. Гістарычная неверагоднасць дапаўнялася яшчэ і загадкай нейкага дзіўнага выжывання балтаў толькі ў сучаснай Прыбалтыцы, якая ад тых жа «каланізатараў»-славян не была адгароджана ніякуткімі перашкодамі вось ужо больш за тысячу гадоў.

Балцкая гіпотэза, што ўсё яшчэ дамінуе ў нашай гістарычнай навуцы, не толькі стрымлівае так неабходны аб'ектыўны працэс перагляду гістарычнага мінулага Беларусі, але і накіроўвае яго ў памылковым кірунку. Бясспрэчна, выказаная думка патрабуе крытычнага аналізу і далейшых распрацовак. Але ісціна знаходзіцца ў пошуках і дыскусіях.

НАЗЫВАЛІСЯ ЛІТВІНАМІ

На працягу многіх стагоддзяў да беларусаў (асабліва заходніх тэрыторый) дапасоўваліся загадкавыя старажытныя тэрміны «літвіны», «літва» як уласныя назвы. І ў наш час у асобных мясцінах Палесся па векавой традыцыі паўночна-заходнюю частку Беларусі называюць Літвою, а яе насельніцтва — літвінамі. Ды і горад Брэст яшчэ нядаўна афіцыйна насіў найменне Брэст-Літоўскі. Выдатныя дзеячы краю Кастусь Каліноўскі, Вінцук Дунін-Марцінкевіч, Адам Міцкевіч і іншыя таксама называлі сябе літвінамі.

Праўда, у апошнія стагоддзі тэрмін «літва» стаў набываць іншы, не ўласцівы яму раней сэнс. З абазначэння суседніх з балтамі беларускіх тэрыторый і насельніцтва ён пачаў паступова распаўсюджвацца і на глыбінныя балцкія землі. Раней нашы суседзі летувісы не мелі адзінай агульнанароднай назвы. У склад насельніцтва сярэдневяковай дзяржавы Вялікага княства Літоўскага яны ўваходзілі як аўкштайты і жэмайты (узвышшавыя і нізінныя).

Калі ж нашы продкі ўвялі ў больш шырокі ўжытак словы «беларусы», «Беларусь» — каб неяк вылучыць сябе, падкрэсліць той факт, што насельніцтва Вялікага княства Літоўскага не аднаэтнічнае, а рознае,— стары тэрмін «літва» паступова адышоў да балцкай часткі жыхарства дзяржавы і засвоіўся ім як уласная назва, аб'яднаўшы аўкштайтаў і жэмайтаў у адну народнасць. Але старая форма «літвіны» па-ранейшаму заставалася ў карыстанні беларусаў.

Не выпадкова цяпер, калі ўвага патрыятычных колаў

грамадства скіравана на расчыстку фальсіфікацыйных завалаў у сваёй гісторыі, на паверхню ўсплылі старыя найменні «літвіны» і «літва». Паходжанне і пачатковае сэнсавае значэнне іх схавана недзе ў далетапісным перыядзе нашай мінуўшчыны. Старажытнарускія летапісы, напрыклад, ужо упамінаюць тыя найменні без тлумачэнняў, нібы агульнавядомыя.

Паспрабуем заглянуць у глыбіню стагоддзяў і прасачыць вытокі гэтай загадкі, канцэптуальна звязанай, думаецца, з папярэдняй тэмай, а менавіта з балцкай экспансіяй на славянскія тэрыторыі.

Як ужо адзначалася, пры перасяленні балтаў на тэрыторыю сучаснай Прыбалтыкі недзе ў канцы IV стагоддзя частка гэтага этнасу з-за вялікай спрасаванасці ў міжрэччы Нёмана і Заходняй Дзвіны мусіла расцякацца па заселеным славянамі і фінамі навакольлі, наслойваючыся на мясцовае жыхарства, запаўняючы пустоты між ім. І чым далей ад эпіцэнтра разыходзілася хваля балцкай каланізацыі, тым меншым быў яе ўплыў на жыццё краю. Бясспрэчна, што ў эпіцэнтры і паблізу яго балты ўтваралі этнічную большасць і ў працэсе асіміляцыі тыя рэгіёны даволі хутка ператварыліся ў суцэльна балцкія, хоць асобныя астраўкі абарыгенаў значна паўплывалі і на культуру прышлага насельніцтва, і на іх традыцыі. Пра тое сведчаць матэрыялы археалагічных даследаванняў прыбалтыйскіх археолагаў (публікацыі А. Таўтавічуса, Р. Волкайтэ-Кулікаўскене і інш.). Падобная сітуацыя, толькі з процілеглым знакам, складвалася і на ўскраінах балцкай каланізацыі. Але існавала і шырокая прамежкавая паласа са змешаным насельніцтвам, дзе балцкі этнас складаў значную частку, праўда, намнога меншую, чым славянскі. Тут асіміляцыйныя працэсы значна затарможваліся, нібы затухалі. Мясцовасць тая нагадвала тэрыторыю кампраміснага сужыцця, дзе зрошчванне культур і традыцый адбывалася пры адначасовым спаборніцтве за выжыванне, і гэта вылучала даны рэгіён у асобную зону, што фарміравалася і абумоўлівалася складанасцю новай гістарычнай сітуацыі. У ёй дэфармаваліся многія традыцыйныя набыткі і з аднаго, і з другога боку, знікалі ранейшыя племянныя, а магчыма, і родавыя аб'яднанні, парушаліся сувязі, ушчыльнялася насельніцтва і галоўнае — ва ўсе сферы жыцця ўкліньваўся чужамоўны і чужародны элемент, з якім належала наладжваць пастаянны і неагрэсіўны кантакт. Хаця на першапачатковым этапе балцкая каланізацыя ўспрымалася тутэйшымі славянамі, відаць, вельмі варожа. Доказ таго — мноства гарадзішчаў-сховішчаў, густа рассеяных у басейне левабярэжжа Нёмана.

Выкарыстоўваліся амаль усе суседнія з селішчамі цяжка-даступныя ўзвышшы, астраўкі між балот і іншыя месцы.

Можна меркаваць, што ўсе магчымыя «прыцірачныя» працэсы ў зоне славяна-балцкага засялення маглі завяршыцца са зменай некалькіх пакаленняў. Варожасць паступова згладжавалася, узнікалі кантакты, і, верагодна, у VI—VII стагоддзях у краі ўжо наспела палітычная кансалідацыя, фарміраваліся нейкія грамадскія родаплемянныя структуры. Відаць, недзе ў той час і ўзніклі пазней шырокавядомыя назвы «літвіны», «літва». Паходжанне іх можна звязаць са славянскім словам «злівацца» ў сэнсе аб'ядноўвацца, змешвацца, уліваццa ў нешта супольнае, агульнае. Цяжка сказаць, што паслужыла прычынай для ўзнікнення найменняў «літва», «літвіны»: ці этнічная сітуацыя — аб'яднанне двух этнасаў на адной тэрыторыі, ці, можа, аб'яднанне ўжо нейкіх форм рознаэтнічных палітычных фарміраванняў. Думаецца, у VIII стагоддзі згаданыя тэрміны ўжо існавалі і адносіліся яны да тэрыторыі і насельніцтва буфернай славяна-балцкай зоны. І ніякае гэта не балцкае племя сярод славянскага этнічнага масіву, як мяркуе М. Ермаловіч (Старажытная Беларусь. Мн., 1990), і не фінскае, паводле І. Ласкова і С. Клімковіч (адпаведна: Племя пяці родаў // ЛіМ. 1989. 18 жн.; Па слядах яшчэ аднаго міфа // ЛіМ. 1991. 4 крас.), хоць асобныя калоніі балтаў маглі існаваць на адзначаных М. Ермаловічам тэрыторыях і нязначная частка прыбалтыйскіх фінаў магла быць выцеснена балцкай экспансіяй на сучасныя беларускія землі. Але наўрад ці на такія важныя гістарычныя падзеі мела ўплыў старажытнае племя. Тым больш, што ў самой аснове ўзнікнення Вялікага княства Літоўскага ўжо закладзены саюз славян і балтаў, супольнасць іх інтарэсаў. Інакш дзяржава тая не праіснавала б столькі стагоддзяў, асабліва ў рознаэтнічным складзе.

Відаць, небеспадстаўна прэтэндавалі на летапісную Літву і хадзілі на яе неаднаразовымі паходамі і кіеўскія, і галіцка-валынскія князі, нібы адстойваючы сваіх суродзічаў — славян.

Ні адна са старажытных крыніц не акрэслівае канкрэтна межы старой Літвы. Яны фактычна адсутнічалі, праўдзівей, расплываліся ў залежнасці ад ацэнак і тлумачэння падзей. Розныя дакументы да Літвы адносілі і Гродна, і Ваўкавыск, і Слонім, і Вільню, і Полацкае парубежжа, карацей кажучы, балта-славянскае сумежжа. Хаця гістарычна важкім ядром таго загадкавага фарміравання ў раннефеадальны час выступілі Наваградак і Вільня.

Ці былі паходы на Літву з боку балтаў (аўкштайтаў і

жэмайтаў), канкрэтных звестак няма, калі не лічыць саперніцтваў паміж самімі літоўскімі князямі. Затое з боку паўднёвых суседзяў славян разбуральныя, рабаўнічыя набегі адзначаліся даволі часта. Мабыць, гэта і прымусіла літвінаў аб'ядноўваць намаганні ў абароне сваіх зямель і гарадоў, што і сталася прычынай узнікнення будучага Вялікага княства Літоўскага.

Такім чынам, старажытныя назвы «Літва» і «літвіны», «літва» да сучаснай Летувы і летувісаў маюць ускоснае дачыненне. Славянскія па паходжанні, яны адносіліся ў асноўным да тэрыторыі і насельніцтва пазнейшай Чорнай Русі, г. зн. паўночнай часткі Заходняй Беларусі, а ў асобныя гістарычныя перыяды распаўсюджваліся і на ўсю тэрыторыю Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

ЗАГАДКАВАЕ ПЛЕМЯ

Амаль выпадкова, падчас вандровак на паўночным захадзе Беларусі, маю ўвагу прыцягнулі назвы некалькіх вельмі блізкіх між сабой па гучанні населеных пунктаў: Гудагай, Гудалі, Гудэлі, Гудалішкі, Гудзянікі. Такая з'ява не частая, яна не можа не зацікавіць любога краязнаўца. Пытанне засела ў памяці і паступова выспявала, абрастала новымі данымі, а затым неяк раптоўна ўзнікла думка: гуды! Летувісы ж суседніх беларусаў па старой традыцыі называюць «гудас». Чаму? Простыя жыхары Летувы даць мне пэўны адказ на гэтае пытанне не змаглі, сказалі толькі: так называлі нас даўней. Але чаму — «гуды»? Латышы, напрыклад, ужываюць тэрмін «крієвсы» — ад слова «крывічы». Племя гудаў у старажытнарускіх летапісах не згадваецца, і наогул аб ім нічога невядома. Падумалася: а чаму такое магло стацца?

Мясціны з падобнымі назвамі маюцца ў Астравецкім, Ашмянскім, Лідскім, Воранаўскім, Шчучынскім, Іўеўскім, Мастоўскім раёнах Гродзеншчыны і на сумежных тэрыторыях сучаснай Летувы. Для прыкладу варта ўспомніць некаторыя з іх. У Астравецкім раёне — пасёлак Гудагай, вёска Гудагай, чыгуначная станцыя Гудагай, хутар Гудагай (да 1976 г.), вёска Гудалі, хутар Гудалішкі, вёска Гудзянікі, хутар Гудэлі; у Ашмянскім — хутар Гудалаўка, вёскі Гудаўшчына, Гудзяняты; у Воранаўскім — вёскі Гудзінішкі, Гудэлі; у Іўеўскім — вёскі Гудзішкі, Гудзяняты; у Лідскім — вёска Гуды; у Мастоўскім — вёска Гудзевічы; у Шчучынскім раёне — вёска Гудзішкі. На тэрыторыі

Летувы ёсць паселішчы Гудзеляй, Гудэнэ, Гудынькі, Гудзікус і інш.

Згаданыя населеныя пункты пэўным чынам нібы вызначаюць тэрыторыю, звязаную з назвай «гуды», якая даўно сцерлася з гістарычнай памяці. Тэрыторыя тая значная па плошчы і размешчана ў басейне сярэдняга цячэння ракі Нёмана, пераважна ў паўночнай яго частцы.

Цяпер няпроста ўстанавіць значэнне таго загадкавага гістарычнага, магчыма, этнічнага наймення. Ва ўсякім выпадку пісьмовыя крыніцы не даюць на гэта адказу. Нельга нават упэўнена сцвярджаць, ці яно было славянскім, ці балцкім па паходжанні. Мяркуючы па тым, што плямёны паўднёвых балтаў, продкаў сучасных летувісаў, ды і пазнейшыя летувісы называлі так сваіх суседзяў-славян, г. зн. беларусаў, слова мусіла быць славянскім. І, праводзячы аналогію з назвай «крывічы», засвоенай латышамі, можна з упэўненасцю думаць: «гуды» — назва нейкага славянскага утварэння, магчыма, племя, з якім тая частка балтаў мела цесную лучнасць. Успрынятая ў старажытнасці для абазначэння суседніх славян, яна захоўвала адпаведны сэнс у лексіцы летувісаў і ў пазнейшыя стагоддзі, аб чым сведчаць прыведзеныя найменні населеных пунктаў, пакуль не была заменена новай саманазвай тых жа суседзяў — беларусы.

Як вядома з гістарычнай практыкі, сляды этнічных назваў часцей за ўсё фіксаваліся тапанімікай на перыферыі асноўных тэрыторый, заселеных даным этнасам,— у зоне кантактаў з іншароднымі масівамі. Такім чынам, можна меркаваць, што старажытныя гуды размяшчаліся недзе ў басейне сярэдняга цячэння Нёмана і на паўднёвым усходзе межаваліся са славянскімі плямёнамі дрыгавічоў, а на поўначы — з плямёнамі балтаў. Пазней тая тэрыторыя была названа Чорнай Руссю. Праўда, параўнанні гэтыя вельмі адносныя, бо дапасоўваліся да розных гістарычных перыядаў і, магчыма, да іншага этнічнага складу насельніцтва.

Старажытныя (рускія і іншыя) хронікі, якія пачынаюць свой аповяд прыблізна з VIII—IX стагоддзяў, аб гудах ужо не ўпамінаюць. Відаць, назва ў сваім пачатковым сэнсавым значэнні бытавала раней — бліжэй да падзей, звязаных з так званым вялікім перасяленнем народаў, менавіта тагачасныя падзеі і маглі ўнесці змены ў гістарычную сітуацыю на згаданых тэрыторыях. Праўда, даныя ранняга летапіснага перыяду тыя мясціны чамусьці абыходзяць маўчаннем. Відаць, грамадскае жыццё краю заставалася невядомым для храністаў, чые пісьмовыя сведчанні дайшлі да нас.

У першакрыніцах, якія асвятлялі складаную палітычную сітуацыю на Балканах пасля масавага перасялення туды славян у VI—VII стагоддзях, прыцягваюць увагу звесткі старажытных аўтараў Іаана Каменіяты, Ганны Комнены і іншых аб славянскім племені сагудаў, сагудатаў (магчыма, трэба разумець «з гудаў»), што ў перыяд славянскай экспансіі на Балканскі паўвостраў рассялілася ў Македоніі, на захад ад горада Салуні, заняўшы таксама і гару Афон. Побач з сагудамі тут жыло і другое славянскае племя — дрэгавітаў (дрыгавічоў). Блізкасць рассялення гэтых плямёнаў на Балканскім паўвостраве дазваляе зрабіць выснову: прыйшлі яны на новае месца жыхарства адначасова і арганізавана, што можа сведчыць і пра суседства іх на ранейшых тэрыторыях. Інакш яны наўрад ці маглі выпадкова знайсціся ў такім віры падзей, ды яшчэ на чужых, малавядомых землях.

Усё гэта прыводзіць да наступнай думкі: гуды (сагуды) сапраўды былі паўночна-заходнімі суседзямі палескіх дрыгавічоў, г. зн. племем, якое насяляла калісьці Панямонне, тэрыторыю сучаснай Беларусі і часткова тэрыторыю сучаснай Летувы.

Аб нейкіх гутах (гутонах, гіўдах), што жылі недзе ў паўднёвай частцы Прыбалтыкі, упамінаюць і аўтары I—II стагоддзяў нашай эры Пліній Старэйшы, Тацыт і Пталамей. Паводле апошняга, гутоны (гудоны) жылі на ўсход ад Вісты, ніжэй венедаў і прыбалтыйскіх фінаў. Пталамей называў іх малым народам (племем).

Пазнейшыя гісторыкі тыя звесткі імкнуліся дапасаваць да готаў (тэўтонаў). Па гучанні этнонімы «гуды» і «готы» крыху падобныя, асабліва ў чужым і недакладным вымаўленні. Тым больш што аб гудах было зусім невядома, а готы — народ шматлікі і слынны сваёй ваяўнічасцю і рухомасцю.

Не менш цікавае паведамленне Плінія, які побач з Віскулам або Вістлай згадвае суседнюю вялікую раку Гутал, што ўпадае ў той жа акіян (мора). Магчыма, Гуталам (Гудам) ад славянскага слова «гудзець» тады называўся Нёман. І першае, і другое найменні выведзены на аснове слыхавых успрыманняў цячэння ракі. Ад назвы ракі Гуд і магла паходзіць назва племені, расселенага на яе ўзбярэжжы. Тут можна прывесці аналогіі са словамі «палачане», «бужане».

Згаданая гіпотэза, безумоўна, патрабуе грунтоўных даследаванняў. Варта звярнуць увагу на тое, што да апошняга часу Панямонне гісторыкі звязваюць то з дрыгавічамі, то з крывічамі. Фактычна ж гэта вялікая тэрыторыя, насельнікі якой, напэўна, мелі сваю назву

племені, але яна нечаму перастала існаваць і выпала з гісторыі.

На лёсе гудаў варта засяродзіць увагу, бо менавіта на іх землях ужо ў пачатку II тысячагоддзя нашай эры былі закладзены асновы Вялікага княства Літоўскага.

ВАРЫЯЦЫІ НА ТЭМУ РОСАЎ (РУСАУ)

Нягледзячы на зацікаўленасць і намаганні пакаленняў вучоных, іх шматлікія гіпотэзы і грунтоўныя публікацыі, ужо некалькі стагоддзяў неразгаданым застаецца паходжанне і пачатковы сэнс наймення «росы» («русы»). Не зразумела таксама, чаму назва, маючы нібы адно значэнне, здаўна гучыць дваяка і ўтвораныя пазнейшыя формы слоў, такія, як «Расія» і «рускія», працягваюць традыцыю двух каранёў.

П. Траццякоў, вялікі знаўца ўсходнеславянскай даўніны, пісаў, што паходжанне і старажытнейшая гісторыя назвы «рось-русь» і яе пачатковых носьбітаў з'яўляецца адным з найбольш цёмных і заблытаных пытанняў гісторыі ранняга ўсходнеславянскага сярэднявечча.

Існаванне так званай нарманскай тэорыі паходжання гэтых слоў і наогул дзяржаўнасці на тэрыторыі ўсходняга славянства, думаецца, стрымала працэс грунтоўнага даследавання тэмы. Прыхільнікі той тэорыі пакуль яшчэ не далі пэўнага адказу на пастаўленыя вышэй пытанні. Не даюць яго і шматлікія гіпотэзы антынарманістаў, хоць некаторыя з іх распрацоўваліся цэлымі калектывамі вучоных і лічыліся даволі пераканаўчымі. Адной з найбольш папулярных, між іншым, была думка, выказаная ў свой час Б. Рыбаковым. Паводле меркаванняў акадэміка, тэрмін «рось» («русь») паходзіць ад аднайменнай назвы аднаго з паўднёвых усходнеславянскіх плямёнаў, якое размяшчалася на правабярэжжы Дняпра, між летапіснымі палянамі і ўлічамі, у басейнах рэк Росі і Цясьміна. Племя тое з цягам часу нібы перадало сваю назву саюзу плямёнаў, а затым амаль усяму ўсходняму славянству. Аднак ні ў старажытных рускіх летапісах, ні ў іншых пісьмовых крыніцах яно не згадваецца. Вельмі мала верагоднасці ў тым, што невялічкае буфернае племя славянскіх ускраін (на той тэрыторыі не выяўлена ні славутых палітыка-эканамічных цэнтраў, ні прыкмет нейкай выключнай культуры), адкрытае для шматлікіх качуючых ордаў, змагло не толькі ўстаяць супраць гунаў, аваpаў, хазараў,

полаўцаў, але і аб'яднаць вакол сябе значныя ўсходнеславянскія землі, застаючыся пры гэтым нікому зусім невядомым. Названая версія не змагла задаволіць даследчыкаў, нягледзячы на археалагічныя доказы яе аўтара.

У мінулым стагоддзі вядомы расійскі гісторык С. Салаўёў, спасылаючыся на гістарычныя крыніцы, зрабіў наступную выснову. Варагі і русь (рось) — гэта дружыны людзей, воляй ці няволяй пакінуўшых сваю бацькаўшчыну і вымушаных шукаць шчасця на морах ці ў чужых краінах. Толькі назва «вараг» заходняга, германскага паходжання, а «русь» — агульнае найменне такіх дружын у славянскіх, фінскіх плямёнаў, у грэкаў і арабаў.

Пазней блізка да таго выказваўся і савецкі вучоны С. Юшкоў. На яго думку, старажытнай «руссю» першапачаткова была «асобная сацыяльная група» людзей, якая пазней перадала сваю назву народу. Яе аўтар схільны атаясамліваць з купцамі, і ім аддае прыярытэт у арганізацыі дзяржаўнасці на тэрыторыі ўсходніх славян.

Той жа П. Траццякоў, даследуючы археалагічныя і пісьмовыя сведчанні розных аўтараў, зазначыў, што ён далучаецца «да тых гісторыкаў, якія імкнуцца звязаць узнікненне росаў — русаў з сармацкім светам».

Тут прыведзена, безумоўна, толькі нязначная частка мяркаванняў па закранутай праблеме, хоць большасць гісторыкаў у той ці іншай ступені ўзнімалі гэта пытанне. Паходжанне росаў (русаў), вызначэнне носьбітаў даных найменняў, іх пачатковая гісторыя сталіся тэмамі даследаванняў такіх вядомых вучоных, як Д. Ілавайскі, К. Якубаў, Л. Падалка, Б. Грэкаў, А. Насонаў, М. Ціхаміраў, В. Маўродзін і інш. Цікавіла праблема і гісторыкаў за межамі ўсходнеславянскага свету, дзе было апублікавана нямала навуковых прац, але актуальнай і незакрытай яна застаецца і сёння.

Цяжкасці даследавання звязаны не толькі з невыразнасцю і скупасцю фактаў, але і з іх супярэчлівасцю. Пакуль адзінымі даступнымі крыніцамі з'яўляюцца пісьмовыя звесткі. Паводле іх, ужо ў VI стагоддзі сірыйцы ведалі аб росах (русах) як аб людзях магутнай будовы цела, каторых нават коні не маглі насіць, і таму ў змаганне яны ішлі пешшу. Жылі ж тыя людзі недзе за «Меаційскім балотам» (паведамленне Псеўда-Захарыя).

Аб нейкіх «росамонах» (магчыма, росах-людзях) згадваў у VI стагоддзі готскі гісторык Іардан, спасылаючыся на больш старажытныя даныя. Ён пісаў, што ўжо ў канцы IV стагоддзя «росамоны» не падпарадкоўваліся нават

самому каралю готаў Германарыху. Апошні называў іх вераломнымі.

Гэтыя не зусім выразныя згадкі аўтараў VI стагоддзя таксама скупа дапаўняюцца і больш познімі візантыйскімі і арабскімі сведчаннямі. Так, у «Акруговым пасланні» (866) канстанцінопальскі патрыярх Фоцій зазначыў: «Народ, які многія часта ўспамінаюць і ўслаўляюць, пераўзыходзіць усе іншыя народы сваёй лютасцю і крывапралітнасцю — я гавару аб русах, што, пакарыўшы навакольныя народы, заганарыліся і, зазнаўшыся, паднялі зброю на Рымскую дзяржаву». Паводле П. Траццякова, у першай палове IX стагоддзя «росы-русы як купцы і воіны» пранікалі не толькі на Чорнае мора, але і на ніжнюю Волгу, і ў арабскія краіны Усходу. Згодна з паведамленнем Ібн-Руста, русы былі мужныя і храбрыя, ростам высокія, прыгожыя сабою і смелыя ў набегах, але смеласці сваёй на кані не выяўлялі: усе набегі і паходы рабілі на караблях.

Зыходзячы з усяго сказанага, можна меркаваць, што ў паходах славян на Балканскі паўвостраў у VI—VII стагоддзях росы (русы) мусілі прымаць непасрэдны ўдзел. І ў гэтай сувязі цікавасць выклікаюць сведчанні тагачасных візантыйскіх аўтараў, якія маглі хоць між іншым упамінаць аб росах. Аб склавінах жа і антах яны паведамляюць даволі шмат, няхай і не зусім усебакова. На жаль, аб росах, ці русах, прама ні адзін з гісторыкаў таго часу не згадваў. Магчыма, назва растваралася ў іншых або па значэнні зліваласа з найменнямі «анты» ці «склавіны» як больш масавымі і распаўсюджанымі на тэрыторыі Візантыі. Росы ў той агромністай масе людзей нічым не выдзяляліся, ды і маглі складаць нязначную частку, прытым яны таксама з'яўляліся славянамі, аб чым адназначна сведчаць пазнейшыя візантыйскія пісьмовыя крыніцы.

Сярод мноства згадак аб склавінах і антах у паведамленнях вядомага візантыйскага гісторыка VI стагоддзя Пракопія Кесарыйскага ёсць сцвярджэнне, нібыта некалі нават імя ў гэтых плямёнаў было адно і тое ж, здаўна абодва яны называліся «спорамі» (рассеянымі), відаць, з-за таго, што жылі, займаючы краіну «спорадзен» — рассеяна, асобнымі пасёлкамі. Таму ім і зямлі належала займаць многа.

Аднак ні да Пракопія, ні пасля яго славян і антаў так ніхто не называў. Думаць, што аўтар, згадваючы невядомае іншым найменне, дапускаў памылку,— неверагодна. Да таго ж ён спрабаваў нават растлумачыць грэкам сэнс імя і выводзіў яго ад слова «рассяваць» («рассявацца»). Значыць, Пракопій ведаў не толькі саму назву, якой даўно карысталіся славяне, што праніклі на

тэрыторыю Візантыйскай імперыі, але і яе сэнсавае значэнне. Відаць, ён больш, чым іншыя аўтары таго часу, быў дасведчаны ў жыцці супольнасці, што задоўга да масавых перасяленняў на Балканы ўжо наведвалася туды і, магчыма, з'яўлялася правадніком і ініцыятарам тых перамяшчэнняў. Выдумваць, ствараць нешта новае Пракопію не было патрэбы, бо такая агульная для славян і антаў назва ўжо даўно існавала ў лексіцы рымлян і іншых народаў — гэта «венеды», аб чым Пракопій ніяк не мог не ведаць, хоць ёю не карыстаўся.

На аснове сказанага льга зрабіць наступную выснову. Паведамленне Пракопія — новы і, напэўна, важны штрых у ранняй гісторыі славян. Расшыфроўка яго можа дапамагчы разгадаць і пастаўленае перад намі пытанне паходжання тэрміна «рось» («русь»). Вельмі ўжо верагоднай і спакуслівай з'яўляецца думка, што Пракопій згадваў менавіта аб назве «росы». Параўноўваючы яго звесткі аб росах (русах) і славянах са звесткамі іншых старажытных аўтараў, дзе або прама, або ўскосна ўказваецца, нібыта русы — гэта славяне, складваецца ўражанне, што тыя найменні маюць менавіта славянскае паходжанне, а не сармацкае, аланскае, ці скандынаўскае, як меркавалі некаторыя даследчыкі. Паведамленне Пракопія нібыта пераклікаецца з упамінаннем Іардана аб «вераломных росамонах». Напрошваецца думка: росы як нейкая рухомая славянская маса ўжо ў першай палове I тысячагоддзя нашай эры праніклі далёка на Поўдзень, за межы сваіх зямель.

Якім жа чынам ва ўсходнеславянскім асяроддзі магла з'явіцца назва «росы» («русы»)? У мове значнай часткі тагачасных усходніх (а праўдзівей, цэнтральных) славян слова «росы», напэўна, гучала як «роусы» (дыфтонг «оу» на Палессі захаваўся да нашых дзён). Гэта магло стаць прычынай дваякага ўспрымання тэрміна рознымі групамі насельніцтва, хоць значэнне яго заставалася аднолькавым. І цяпер жа існуюць, напрыклад, паралельныя словы «расіяне — рускія», «Расія — Русь». Такая дваістасць вымаўлення магла быць вельмі архаічнай.

Калі прытрымлівацца думкі, што назвы, уласцівыя пэўнаму этнасу, звычайна выносяцца на перыферыю занятых ім тэрыторый, нібы аслупоўваюць яе, уразаючыся ў чужародны масіў, то гідронімы з коранем «рос» падказваюць нам вобласць, дзе магло найбольш верагодна групавацца насельніцтва — носьбіты наймення «рось» («русь»). Такія гідронімы захаваліся на прытоках Дняпра і Нёмана. На Дняпры — вядомы правы прыток, рака Рось (упадае на поўдзень ад горада Канева), і на Нёмане — яго левы прыток з той жа назвай (упадае ніжэй горада

Масты). Адзін з рукавоў Нёмана, яго дэльты таксама называўся Руса. Можна меркаваць, што рэкі тыя маглі быць умоўнымі паўночнымі і паўднёвымі граніцамі тэрыторыі, дзе лакалізаваліся носьбіты наймення «росы» («русы»). Цэнтр яе прыпадае дзесьці на паўночнае Палессе. Канешне, гэта вельмі адносна. Але калі паведамленне Псеўда-Захарыя аб тым, што росы жылі недзе за «Меаційскім балотам», успрымаць у прамым сэнсе — за балотам, то больш абшырных балот, чым Палескія, на тэрыторыі Паўднёва-Усходняй Еўропы не існавала, і выказаная версія можа прэтэндаваць на верагоднасць. Праўда, некаторыя даследчыкі «Меаційскім балотам» схільны лічыць Прыазоўе.

Развіваючы прыведзенае вышэй меркаванне Пракопія Кесарыйскага аб паходжанні і сэнсавым значэнні назвы «росы» («русы»), можна схематычна ўявіць наступны варыянт версіі. У далёкім мінулым сярод аселых і прывязаных да сваіх родаў і зямлі славян былі адзінкі дасціпных і смелых людзей, якіх вабіла пазнанне блізкага і далёкага навакольля, якім карцела спасцігнуць тое, што яшчэ невядома. І ішлі яны, рызыкуючы жыццём, пракладвалі дарогу прагрэсу, адкрыццям. Аб'яднаўшыся ў невялічкія групкі (каб лягчэй адольваліся перашкоды і небяспека), пранікалі далей і далей на чужыя прасторы, а вяртаючыся дамоў, расказвалі аб усім аднапляменнікам, выклікаючы іх зайздрасць і захапленне. Але адважваліся на такую рызыкоўную справу толькі самыя дужыя, мужныя і выносліўя. Былі гэта сапраўдныя былінныя волаты, аб якіх хадзілі легенды. Кожны паход загартоўваў і ўзбагачаў навыкамі і ведамі кожнага з удзельнікаў, хоць вярталіся не ўсе. Колькасць і склад такіх вандроўнікаў паступова ўзрасталі. Яны разыходзіліся ў розных напрамках. Ніхто не ведаў сваіх маршрутаў, бо адкрываў іх ўпершыню. Тым больш не ведалі гэтага аднапляменнікі, і з тае нагоды гаварылі: «Пайшлі ўрось», г. зн. «врозь», недзе ў розных напрамках, хто куды. Магчыма, з часам паняцце «ісці ўрось» стала набываць акрэсленае значэнне, і людзей, што бралі ўдзел у такіх паходах, пачалі называць проста «росамі» так, як удзельнікаў ваенных паходаў назвалі «воямі». Асвойваючы далёкія маршруты, групкі росаў аб'ядноўваліся ў невялікія дружыны, якія супольна маглі процістаяць нават значнай пагрозе і адчуваць сябе надзейней пры любой засадзе. Адразу гэта былі згуртаванні мірных вандроўнікаў, а затым яны ператварыліся ў дружыны купцоў-воінаў, каму зброя патрабавалася ў асноўным для абароны сябе і маёмасці. Вось такімі росаў (русаў) і апісваюць ужо ў VI стагоддзі арабскія аўтары.

З часам тыя дружыны станавіліся прафесійнымі і ўтваралі прывілеяваную праслойку ў грамадстве. У іх склад уваходзілі не толькі прафесійныя воіны, з'яднаныя лёсам, але і ўмелыя мараходцы, гандляры і найбольш дасведчаныя людзі, якія валодалі багатым вопытам і запазычанымі ў іншых народаў ведамі. Фактычна яны з'яўляліся праваднікамі цывілізацыі, нівеліроўшчыкамі культуры і палітычнай свядомасці плямёнаў. Дружыны русаў пранікалі не толькі на поўдзень у краіны Прычарнамор'я і Блізкага Усходу, але і на захад — у Прыбалтыку і Паўночную Еўропу, асабліва ў Скандынавію. Асноўнымі шляхамі іх паходаў сталіся рэкі і марскія прасторы. Спачатку дружыны не парывалі сувязі са сваімі плямёнамі, вярталіся ў родныя мясціны, затым асобныя ўжо засноўвалі калоніі на чужых тэрыторыях. Ведалі ж іх іншыя народы як прышэльцаў на ладдзях, аб чым сведчаць старажытныя аўтары. Найбольш актыўна праяўлялася дзейнасць русаў на ўзбярэжжы Чорнага мора (Понта) і Балтыкі. Некаторыя аўтары шукалі радзіму русаў недзе на астравах Чорнага мора, таксама як і пазнейшыя гісторыкі звязвалі іх узнікненне з астравамі Балтыкі.

Магчыма, менавіта росы былі асноўным штуршком або адным з асноўных, якія прычыніліся да шырокай хвалі перасялення славян на Балканскі паўвостраў у VI—VII стагоддзях. Верагодна, іх мелі на ўвазе старажытныя аўтары, паведамляючы аб удзеле славян у рымскім войску і іх калоніях на поўнач ад Дуная.

Ёсць падставы меркаваць, што русы (росы) з'явіліся папярэднікамі значна больш позняга руху так званых скандынаўскіх вікінгаў у VIII—XI стагоддзях. І можна пагадзіцца з тым, нібыта ўзнік гэты рух пры ўдзеле русаў — славянскіх каланістаў на Скандынаўскім паўвостраве.

Недзе прыблізна ў VI—VIII стагоддзях на ўсходнеславянскіх тэрыторыях ужо існавалі адпаведныя палітычныя аб'яднанні, у структуры і фарміраванні якіх актыўна ўдзельнічалі русы. На тое ўскосна ўказваюць Фоцій, Канстанцін Багранародны, некаторыя арабскія крыніцы. Менавіта з тым перыядам можа быць звязана і паходжанне такіх гістарычных назваў, як «крывічы», «літва», «русы белыя і чорныя», «прусы» («па-русы»), «корсі» («ко-русі») і інш.

У IX—XIII стагоддзях пад найменнем «русь» разумеліся прафесійныя дружыны воінаў незалежна ад іх этнічнага складу, якія кіраваліся абраным князем. Было яно славянскага паходжання, хоць выкарыстоўвалася і іншымі народамі. Жылі русы не толькі за кошт здабытага, але і

за кошт горада, што наймаў іх, або феадала. Аб тым сведчыць «Руская праўда» і старажытныя летапісы. Акрамя русаў у паходах і бітвах удзельнічалі і проста воі — узброеныя і прыцягнутыя да такой кампаніі мужчыны. Многія князі і гарады наймалі дружыны русаў для аховы краю, або з мэтай помсты за прычыненую шкоду, нечаканым набегам у адказ.

Наогул, пытанне гэта распрацавана яшчэ недастаткова.

ІМЁНЫ НАШЫХ ДАЛЁКІХ ПРОДКАЎ

Старажытныя пісьмовыя крыніцы (у тым ліку хронікі і летапісы) даюць вельмі скупую інфармацыю аб дахрысціянскіх імёнах нашых прашчураў славян. І гэта зразумела, бо пісаліся дакументы прыхільнікамі і прапаведнікамі хрысціянства, служыцелямі новага рэлігійнага культу, які ў даволі жорсткай барацьбе прыйшоў на змену язычніцтву.

Аднак пісьмовыя крыніцы, што складаліся ў ранні хрысціянскі перыяд, зрэдку згадваюць і пра асоб, якія яшчэ не ўспрынялі новыя імёны, звязаныя з хрышчэннем, ці захоўвалі абодва варыянты або перарабілі ранейшыя, набліжаючы іх да хрысціянскіх канонаў. І ўсё ж гаварыць аб паганскіх імёнах нашых продкаў толькі на аснове сціплых пісьмовых даных вельмі складана. Магчыма, таму гэта тэма застаецца амаль не кранутай даследчыкамі.

На шчасце, беларуская мова, адна з найбольш захаваных старажытных славянскіх моў, данесла да нас асобныя старадаўнія формы імёнаў і штрыхі іх эвалюцыйных змен у напрамку хрысціянізацыі. І сёння многія імёны ў беларускім гучанні мала падобныя на царкоўна-хрысціянскія, напрыклад Ян, Хок, Рыгор і інш.

Улічваючы тыя небагатыя звесткі, льга зрабіць выснову, што ў дахрысціянскі перыяд імёны нашых продкаў былі кароткімі, гучнымі, нагадвалі воклік. Праўда, у залежнасці ад часу і ў розных плямёнаў яны маглі вар'іраваць, аднак агульная форма захоўвалася. Каб неяк адрозніваць асоб з аднолькавымі імёнамі, да апошніх дабаўляліся розныя канчаткі або і цэлыя словы, якія часта адлюстроўвалі нейкія характэрныя рысы чалавека, а менавіта: добр, мал, ціх, смел, доўгі і г. д. Атрымліваліся, такім чынам, складаныя імёны накшталт Оль-горд, Мін-доўг. Магчыма, такія словы-характарыстыкі дапасоўваліся да імёнаў асоб, што чымсьці заслугоўвалі асобнай увагі або адметнасці. У звычайных членаў роду да аднолькавых імёнаў дабаўлялі

розныя канчаткі з адным або некалькімі гукамі, напрыклад: Ян, Ян-у, Ян-ік.

Можна меркаваць, што паганскія імёны нашых продкаў маглі гучаць, як Віт, Дан, Ліб, Оль(г), Ціх, Бор, Коль, Мін, Рыг (Рог), Тур, Хок, Юр, Ян, Яр і да т. п. З пранікненнем хрысціянства многія з іх заставаліся ў традыцыйным ужытку, адпаведна змяняючыся ў гучанні ў бок збліжэння з класічна хрысціянскімі варыянтамі. З'явіліся Ціх-ан, Бор-ыс, Дан-ііл, Юр-ый, Яр-а-слаў. Наогул, словы *мір, слаў* сталі распаўсюджанымі дабаўкамі. Напрошваецца вывад: імёны такіх гістарычных асоб, як Рагвалод, Рагнедзь, Тур, Міндоўг, Альгерд, Гедымін, славянскага паходжання.

Гэтай кароткай нататкай хочацца засяродзіць увагу на тэме, даследаванне якой дапаможа зразумець і разгадаць многія таямніцы нашай мінуўшчыны.

ШТРЫХІ З МІНУЛАГА СЛОНІМШЧЫНЫ

Ад зямлі Услонімскай

Слонімшчына — надзвычай цікавы куток Беларускага Панямоння. Рака Шчара — самы буйны левы прыток Нёмана — на працягу многіх стагоддзяў служыла асноўным шляхам, які злучаў Панямонне з Палессем і надаваў басейну значэнне адпаведнай кантактнай зоны. Тут можна ўбачыць сляды як нёманскай, так і палеска-прыпяцкай культур. Доказам таго служаць знаходкі са шматлікіх стаянак, селішчаў і гарадзішчаў краю. Дарэчы, археалагічных помнікаў розных эпох тут значна больш, чым у іншых раёнах Панямоння, што сведчыць і аб шчыльнасці насельніцтва, і аб актыўнасці яго жыцця.

Слонімская зямля (княства) некалі ўключала ў сябе асноўную частку басейна ракі Шчары, часткова басейны рэк Моўчадзі і Зэльвянкі, такім чынам распасціраючыся ад самага левабярэжжа Нёмана на поўначы да палескіх азёраў Спораўскага, Гошчынскага і Бабровіцкага на поўдні. Гэта была параўнальна вялікая тэрыторыя, дзе пазней акрамя галоўнага горада княства — Услоніма з'явіўся шэраг населеных пунктаў: Азярніца, Дзярэчын, Дзятлаў, Вензавец, Раготна, Ражаная, Быцень, Казлоўшчына, Моўчадзь, Палонка, Косаў, Івацэвічы, Здзітаў і інш.

Найменне Услонім (Васлонім) — так мясціна называлася да XIV стагоддзя — паходзіць ад славянскага слова «услона» (заслона), што азначала ўмацаваную перашкоду на

рацэ Шчары. Назва сведчыць аб пачатковым прызначэнні горада — фарпоста на важнай рачной магістралі, які затым стаў сталіцай княства.

У межах сучаснага Слоніма выяўлена каля дзесяці селішчаў і гарадзішчаў IX—XIII стагоддзяў, размешчаных абапал Шчары. Той кампактны куст паселішчаў і з'явіўся пачатковым ядром, асновай будучага горада, узнікненне якога можна аднесці да X стагоддзя. Паколькі ж селішчы і ўмацаваныя гарадзішчы размяшчаліся на абодвух берагах Шчары, горад і пачаў развівацца адначасова абапал ракі. Толькі правабярэжжа з невысокімі пясчанымі пагоркамі, абкружанае балоцістым поплавам Шчары, засялялася шчыльней. Гарадзішча там было больш умацаванае — яно і стала затым цэнтрам горада, яго замчышчам. На жаль, узвышша, дзе размяшчалася згаданае гарадзішча і старажытны замак, як і могільнік пры ім, зрэзаны ў час будаўніцтва чыгункі ў 80-ыя гады XIX стагоддзя.

Побач з другім гарадзішчам, што месцілася на процілеглым беразе Шчары, у 1959 і 1968 гадах праводзіліся невялікія археалагічныя раскопкі. Падчас іх выяўлены матэрыялы XI стагоддзя і частка вала гарадзішча таго перыяду.

Многія гісторыкі схіляліся да думкі, нібыта горад узнік і пачаткова існаваў толькі на левабярэжжы, а замак стаяў на ўзвышаным плато, названым Замчышчам, дзе і вяліся раскопкі. Аднак апошнія не пацвердзілі наяўнасці замкавых збудаванняў раннефеадальнага перыяду. Разнабой у меркаваннях наконт гэтага пытання ўсё яшчэ прадаўжае існаваць, хоць ужо даследавана, што горад развіваўся на абодвух берагах адначасова і пра тое сведчыць яго назва.

Аналізуючы старыя хронікі, і ў прыватнасці «Летапісы» храністаў XV стагоддзя (Я. Длугаша), такія даследчыкі мінулага, як М. Балінскі, Т. Ліпінскі, Бр. Александровіч і іншыя, звярталі ўвагу на тое, што ўжо ў 1040 годзе кіеўскі князь Яраслаў Уладзіміравіч, «спаткаўшыся на палях слонімскіх з літвінамі, перамог іх так, што затым, праехаўшы ўласна Літву да самага Нёмана, прымусіў яе да падпарадкавання на час нейкі».

Можна меркаваць, што ў пачатку XI стагоддзя Слонім ужо не толькі існаваў, але і прыцягваў увагу вялікага кіеўскага князя Яраслава Мудрага. За Слонім змагаліся літоўскія дружыны, і «ўласна Літвой» названа паўночная частка тэрыторыі Слонімскай зямлі, якая распасціралася да самага Нёмана. Калі Я. Длугаш і яго папярэднікі лічылі тэрыторыю Слонімшчыны ўжо Літвой, а археалагічныя матэрыялы сведчаць аб прыналежнасці яе славянам, гэта яшчэ адзін аргумент на карысць той думкі, што пад



Галава паганскага ідала, знойдзеная на ўскраіне Слоніма ў 1937 г.


літвінамі тых часоў трэба разумець не балтаў, а хутчэй змешанае славянска-балцкае насельніцтва. Сляды існавання балцкіх астраўкоў-калоній удаецца прасачыць у паўночнай частцы Слонімшчыны. Думаецца, тыя невялічкія астраўкі сярод суцэльнай славянскай супольнасці маглі з'явіцца недзе прыблізна ў V стагоддзі нашай эры і ў выніку пазнейшага перасялення прусаў.

Паводле гістарычных крыніц, у 1103 годзе каля Слоніма паўднёварускія дружыны сутыкнуліся з моцнай літоўскай заслонай, пасля чаго надоўга былі спынены ўладныя паходы кіеўскіх князёў. І толькі ў сярэдзіне XIII стагоддзя напады аднавіліся, але ўжо з боку галіцка-валынскіх дружын.

Паходы кіеўскіх, а затым галіцка-валынскіх князёў на славяна-балцкае парубежжа выклікаліся не толькі жаданнем збіраць багатую даніну, але і імкненнем падпарадкаваць землі свайму ўплыву, абмежаваць пранікненне балтаў у глыб славянскіх тэрыторый. Набегі тыя чынілі краю спусташэнні, выклікалі варожасць сярод насельніцтва. Магчыма, таму мясцовасць так густа пакрыта ўмацаванымі гарадзішчамі.

Ці мелі месца падобныя рабаўнічыя набегі з боку балтаў? Звестак пра тое няма.

У XI—XII стагоддзях Слонімская зямля, пэўна, яшчэ не мела сваіх князёў, а кіравалася вечавай радай, і таму княствам не называлася. Пры небяспецы свае дружыны вояў рада перадавала абранаму гараджанамі ваяводзе або абранаму супольна з суседнімі землямі князю, надзяляючы яго пэўнымі паўнамоцтвамі. Гэта не быў яшчэ ўсяўладны феадал, падобны на паўднёварускіх князёў. У яго абавязкі ўваходзілі абарона краю і арганізацыя ваенных паходаў.



Археалагічныя раскопкі ў Слоніме. 1959 г.

Калі ж князь не апраўдваў даверу рады, ён «выганяўся» і замяняўся іншым.

Толькі ў пачатку XIII стагоддзя ў так званых Літоўскіх княствах пачалі з'яўляцца князі з больш шырокімі паўнамоцтвамі і сваімі пастаяннымі дружынамі, якія ўплывалі на рашэнні рад. Недзе тады ўжо і закладваліся асновы будучага Вялікага княства Літоўскага, так званай Чорнай Русі, г. зн. не чыста славянскай, а змешанай — літоўскай Русі.

У самым пачатку XIII стагоддзя галіцка-валынскія княжацкія дружыны нанеслі паражэнне літвінам і моцна парабавалі іх землі. У адказ на гэта аб'яднаныя літоўскія дружыны супольна з ятвягамі ў 1205 годзе напалі на Валынь.

Асаблівай пагрозай, якая змусіла старажытную Літву сабраць усе свае сілы ў адзіны кулак, было паяўленне ў Еўропе мангола-татараў. Паводле М. Стрыйкоўскага, літоўскі князь Эрдзівіл з «Руссю з Новаградзяны, Слонімшчаны, Піншчаны і з жмудскім і літоўскім войскам ударыў па Койдану, калі той запатрабаваў ад князя літоўскага даніну за тытул уладара земляў рускіх». Згадваецца, што ў 1241 годзе татары ўсё ж напалі на Слонім і знішчылі яго драўляны замак, які, аднак, адразу ж быў адноўлены з удзелам князя.

Відаць, прыблізна з 1245 года Слонімская зямля стала ахоўвацца аб'яднанымі дружынамі, падначаленымі смеламу і ваяўнічаму князю Міндоўгу, што ўладарыў і на Наваградчыне. А з 1248 года ў слонімскім замку пачаў княжыць яго старэйшы сын Войшалк, супроць чаго актыўна выступілі галіцкія князі. Яны ўпарта дабіваліся падпарадкавання тых земляў сваёй волі і не хацелі пагадзіцца з узмацненнем пазіцый Літвы.


Ужо ў 1249 годзе галіцкі князь Даніла з вялікай дружынай рушыў на Слонім і Ваўкавыск, а праз тры гады «брата си посла на Волковыск, а сына на Услоним, а сам иде ко Здитову: и поимаша грады многы». Як паведамляюць хронікі Быхаўца і Стрыйкоўскага, Даніла і Васілька на Літву пайшлі супольна з татарамі. Аднак, напэўна, паходы супраць Міндоўга не прынеслі Данілу здабыч тэрытарыяльных, бо толькі на падставе Холмскага дагавору 1254—1255 гадоў Слонім, Наваградак і Ваўкавыск часова адышлі пад уладу сына Данілы — Рамана.

Нягледзячы на часовую згоду Міндоўга аб перадачы згаданых гарадоў у княжанне Раману Данілавічу, велікакняжацкая ўлада над імі заставалася ўсё ж у руках Міндоўга. І ўжо ў 1258—1259 гадах, у час набегу татараў на Літву, чорнарускія землі зноў апынуліся пад апекай князёў Войшалка і Таўцівіла. Галіцка-ўладзімірскія князі не пераставалі нападаць на гэтыя княствы ў змове то з татарамі, то з крыжакамі. І калі на поўначы Слонімскай зямлі са згоды мясцовай рады князь Трайдэн пасяліў частку збеглых ад крыжакоў прусаў, князь Уладзімір з братам Львом у 1276 годзе «послаша рать свою ко Вослонимови взяста е, абыше земле не подседали».

У 1281 годзе летапісы ўспамінаюць «князя вослонимского» Васількa, які браў удзел у паходзе на Баляслава мазавецкага разам з князем Уладзімірам валынскім і яго раццю, а гэта сведчыць аб палітычным кантакце між тымі князямі і тэрыторыямі. Якімі былі сапраўды адносіны — партнёрскімі ці не, сказаць цяжка, бо з 1283 года Слонім, а таксама Бярэсце і Пінск зноў ахоўваліся літоўскім князем — смелым і энергічным Віценем, што паспяхова змагаўся як з татарамі, так і з валынскімі князямі.

Раздзяляючы землі свайго княства паміж сямю сынамі, вялікі князь літоўскі Гедымін прызначыў Слонім і Кернаў найстарэйшаму з іх — Монівіду (Монтвіду), які і пачаў княжанне з 1291 года. Астатнія землі Чорнай Русі дасталіся Карыяту, трэцяму сыну.

Пры Альгердзе (быў вялікім князем з 1345 да 1377 года) Слонімшчына заставалася ўдзельным княствам у



Рэканструкцыя схемы Слоніма XIII—XV стст.

складзе Вялікага княства Літоўскага і ахоўвалася яго братам Кейстутам, які валодаў Трокамі. Князь Кейстут з сынам Вітаўтам часта бываў у слонімскім замку і добра ведаў тутэйшыя мясціны. Магчыма, таму Вітаўт, уцёкшы з крэўскага астрога, куды яго кінуў стрыечны брат Ягайла ў 1382 годзе, ратаваўся ад карнай пагоні менавіта на Слонімшчыне. Тут ён знайшоў надзейны прытулак. Адсюль пасля прамінуўшай пагрозы ён накіраваўся ў крыжацкі стан, шукаючы дапамогі ў сваёй барацьбе з Ягайлам.

У 1385 годзе ў Вільні, Крэве, Слоніме і Ваўкавыску прайшлі з'езды ўдзельных князёў і паслоў рад Вялікага княства Літоўскага, на якіх абмяркоўваліся ўмовы аб'яднання з Каралеўствам Польскім. Са Слоніма ў 1386 годзе ўся літоўская дэлегацыя накіравалася на аб'яднаўчы сейм у Люблін.

Пасля трагічнай смерці вялікага князя Кейстута (у 1382 годзе ён па загаду Ягайлы задушаны ў крэўскім замку) Слонім перайшоў пад непасрэдную апеку князя Вітаўта, хоць працягваў кіравацца мясцовай радай. Каб ажывіць рамёствы і гандаль, у гарадах княства было дазволена сяліцца яўрэям. Тады ў Слоніме на тэрыторыі цяперашняга Замосця (у раёне перакрыжавання сучасных вуліц Савецкай і Касманаўтаў) узнікла яўрэйская калонія, а побач з ёй — першы яўрэйскі могільнік (праіснаваў да 1946 года).

Стаўшы вялікім князем, Вітаўт неаднаразова наведваў Слонім, замак і іншыя мясціны краю. Прыязджаў ён сюды з сям'ёй у 1407 і 1409 гадах.

У 1410 годзе пад Грунвальдам у складзе агульнай літоўска-рускай раці, якой камандаваў сам вялікі князь Вітаўт, з крыжакамі змагалася пад трохкутнай чырвонай харугвай і слонімскае рыцарства. Пасля тае пераможнае бітвы ў многіх гарадах княства Вітаўт рассяліў яе ўдзельнікаў — татараў. Так у Слоніме з'явілася татарская калонія, што затым вылучылася ў асобную Татарскую вуліцу (цяпер вуліца імя Кірава).

Пасля Гарадзельскай уніі 1413 года Слонімская зямля (княства) была ператворана ў Слонімскі павет і ўвайшла ў склад Трокскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. Адміністрацыйную, гаспадарчую і судовую ўладу тут з XIV стагоддзя ажыццяўлялі так званыя намеснікі супольна з мясцовай радай. Намеснікі, а затым старосты паветаў назначаліся вялікім князем. Практычна з таго часу Слонімская зямля як удзельнае княства перастала існаваць, хоць і захавала ранейшую тэрыторыю і мясцовую раду.

Пасля смерці Вітаўта (1430) неспакойным стала палітычнае жыццё краю. Літоўскія феадалы-католікі, вядома ж, не без удзелу польскага каралеўскага двара

каралём абвясцілі Жыгімонта Кейстутавіча. Беларускія ж і украінскія феадалы падтрымлівалі кандыдатуру Свідрыгайлы (быў вялікім князем з 1430 да 1432 года), які ў 1432—1436 гадах і ўзначаліў узброенае выступленне супраць Жыгімонта Кейстутавіча за велікакняжацкі тытул. У 1433 годзе Слонімшчына зазнала значныя спусташэнні падчас боек паўстанцаў Свідрыгайлы з войскамі Жыгімонта. Камандаваў войскам апошняга яго сын Міхал. Атрымаўшы шэраг перамог, князь Міхал, якому пры Жыгімонце належала амаль уся Чорная Русь, запісаў Слонім, Ваўкавыск і Камянец у падарунак сваёй другой жонцы Офцы. Але з прыходам у 1440 годзе да велікакняжацкай улады Казіміра Ягелончыка Міхал страціў чорнарускія землі.

Слонім зноў стаў гаспадарскім горадам, адкуль усе падаткі ішлі ў казну Вялікага княства Літоўскага і Кароны, а кіраваўся павет велікакняжацкім намеснікам. Такую пасаду ў Слоніме займаў Бутрым, а з 1483 года — Солтан Аляксандравіч, які ад сына Казіміра вялікага князя Аляксандра атрымаў у 1493 годзе ў спадчыннае карыстанне Жыровіцкі маёнтак.

Недзе ў 1490 годзе вялікім князем літоўскім і каралём польскім Казімірам Ягелончыкам у Слоніме пры Замкавай плошчы быў збудаваны першы ў горадзе каталіцкі касцёл (на месцы яго цяпер узвышаецца касцёл св. Андрэя).

У 1492 годзе вялікі князь Аляксандр прызначыў намеснікам у Слонім Яна Літавора Храптовіча, а ў 1505-ым — Васіля Глінскага. У 1495 годзе па невядомых прычынах з Слоніма, як і з іншых гарадоў княства, выгналі ўсіх яўрэяў (па загаду вялікага князя), а іх маёмасць перайшла ва ўласнасць дзяржавы. Але ўжо ў 1503 годзе загад адмянілі, і ўсе выгнанцы вярнуліся.

З 1500 года Слонім стаў павятовым цэнтрам Наваградскага ваяводства. Па прыкладу Польшчы у паветах Вялікага княства Літоўскага замест намеснікаў былі ўведзены пасады старостаў, якія надзяляліся амаль неабмежаванай уладай. Насельніцтва і гарадоў, і вёсак несла аднолькавыя натуральныя і грашовыя павіннасці. Мясцовае самакіраванне канчаткова страціла сілу.

У 1506 годзе крымскія татары пад кіраўніцтвам Менглі-Гірэя ўшчэнт разбурылі замак і горад, парабавалі святыні. Асабліва моцна зруйнавалі драўляны абарончы замак, размешчаны на невысокім узвышшы правага берага Шчары. Ад яго збудаванняў амаль нічога не засталося, і аднаўляць цытадэль на тым месцы не было сэнсу, тым больш што падобныя ўмацаванні тады ўжо траціл

абарончае значэнне. Ды і цэнтр горада, зацiснуты між балот, патрабаваў пераносу на левабярэжжа.

У 1508 годзе ў ваколiцах Слоніма дзейнiчалі атрады бунтарнага князя Міхала Глінскага, пакрыўджанага вялікім князем Жыгімонтам I Старым. Выступленне брата падтрымліваў і староста слонімскі Васіль Глінскі, празваны Сляпым, які пасля задушэння паўстання збег у Маскву. Новым старостам стаў Ян Радзівіл. Пры ім да 1520 года і быў узведзены на ўзвышшы левага берага Шчары Верхні замак.

З пераносам замка на левабярэжжа перамясціўся і цэнтр горада. Так званае Замосце паступова губляла колішняе значэнне цэнтра. Слонім пачаў расці выключна за кошт левабярэжнай забудовы, што па-ранейшаму нагадвала вялікую вёску, дзе вылучаўся толькі замак і цэрквы. Галоўным заняткам жыхароў з'яўлялася сельская гаспадарка. Рамёствы развіваліся слаба. Аб гэтым сведчыць «Устава павіннасці мяшчан слонімскіх», выдадзеная Янам Радзівілам 26 мая 1522 года.

Вельмі важнай падзеяй у жыцці Слоніма сталася наданне яму каралём Жыгімонтам у 1532 годзе магдэбургскага права, якое «на вечныя часы» ўводзіла ў горадзе самакіраванне і давала значную незалежнасць ад княжацкай адміністрацыі. Цяпер ужо ўсімі справамі займалася выбарная гарадская рада — магістрат на чале з войтам, што ведаў судом і правам, а таксама з бурмістрам, у чыёй кампетэнцыі было гаспадарчае, фінансавае, гандлёвае і культурнае кіраўніцтва. Падзея тая прыкметна садзейнічала развіццю промыслаў, культуры, з'явілася штуршком да абнаўлення вонкавага выгляду горада. Падаткі на карысць казны Вялікага княства Літоўскага вызначаліся больш акрэслена. Так, згодна «распісанню» на 1551 год, серабшчына «з места Слонімскага» складала 30 коп грошай, з Ліды — 20, з Наваградка — 60. Праўда, існавала і даніна непасрэдна ў казну караля. У 1665 годзе, напрыклад, яна складала 100 коп грошай. Былі яшчэ і так званыя каралеўскія прымусовыя пазыкі ў канкрэтных сумах. У 1563 годзе Слоніму належала пазычыць каралю Сігізмунду Аўгусту 200 коп грошай.

Пачынаючы з 1555 года у слонімскім замку засядаў земскі суд. Да гэтага мясцовая шляхта па важных судовых справах мусіла звяртацца да ваяводы трокскага.

Па хадайніцтву слонімскага старосты Гарнастая кароль Жыгімонт II Аўгуст прывілеем ад 13 мая 1558 года ўстанавіў ў Слоніме два двухтыднёвыя кірмашы штогод. Падзея тая спрыяла не толькі развіццю гандлю і прамысловасці, але і росту палітычнага значэння горада,

бо сюды з'язджаліся купцы з усяго краю і нават з-за мяжы. Трэба падкрэсліць, што праз Слонім праходзілі важнейшыя гандлёвыя і транспартныя шляхі: з Вільні ў Бярэсце, з Пінска ў Гародню, з Варшавы на Менск і Смаленск; важным лічыўся і шлях праз Ляхавічы, Клецк, Слуцк на Бабруйск і Рагачоў. Па гэтай прычыне Слонім у XVI стагоддзі становіцца адным з важных эканамічных цэнтраў Вялікага княства Літоўскага. Пра тое сведчыць залічэнне яго да гарадоў гаспадарскіх, або каралеўскіх, дзе размяшчалася і ўправа гараднічага.



Канцлер вялікі літоўскі і староста слонімскі Леў Сапега

Слонімскі павет па-ранейшаму ахопліваў агромністую тэрыторыю і ў значнай частцы быў пакрыты пушчамі, адна з якіх належала нават каралеўскаму двару. У межах павета знаходзіліся буйныя населеныя пункты, а менавіта Здзітаў, Ражаная, Езярніца, Дзярэчын, Вензавец, Дзятлаў, Казлоўшчына, Раготна, Моўчадзь, Палонка, Быцень, Мілавіды, Дзераўная, Косаў, Дзявяткавічы, Вяда і інш. Многія з іх ужо былі мястэчкамі і мелі свой статут і ўправу.

У 1586 годзе пасля Грэгара Валовіча старостам слонімскім стаў Леў Сапега, які затым з'яўляўся і вялікім канцлерам літоўскім, і старостам брэсцкім і магілёўскім. Вядомы палітычны і дзяржаўны дзеяч, адзін з аўтараў-складальнікаў Статута Вялікага княства Літоўскага і адзін з адукаванейшых людзей таго часу, ён пакінуў у гісторыі Слоніма значны след. Новы староста спрыяў уздыму культуры і прамысловасці Слоніма, яго палітычнай знач-

насці. Побач з замкам, на беразе Шчары, Сапега ўзвёў вялікі мураваны палац, названы пазней яго імем. Там па хадайніцтву старосты са студзеня 1597 года праходзілі генеральныя сеймікі Вялікага княства Літоўскага, на якія з'язджаліся пасланцы з Віленскага, Наваградскага, Менскага, Трокскага, Полацкага, Смаленскага, Віцебскага, Брэсцкага, Мсціслаўскага, Інфлянцкага і Чарнігаўскага ваяводстваў. Праводзіліся тыя сеймікі ў Слоніме аж да 1685 года. Адбываліся і сеймікі павятовыя, дзе выбіраліся паслы на сеймікі генеральныя і дэпутаты ў трыбуналы.

Пры замку існавалі неблагая бібліятэка і архіў. Парупіўся Сапега і аб добраўпарадкаванні прымыкаўшых да замка вуліц, прывядзенні ў належны стан мастоў і дарог. Пры яго гаспадараннi былі насыпаны грэблі і дамбы. У 1595 годзе ён аднавіў знішчаны татарамі адзіны каталіцкі касцёл на Замосці. Пісьмовыя крыніцы згадваюць аб вялікай колькасці існаваўшых тады ў Слоніме праваслаўных цэркваў. Па волі старосты і часткова за яго асабісты кошт былі ўзведзены шыкоўныя заезныя дамы. Усё рабілася для таго, каб падкрэсліць дбайнасць і культуру Сапегі, каб дэлегаты і паслы з усяго княства мелі добрае ўражанне ад арганізацыі сеймікаў.

Не без захадаў старосты з 1605 года Слонім атрымаў права склада, што абавязвала купцоў, якія везлі праз горад тавары, спыняцца і гандляваць імі. У тым жа 1605 годзе Леў Сапега заснаваў тут першы ткацкі цэх. А яго сын Казімір, змяніўшы бацьку на пасадзе старосты, ў 1644 годзе заклаў яшчэ некалькі цэхаў. Гэта сфарміравала гістарычную ткацкую традыцыю горада.

Пра Льва Сапегу і сёння нагадвае стары герб Слоніма, дадзены па яго хадайніцтву каралём Жыгімонтам III 4 студзеня 1591 года: на блакітным шчыце залаты леў стаіць на задніх лапах і трымае сярэбраную стралу з падвойным крыжам.

Страшэнным няшчасцем для Слоніма сталіся эпідэміі і пажары. Па прычыне адной з эпідэмій з восені 1604 і да 24 сакавіка 1605 года ў замку была нават спынена ўсякая дзейнасць. А ў 1613 годзе з-за вялікіх пажараў сейм дзяржавы спецыяльным рашэннем вызваліў горад на чатыры гады ад так званых ланавога, шашовага і чаповага чыншаў.

Дакументы сведчаць, што значная частка вёсак Слонімшчыны тае пары ўжо належала рознага рангу землеўладальнікам, якія мала клапаціліся аб дабрабыце сялян. Уся ўвага іх была скіравана на атрыманне найбольшага прыбытку, няхай сабе і за кошт збяднення падуладных. Вясковае жыхарства, абцяжаранае рознымі

натуральнымі і грашовымі паборамі, прымусовымі работамі на памешчыцкіх землях жыло ў бяспраўі і надзвычай бедна. Галеча, гвалт і здзекі, што чынілі асабліва жорсткія памешчыкі, даводзілі многія сем'і да адчаю. Спаліўшы сваю нерухомую маёмасць, яны ўцякалі да «лепшых» памешчыкаў або таемна падсяляліся ў так званыя казённыя вёскі. Прыгонныя сяляне лічыліся ўласнасцю памешчыкаў, імі нават разлічваліся за даўгі або аддавалі іх у заклад. У судовым парадку беглых вярталі ўладальніку, які меў права выносіць адвольнае пакаранне. І ўсё ж уцёкі станавіліся з'явай распаўсюджанай. У пачатку XVII стагоддзя асабліва часта ўцякалі мужчыны. Яны накіроўваліся на поўдзень у казацкія станы; ствараліся і мясцовыя казацка-паўстанцкія атрады, што наганялі страх і крыху прыпынялі лютасць расперазаных памешчыкаў.

У 1615 годзе ў павеце даволі актыўна дзейнічалі казацкія атрады Чалядкі, Каробкі і Каліноўскага. Аднойчы яны нават напалі на горад і парабавалі Замосце. Паводле аднаго са сведак тых падзей, «жалнирыа и казаки и Слонимски павет воевали и в Слониме на посаде за рекой многие дворы пожгли; и на них де прыходили мешчане и их многих побили и живых поймали человек з 70, а в воду посаживали, а иных вешали; а которые де з бою отошли живы и оне де пошли ку Подолу».

Наогул XVII стагоддзе ў жыцці горада і павета было даволі складаным. Пасля Люблінскай уніі 1569 года, якая аб'яднала Вялікае княства Літоўскае і Каралеўства Польскае ў федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую, і асабліва пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 года, што падпарадкавала уніяцкую частку праваслаўнай царквы Ватыкану, засілле каталіцызму і паланізацыя сталі асабліва гвалтоўнымі. Польскія магнаты супольна з каралеўскім дваром і касцёлам павялі спланаваны і арганізаваны наступ на духоўныя і прававыя ўстоі Вялікага княства Літоўскага. Нягледзячы на спецыяльна агавораныя уніяй абмежаванні, яны рознымі палітычнымі і адміністрацыйнымі метадамі перацягвалі на бок касцёла найбольш уплывовую частку беларускіх феадалаў і знаці, а затым і баярства, ператвараючы яго ў шляхту. Парушаліся старыя нацыянальныя традыцыі і культура; у больш заможныя колы паступова пранікала новая спольшчаная духоўная плынь, што ўсё больш адрывала гэтую праслойку ад свайго народа, рабіла яе чужой, а часам і варожай.

У гарады і мястэчкі засылаліся розныя місіянеры, прапаведнікі, ордэны і спецыяльна падрыхтаваныя брацтвы, за якімі стаялі магутныя сілы каралеўскага двара і Ватыкана. Пачалося бурнае будаўніцтва касцёлаў і кляш-



Будынкі былога кляштара бернардзінцаў у Слоніме (збудаванні XVII—XVIII стст.)



Колішняя сінагога, узведзеная ў 1642 годзе

тараў, а пры іх — прапольскіх школ і пансіёнаў. Амаль усе збудаванні ўзводзіліся накшталт крэпасцей — з цэглы, з масіўнымі сценамі, высока паднятымі вокнамі і нават байніцамі. Нярэдка касцёлы мелі падземныя сховы і выхады. Усё прадугледжвала насілле і грунтоўнасць наступу. І ў той жа час таксама спланавана гарэлі драўляныя гарадскія праваслаўныя цэрквы. Калі ў XV—XVI стагоддзях іх у Слоніме і наваколлі налічвалася каля дзесяці, то ў канцы XVIII стагоддзя засталася толькі адна невялікая драўляная уніяцкая царква.

Ужо ў 1630 годзе ў Слоніме заснаваўся каталіцкі ордэн бернардзінцаў. Ён адразу ўзвёў драўляны касцёл, а ў 1639

годзе распачаў і ў 1645-ым закончыў будаўніцтва мураванага касцёла св. Тройцы. У 1664—1670 гадах бернардзінцы пабудавалі мураваны касцёл св. Марыі. У 1650 годзе канонікі лютэранскія ўзвялі свой касцёл побач з колішняй Гандлёвай плошчай. У 1660 годзе з'явіліся мар'явіткі, чые кляштар і капліца месціліся ў Замосці. У 1669 годзе ў горадзе мелі драўляны касцёл бенедыкцінкі, у 1680-ым тут заснаваўся ордэн дамініканцаў, а ў 1705 годзе — езуітаў. Усе ордэны ўзводзілі пры касцёлах свае кляштары.

Процістаяць гэтаму засіллю канфесій у горадзе змагла толькі аб'яднаная нацыянальнымі і рэлігійнымі повязямі яўрэйская абшчына, якая складала пераважную большасць жыхароў. У 1642 годзе яна збудавала вялікую мураваную сінагогу (захавалася да нашых дзён). Існавала яшчэ некалькі школ-малітоўняў — яны групавалі вакол сябе яўрэйскае насельніцтва, што трымала ў сваіх руках амаль усе гарадскія промыслы і гандаль, дыктуючы тым самым свае эканамічныя ўмовы жыццю ўсяго павета.

З другой паловы XVII стагоддзя рашэннем каралеўскай улады ва ўсім княстве афіцыйнае справаводства было пераведзена на польскую мову. Яна стала дзяржаўнай.

З пранікненнем у беларускую вёску запазычаных ад Польшчы метадаў уціску збядненне і абяздоленне сельскага насельніцтва яшчэ павялічылася. Таму з несхаванай надзеяй сустракалі тут казацкія і расійскія войскі, што ў 1655 годзе занялі Слонімшчыну. Аднак акрамя разбурэнняў і жаху падзеі тыя нічога ні мясціне, ні яе жыхарам не далі. Узброены разгул, рабаванні і гвалт за кароткі час давялі край да яшчэ большага заняпаду. Помсцячы за праваслаўную веру, яе ўніжэнне, казацкія атрады грамілі касцёлы і кляштары, знішчалі уніяцкія цэрквы, служыцеляў культу і ўсё тое, што нагадвала аб каталіцызме. Заадно гарэлі і маёнткі, і дамы заможных мяшчан. Разбураны быў і слонімскі замак, які праіснаваў крыху больш за сто гадоў. Разам з ім загінулі архівы, бібліятэка, нямала гістарычных каштоўнасцей. Наогул руска-польская вайна 1654—1667 гадоў пакінула на абліччы краю нямала крывавых шрамаў, і яны не зажывалі доўга.

Сейм 1678 года (засядаў у Гародні), улічваючы вялікія страты, панесеныя Слонімам у час вайны, вызваліў яго на чатыры гады ад усялякіх падаткаў. Паводле згадак у гістарычнай літаратуры, гарадское самакіраванне, якое ў мінулым спрыяла развіццю рамёстваў, гандлю і культуры, цяпер дэградавала, ператварылася ў выканаўцаў волі багатай часткі мяшчан, што за кошт інтарэсаў грамадства дбала толькі пра свой дабрабыт.



Брама XVII стагоддзя пры кляштары бернардзінцаў (разбурана ў 1964 годзе)



Капліца св. Дамініка. XVIII ст.

Як і ў ранейшыя часы, страшным няшчасцем для Слонімшчыны заставаліся эпідэміі. Асабліва знішчальным стаўся мор у 1710 годзе: вымерлі цэлыя вёскі, некаторыя з іх так і не адрадзіліся. Магчыма, у гэтым прычына знікнення Ліпнікаў, Падоськавіч і іншых паселішчаў.

Канец XVII і пачатак XVIII стагоддзя ў жыцці Слоніма, як і ўсяго павета, не вызначаліся нічым асаблівым. Горад паступова залечваў раны, нанесеныя вайной, аднаўляў разбураныя промыслы і культурныя збудаванні. Росту насельніцтва не назіралася. Ранейшы росквіт Слоніма як аднаго з важных гарадоў Вялікага княства Літоўскага змяніўся працяглым заняпадам. Зноў галоўным заняткам мяшчан стала дробная сельская гаспадарка і абслугоўваючыя рамёствы, а асноўным таварам гандлю — сельскагаспадарчая прадукцыя. І такое неакрэсленае,

крызіснае становішча панавала ў цэлым краі. Нарасталі і абвастраліся супярэчнасці паміж шляхтай, што прэтэндавала на ўдзел у палітычным жыцці, і кіруючай феадальнай знаццю, а таксама паміж праваслаўнымі і католікамі. Асабліва ўскладнілася сітуацыя пасля смерці караля Аўгуста III у 1763 годзе. Палітычная барацьба, якая вялася ў асноўным паміж прыхільнікамі двух найбольш уплывовых прэтэндэнтаў на каралеўскі трон — Станіслава Аўгуста Панятоўскага і гетмана Браніцкага, вылівалася ў сутычкі і ўзброеныя выступленні. Станіслава Аўгуста падтрымлівала расійская імператрыца Кацярына II і літоўскія канфедэраты. За яго была і слонімская шляхта. У 1764 годзе ў Слоніме адбылася бітва паміж расійскай арміяй, якая стаяла на баку Літоўскай канфедэрацыі, і войскам віленскага ваяводы Радзівіла (Пане Каханку), прыхільніка гетмана Браніцкага. Вынік бітвы ў пэўнай ступені спрыяў перамозе канфедэрацыі і абранню каралём Станіслава Аўгуста. Сваю кандыдатуру тады выстаўляў яшчэ і буйны магнат Міхал Казімір Агінскі, пазнейшы староста слонімскі, ваявода віленскі (з 1764), гетман вялікі літоўскі (з 1768).



Касцёл св. Андрэя, пабудаваны ў 1775 г.

З прыходам новага караля палітычны крызіс, асабліва на ўсходніх тэрыторыях Рэчы Паспалітай, не патух. Заснаваная ў 1768 годзе ў горадзе Бар (Падолія) канфедэрацыя аб'ядноўвала патрыятычныя сілы, і ў першую чаргу шляхту, для барацьбы супраць умяшання Расіі ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. У 1769 годзе такая канфедэрацыя ўзнікла і ў Слоніме. Яна налічвала каля 3 тысяч узброеных воінаў і рыхтавалася даць бой наступаўшым казацкім атрадам. Аднак пры сутыкненні з



Гетман вялікі літоўскі і староста слонімскі Міхал Казімір Агінскі

імі на рацэ Шчары 12 ліпеня мусіла адступіць у напрамку Нясвіжа. Казакі захапілі горад.

Міхал Казімір Агінскі, будучы ўжо старостам слонімскім, у 1771 годзе прымкнуў да канфедэрацыі, арганізаваў і ўзброіў некалькі тысяч воінаў, размясціўшы іх ў ваколіцах Слоніма і Целяханаў. У сутычках з расійскімі войскамі пад Кобрынам і Зэльваю атрымаў перамогу, але затым каля вёскі Сталовічы быў разбіты колькасна пераўзыходзячай арміяй Суворава.

Пасля гэтага паражэння М. Агінскі назаўсёды адышоў ад вайсковых спраў і амаль стала пасяліўся ў Слоніме. Каля 30 гадоў кіраваў ён Слонімскім паветам і многімі сваімі ўчынкамі ўпісаўся ў гісторыю краю. Каб мець поўную свабоду дзеянняў, Міхалу Агінскаму належала ліквідаваць магістрацкае самакіраванне. І, магчыма, па яго хадайніцтву ў 1776 годзе Слонім пазбавіўся магдэбургскага права. Цяпер ў рукі старосты перайшла практычна неабмежаваная ўлада ў павеце і горадзе. Ён мог выкарыстоўваць па сваім жаданні ўвесь патэнцыял краю: людскія і матэрыяльныя рэсурсы, што давала магчымасць весці шырокія будаўнічыя работы. Так, акрамя шыкоўнага палаца, што вырас у цэнтры Слоніма, па волі старосты пракапалі Малы канал, які выпрастваў русла Шчары і асушваў яе багністы поплаў у межах горада.

Пра палацавы комплекс М. Агінскага варта распавесці падрабязней. Узводзіўся ён побач з разбураным Верхнім слонімскім замкам на штучна падпрафіляваным узвышшы.

З поўдня яно абмяжоўвалася абрывістай каменнай падпорнай сцяною, а з поўначы — шырокім ровам глыбінёй да 6 метраў і перакідным мостам з вартавымі вежамі. Палац, што налічваў 116 пакояў і залаў, вельмі хутка стаў вядомым ва ўсім княстве Літоўскім цэнтрам культуры. Тут у найбольш пышнай «зале багінь» была сабрана цудоўная мастацкая калекцыя. Асобныя пакоі адводзіліся пад бібліятэкі, архівы, мастацкія майстэрні, друкарню. Працавалі тэатр, музычная і балетная школы, драматычная і оперная трупы.

У 1777 годзе М. Агінскі завяршыў аднаўленне і рэканструкцыю колішняга палаца Льва Сапегі пад «оперу». Вялікая сцэна была прыстасавана там для паказу любых самых складаных спектакляў, оперных і балетных пастановак, тэатралізаваных конных баталій і водных феерый. У апошнім выпадку значная частка яе затаплялася вадой з суседняга става, перад гледачамі маглі плаваць лодкі. Прадугледжваліся нават фантаны з падсветкай бенгальскімі агнямі. Акрамя глядзельнай залы меліся і іншыя памяшканні. Для стварэння захапляючага эфекта і высокамастацкага сцэнічнага прадстаўлення запрашаліся вядомыя майстры з-за мяжы. Працавала ў тэатры нямала таленавітых прыгонных выканаўцаў і спецыялістаў.

Рэпертуар трупы па тых часах быў вельмі багаты і складаны. Ён падбіраўся самім М. Агінскім і прыдворнымі прафесіяналамі, выпісанымі з Італіі, Нямеччыны, Чэхіі, Польшчы. Пасля смерці М. Агінскага ў нотнай камеры слонімскага тэатра аказаліся ўсе лепшыя музычныя творы XVIII стагоддзя. Спіс іх налічваў 60 опер, 18 балетаў, 3 музычныя камедыі, 253 сімфоніі і больш за 460 іншых жанраў (кампазіцыі для камернага аркестра, араторыі, арыі, музыка дывертысментаў, асобных танцаў, касцельная, харавыя распрацоўкі і інш.). Нотны збор М. Агінскага сапраўды унікальны. Сам гетман добра ведаў нотную грамату і дасканала валодаў некалькімі музычнымі інструментамі. У час канцэртаў сваёй капэлы нярэдка іграў на скрыпцы, кларнеце, клавікордах, арфе, флейце.

Слонімская опера ў некаторыя гады налічвала больш за сотню выдатных выканаўцаў. Капэла папаўнялася ў асноўным за кошт лепшых вучняў мясцовай музычнай школы, дзе акрамя спецыяльнай падрыхтоўкі выкладаліся і агульнаадукацыйныя дысцыпліны. У яе склад уваходзіла таксама нямала прыгонных сялян. Вядомы некаторыя прозвішчы: Будзевіч, Вайткевіч, Галаўня, Жулевіч, Жукоўскі, Косаўскі, Маліноўскі, Пашкевіч і інш. Аднак былі і вольныя музыканты, што мелі нямецкія, чэшскія, польскія прозвішчы. Музычныя інструменты калектыва лічыліся

аднымі з найлепшых у Еўропе. Капэла суправаджала ўсе тэатралізаваныя пастаноўкі, давала асобныя канцэрты, выступала на адкрытых пляцоўках пры сустрэчах знакамітых гасцей, прымала ўдзел у трыумфальных мерапрыемствах, гастралявала ў іншых гарадах. У розныя часы яе ўзначальвалі скрыпач Мейзнер, кампазітары Паулі, Чыпрыані, Флейшман, вакаліст Данэсі і капельмайстар Фуефані. Гэта быў адзін з найбольш знакамітых музычных калектываў Рэчы Паспалітай. Нездарма па настаянні караля групу найбольш таленавітых выканаўцаў перадалі пазней у варшаўскі тэатр.

Слонім у тыя часы нярэдка называлі палескімі Афінамі. Туды ў святочныя дні з'язджаліся вяльможы з усяго краю і нават з Варшавы. Горад, яго цэнтр, прыбліжаны да палацавага комплексу, быў прыведзены ва ўзорны парадак. Скверы, сады, аранжарэі і рыбныя ставы ствараліся і даглядаліся лепшымі спецыялістамі Еўропы. Малы канал стаў не толькі месцам лодачных прагулак, але і вячэрнім тэатрам пад адкрытым небам.

Немалой заслугай М. Агінскага з'явілася пракладка Вялікага канала (цяпер Агінскі канал), што злучыў Шчару з Ясельдай, а праз іх — Нёман з Дняпром. Капаўся канал прыблізна з 1778 да 1788 года выключна жыхарамі Слонімскага павета. Ён намнога ажывіў гарадскі гандаль. Слонім ператварыўся ў партовы горад, меў свае таварныя склады. Тутэйшыя купцы гандлявалі збожжам і іншымі таварамі нават з замежжам. Штогод сюды прыбывала да сотні грузавых і пасажырскіх суднаў.

Вялікія будаўнічыя работы і дваровая раскоша не маглі абысціся без закабалення падуладных старосце сялян і мяшчан. Нават памешчыкі мусілі падпарадкоўвацца старосце і пастаўляць па яго загаду рабочых з патрэбным інвентаром і цяглавай сілай, а таксама неабходны правіянт. Любы пратэст ліквідоўваўся спецыяльна створанай вайсковай адзінкай — татарскім эскадронам, які выконваў ахоўныя, цырыманіяльныя і карныя функцыі і карыстаўся пэўнымі прывілеямі. Дакументы не захавалі фактаў масавых выступленняў насельніцтва супраць М. Агінскага, і гэта зразумела — усеўладдзе старосты сцірала ўсе сляды.

Варта адзначыць, што ў Слоніме пры двары знакамітага дзядзькі прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады вядомага кампазітара, дыпламата і палітычнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага, аўтара папулярнага паланеза «Развітанне з Радзімай», што агульную, музычную і філасофскую адукацыю ён пачаткова атрымаў менавіта ў Слоніме пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў.

З 1784 года ў горадзе стала працаваць вялікая ткацкая



Сялянская хата XVIII ст. у вёсцы Глоўсевічы Слонімскага раёна

фабрыка, чыя прадукцыя ў хуткім часе выйшла за межы губерні.

З прыняццем канстытуцыі 3 мая 1791 года Слоніму было вернута самакіраванне. Неабмежаваная ўлада М. Агінскага ўжо кантралявалася законам, і гэта сведчыла пра канец яго магутнасці і славы. Ужо ў пачатку 1792 года практычна перастаў існаваць знакаміты тэатр, пачаўся заняпад у палацавым жыцці, хоць М. Агінскі ўсё яшчэ заставаўся старостам павета.

Агульны палітычны крызіс, які раздзіраў і аслабляў Рэч Паспалітую, даваў магчымасць яе суседзям актыўней умешвацца ва ўнутранае жыццё дзяржавы. Асабліва адчуваўся тут уплыў Расіі, што ўсё больш пагражала незалежнасці. Фактычна Масква, а не Варшава, не кароль кіравала краінай. Нарэшце Рэч Паспалітая перастала існаваць як самастойная дзяржава. У 1772 годзе адбыўся першы яе падзел паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй, у 1793-ім — другі, а ў 1795-ым — трэці, апошні. Не выратавалі незалежнасць ні масавы патрыятычны рух, ні гераічнае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі (на-

радзіўся ў фальварку Мерачоўшчына, ля Косава, што ў Слонімскім павеце), задушанае расійскай арміяй, якую ўзначальваў Суворaў. Слонімшчына брала не вельмі актыўны ўдзел у паўстанні, але адна з бітваў здарылася ў прадмесці Слоніма. Гэта адбылося 2 жніўня 1794 года, войскам Часовай рады Вялікага княства Літоўскага камандавалі генерал Серакоўскі і Беляк.

У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай пад уладу Расійскай імперыі трапіла і Слонімшчына.

У складзе Расійскай імперыі

Указам імператрыцы Кацярыны II ад 14 снежня 1795 года з частак колішніх Віленскага, Гродзенскага, Наваградскага і Брэсцкага ваяводстваў была ўтворана Слонімская губерня з цэнтрам у Слоніме. У склад яе ўвайшлі Слонімскі, Гродзенскі, Брэсцкі, Наваградскі, Ваўкавыскі, Лідскі, Пружанскі і Кобрынскі паветы. Аднак губернскім цэнтрам Слонім заставаўся нядоўга.

Паводле ўказа новага імператара Паўла I ад 12 снежня 1796 года, Слонімская і Віленская губерні аб'ядналіся ў адну Літоўскую губерню з цэнтрам у Вільні. Слонім стаў у ёй павятовым горадам, а пасля чарговага перадзелу ў 1801 годзе — цэнтрам Слонімскага павета ў складзе Гродзенскай губерні. Нарэшце адміністрацыйная чахарда закончылася, губерні вызначыліся. Жыццё паступова настройвалася на новы лад, уводзіліся новыя законы і парадкі. У краі раскватароўваліся значныя вайсковыя гарнізоны, а губернатарам даваліся амаль неабмежаваныя правы ваеннага часу.

Слонімшчына з нядаўняга цэнтра культуры і грамадскага жыцця ператваралася ў далёкую ўскраіну Расійскай імперыі, прытым лічылася не надта надзейнай у палітычных адносінах. Заігрываючы з памешчыкамі, царскія ўлады ўвесь цяжар новай кабалы ўзвалілі на плечы сялян і мяшчан. З 1797 года былі ўведзены новыя паборы і павіннасці. Мясцовым жыхарам належала ўтрымліваць вайсковыя гарнізоны, што размяшчаліся тут для застрашвання. Але, нягледзячы на значныя палітычныя перамены, Слонімшчына ў сваім эканамічным жыцці і традыцыйным укладзе прытрымлівалася ранейшага рытму. Межы павета заставаліся нязменнымі, а насельніцтва ў 1797 годзе складала 38 594 чалавекі. У 1781 годзе ў горадзе налічвалася 2516 жыхароў. У 1794 годзе тут мелася 5 мураваных каталіцкіх касцёлаў і кляштараў, парафіяльны касцёл св. Андрэя, драўляны жаночы кляштар, драўляная

уніяцкая царква (згарэла ў 1848 годзе), мураваная яўрэйская сінагога, 6 малітоўных дамоў-школ, 6 іншых мураваных дамоў (у тым ліку чатыры — М. Агінскага) і 666 драўляных дамоў мяшчан.


Далучэнне краю да Расійскай імперыі значна змяніла яго гандлёвыя перспектывы, расшырыла рынак за кошт агромністых прасторaў дзяржавы, якія ў прамысловых адносінах былі развіты значна слабей. На гэтай аснове павялічваліся вытворчыя магутнасці найбольш перспектыўных слонімскіх фабрык, адкрываліся новыя цэхі. Паступова актывізаваўся яўрэйскі прадпрымальніцкі і гандлёвы патэнцыял і за кошт яго ўзрасла колькасць насельніцтва горада. Тым не менш пераарыентацыя гандлёвых сувязей ішла стрымана, бо ў ёй малую зацікаўленасць меў сам урад царскай Расіі, які апасаўся, што разам з гандлем з так званых заходніх губерняў мог пранікаць у цэнтральныя і дэмакратычны, бунтарскі заходні ўплыў.

Геаграфічнае становішча Слоніма — на скрыжаванні важнейшых гандлёвых шляхоў — рабіла яго бойкім месцам. Праз горад праязджала мноства людзей, правозіліся разнастайныя грузы. Адсюль разыходзіліся вядомыя гандлёвыя і паштовыя тракты на Вільню, Менск, Брэст, Гродна, тут праходзіў і шлях, што злучаў Маскву з Захадам. Усё гэта ў значнай ступені прычынялася да развіцця харчовай вытворчасці. Так, у 1810 годзе на 2940 гарадскіх жыхароў было 58 кавярняў, корчмаў і гарэлачных крамаў. У горадзе існавала 26 броварaў (у тым ліку 25 яўрэйскіх), якія штогод выраблялі 4057 вёдраў гарэлкі.

Штотыднёвыя базары сцягвалі ў Слонім нямала сялян з суседніх і аддаленых вёсак і мястэчак. Некалькі разоў на год наладжваліся вялікія кірмашы, якія доўжыліся не адзін дзень, і туды з'язджаліся купцы і сяляне з далёкіх мясцін. Гандаль ішоў не толькі коньмі, быдлам і сельскагаспадарчай прадукцыяй, але і прамысловымі таварамі, ганчарнымі, кавальскімі і іншымі вырабамі. Горад у такія дні ператвараўся ў многагалосы вулей, а пасля кірмашу ў розных напрамках расцякаліся фурманкі сялян, фаэтоны купцоў, брычкі багатых землеўладальнікаў і босая галота.

Слонім з'яўляўся і важным паштовым вузлом. Тут (пры скрыжаванні сучасных вуліц Студэнцкай і Камуністычнай) мелася вялікая паштовая станцыя. Былі ў горадзе заезныя дамы, гасцінныя двары з коннымі дыліжансамі і фаэтонамі.

У XIX стагоддзі жыхары горада актыўна пераходзілі ад сельскагаспадарчых заняткаў да розных промыслаў, рамесніцкіх спраў і гандлю, а рамеснікі пачыналі аб'яд-



План Слоніма 1795 г.: *1* — палац Агінскага; *2* — гандлёвая плошча; *3* — тэатр; *4* — касцёл; *5* — уніяцкая царква; *6* — жаночы бернардзінскі манастыр; *7* — касцёл езуітаў; *8* — манастыр бенедыкцінак; *9* — мужчынскі манастыр бернардзінцаў; *10* — сінагога

ноўвацца ў суполкі і цэхі. Сельская гаспадарка станавілася дапаможнай галіной, і ёю ў асноўным займалася карэннае беларускае насельніцтва. Спецыялізавалася яно і ў ганчарнай, ткацкай, кавальскай і цяслярскай справе. Гандаль жа трымалі ў руках яўрэі.

Палітычная сітуацыя ў краі заставалася не зусім спакойнай. Было нямала незадаволеных новымі парадкамі і ўладамі. Погляды іх скіроўваліся на Захад, дзе ўсё велічней вырысоўвалася постаць Напалеона Банапарта. Чакалі і спадзяваліся на яго прыход пераважна прапольскія элементы, якія і вялі нелегальную прапаганду на карысць французскага імператара. Расійскі цар Аляксандр I у сваю чаргу абяцаннямі стварaў надзеі на ўваскрашэнне неакрэсленай аўтаноміі Вялікага княства Літоўскага ў складзе Расійскай імперыі. Над распрацоўкай будучай канстытуцыі ўзнёсла працаваў Міхал Клеафас Агінскі. Аднак як адзін, так і другі імператар толькі іграли на патрыятычных пачуццях мясцовага насельніцтва.

Год 1812-ы

Вайна праглядвалася ўсё выразней, і гэта накладвала свой адбітак на эканоміку краю. Да таго ж страшная засуха 1811 года выклікала няўрод. Насельніцтву пагражаў голад.

Аляксандр I, адчуваючы, што ваяваць з Напалеонам прыйдзецца ў асноўным на беларускіх землях, канцэнтраваў тут вайсковыя сілы, а губернатарам даў адпаведныя загады аб заўчаснай эвакуацыі рэзерваў і архіваў і аб пільным наглядзе за палітычным жыццём заходніх губерняў. 17 красавіка 1812 года гродзенскі губернатар у сваю чаргу направіў слонімскаму спраўніку ліст, дзе патрабаваў звяртаць асаблівую ўвагу на палітычны рух на тэрыторыі павета і пры выяўленні важных фактаў уласнаручным данясеннем паведамляць яму. Другім лістом ад той самай даты спраўнік папярэджваў аб магчымай засылцы ў Слонім двух французскіх разведчыкаў, называліся іх прозвішчы. Пазней губернатар цікавіўся, ці не знойдзены на тэрыторыі павета замежныя лістоўкі і адозвы. У краі сапраўды шырока дзейнічала французская разведка, актыўна праводзілася прапаганда, чаму ў многім дапамагалі каталіцкія ксяндзы і прапольскі настроеныя памешчыкі.

22 чэрвеня губернатар патрабаваў тэрмінова эвакуіраваць у Пскоў дзяржаўныя ўстановы, банк і слонімскія архівы. Пры гэтым падкрэслівалася неабходнасць вывазу планаў, карт, статыстычных даных, усіх інвентароў і інш.

(Магчыма, таму і цяпер архівы тыя ў большасці невядомыя.)

У ноч на 24 чэрвеня Напалеон Банапарт з арміяй у 600 тысяч салдат пераправіўся цераз пагранічны Нёман. Пачалася руска-французская вайна. Дзве Заходнія рускія арміі — супраць іх быў скіраваны ўдар французаў — з баямі адступалі: 1-ая армія генерала М. Барклая-дэ-Толі (каля 127 тысяч чалавек) на Вільню, а 2-ая армія генерала П. Баграціёна (каля 45 тысяч чалавек) на Ваўкавыск — Слонім.

30 чэрвеня праз Слонім амаль без затрымкі прайшла на Наваградак армія П. Баграціёна ў надзеі на злучэнне з 1-ай арміяй. Аднак сітуацыя змянялася вельмі хутка, і даводзілася мяняць напрамак адступлення.

З Беластока на Слонім рухалася саксонская армія пад камандаваннем генерала Рэгнера, а з Драгічына ішла аўстрыйская армія на чале з генералам Шварцэнбергам. 1 ліпеня тыя два напалеонаўскія патокі зліліся ў Слоніме. Частка армейскіх злучэнняў накіроўвалася на ўсход, у напрамку Менска, некаторыя — на Кобрын, астатнія расквартароўваліся на месцы. Горад быў набіты войскамі. Пачалася жорсткая і спусташальная акупацыя.

Мінулагодняя засуха і вялікі недарод збожжа і без таго выбілі Слонімшчыну з эканамічнай раўнавагі, дык цяпер прыбавілася яшчэ і ўтрыманне вялізарнага кантынгенту войск, якія выграбалі ўсё не толькі для ўласнага спажывання, але і для папаўнення харчовых і фуражных запасаў усёй арміі Напалеона. Да таго ж на горад напалеонаўскі камендант генерал Шварцэнберг налажыў кантрыбуцыю ў 1000 чырвонцаў. Але мяшчане катэгарычна адмовіліся ад выплат, бо і так ўсё было вымецена пад венік. Краю пагражаў голад. Спынілася вытворчасць як прамысловая, так і рамесніцкая, гандаль таксама аказаўся паралізаваны.

У такой катастрафічна складанай эканамічнай і палітычнай сітуацыі прапольскі настроеная частка насельніцтва, акрыленая абяцаннямі Напалеона, павяла актыўную дзейнасць па стварэнні сваіх органаў мясцовай улады і фарміраванні ўзброеных атрадаў. Яны перацягвалі на свой бок тых мяшчан і шляхту, што варожа ставіліся да расійскіх улад. Тутэйшага земскага чыноўніка Фелікса Бронскага абвясцілі на французскі лад прэфэктам горада. Ён хутка ўзяўся аднаўляць адміністрацыйныя ўстановы і колішнія парадкі. Польская мова ў беларускім горадзе стала афіцыйнай.

Паколькі ўся дзейнасць акупацыйных і цывільных улад у асноўным скіроўвалася супраць мясцовага насельніцтва,

на яго агрaбленне і нацыянальнае прыніжэнне, то жыхары павета не падтрымлівалі іх і не выконвалі загадаў. Прыхоўвалася ўсё, што можна было схаваць. Людзі з недаверам ставіліся да ўсіх мерапрыемстваў, выключэннем былі толькі некаторыя памешчыкі і частка гарадской знаці, якая лічыла сябе палякамі.

З удзелам напалеонаўскага генерала, ураджэнца Слоніма Яна Канопкі, паспешна фарміраваўся, пераважна са шляхты, конны полк уланаў, куды ўваходзілі ўжо праслаўленыя ў бітвах эскадроны віленскіх добраахвотнікаў. Адначасова ствaралася і так званая слонімская жандармерыя на чале з капітанам Юргашкам. Арганізавалася таксама народная гвардыя з 54 асоб. Акрамя таго, загадам Напалеона абвяшчаўся рэкруцкі набор, у французскую армію набіраліся мясцовыя сяляне, мяшчане і шляхта. Аднак насельніцтва Слонімшчыны не выяўляла жадання ваяваць за чужыя інтарэсы і хавалася ў лясах.

Такая сітуацыя стварала як у горадзе, так і на вёсцы амаль немагчымыя для жыцця ўмовы. Бясконцы рух войскаў шырыў рабаванні, гвалт і страх. Нездарма з тых трывожных часоў амаль да нашых дзён дайшоў праклён: «Каб цябе пранцы забралі!», што азначала нешта вельмі страшнае. А між тым пад акупацыяй напалеонаўскіх войскаў Слонімшчыны знаходзілася ўсяго толькі каля чатырох месяцаў.

Тэрыторыя былога княства Літоўскага па загаду Напалеона была падзелена на чатыры дэпартаменты: Віленскі, Гродзенскі, Мінскі і Беластоцкі. Слонімскі павет уваходзіў у склад Гродзенскага дэпартамента. Горад Слонім дзякуючы свайму геаграфічнаму палажэнню адыгрываў важную ролю як паштовы вузел і ваенна-стратэгічны пункт. Таму тут канцэнтраваліся значныя сілы саксонскай і аўстрыйскай армій. Напалеон ставіў перад імі задачу: трымаць пад прыцэлам 3-юю рускую армію генерала А. Тармасава, што налічвала каля 43 тысяч салдат і размяшчалася на Валыні. З французскага боку ёй супрацьстаялі: аўстрыйцы — каля 26 тысяч, саксонцы — 12 тысяч і палякі (дывізія Касінскага) — 7 тысяч салдат.

Крытычна ўзважыўшы сітуацыю, А. Тармасаў падзяліў свае войскі на тры групы: адной пачаў наступленне на Пінск, а двума астатнімі — на Брэст. Камандуючы саксонскімі войскамі генерал Рэгнер, палічыўшы, што асноўныя сілы рускіх скіраваны на Пінск, паспешна пакінуў Слонім і рушыў у напрамку Янава. Тым часам Тармасаў, разбіўшы брэсцкі гарнізон саксонцаў, 27 ліпеня ўшчэнт разграміў іх фарміраванні пад Кобрынам. У палон трапіў генерал Кленгэ, 66 афіцэраў і 2234 салдаты. Гэта была



Ахоўны знак каля вёскі Востраў Слонімскага раёна (устаноўлены пасля вайны 1812 г., знішчаны ў 70-ыя гады нашага стагоддзя)

першая перамога расійскіх войскаў у вайне 1812 года. Аднак пасля бітвы пад Гарадзечнам 11 жніўня Тармасаў мусіў адступіць. Толькі аб'яднаўшыся з падаспеўшай з поўдня арміяй адмірала Чычагава і маючы значную перавагу ў сіле над арміяй праціўніка, расійскія войскі ўжо пад агульным камандаваннем адмірала Чычагава пачалі наступленне, адціскаючы ворага на Высокае і Драгічын.

Выдзеленая Чычагавым група генерала Чапліца, якая складалася з пяці конных палкоў і артылерыі, была кінута на Слонімскі напрамак. Адначасова з Гродна на Слонім накіраваўся полк літоўскай гвардыі генерала Я. Канопкі. Вярнуўшыся на радзіму, генерал не мог не расслабіцца, не пагасцяваць. Пасля раптоўных трывожных вестак аб набліжэнні да горада групы Чапліца Канопка падняў полк.

Чапліц уварваўся ў Слонім 20 кастрычніка зусім нечакана, адолеўшы за апошні дзень адлегласць у 70 вёрст. Правадніком у авангардзе ішоў капітан Арнольдзі, што некалькі гадоў назад служыў у Слоніме і добра ведаў мясцовасць. Ён меў заданне падысці да горада непрыкметна, палявымі дарогамі, а затым праз агароды акружыць дом, дзе затрымаўся Канопка, і схапіць яго. Аднак калі Арнольдзі са сваёй групай казакоў пракраўся ў горад, там Канопкі ўжо не было. За гадзіну да таго яго полк паспешна пакінуў Слонім і адышоў у напрамку Дзятлава, а казна палка і жонкі трох генералаў (Зайончка, Дамброўскага і Канопкі) пад аховай эскорту з 250 вершнікаў накіраваліся ў напрамку Дзярэчына.

Чапліц атрымаў тэрміновае данясенне аб сітуацыі ў горадзе ў напрамках руху палка Канопкі. Арнольдзі з сотняй гусараў і паўсотняй казакоў пачаў насцігаць палкавую казну. Конная пагоня паблізу вёскі Галынка дагнала эскорт аховы і брычкі з экіпажамі, якія не чакалі нападу. Невялікая групка ўланаў завязала бой, а Арнольдзі праследаваў казну. Захапіўшы яе ўжо ў вёсцы, ён бачыў, як на беразе рэчкі Луконіцы з парома з'язджала апошняя брычка з жонкай Канопкі. Але мэтай пагоні былі 200 тысяч франкаў. Пакуль Арнольдзі са сваёй групай гнаўся і адбіваў казну палка, Чапліц з налёту разграміў полк Канопкі і захапіў ў палон самога генерала, 13 афіцэраў і 235 уланаў. Астатнія рассеяліся ва ўцёках.

Пасля ўдалай аперацыі Чапліц да падыходу асноўных сіл адмірала Чычагава, г. зн. да 6 лістапада, затрымаўся ў Слоніме ў доме Пуслоўскага. 7 лістапада амаль 60-тысячная армія Чычагава праз Слонім рушыла на Нясвіж і далей у напрамку Менска, разразаючы тылы напалеонаўскіх войскаў.

Горад на некаторы час зноў занялі аўстрыйцы. Але патрапаная армія Напалеона ўжо не магла супрацьстаяць націску Кутузава і пачала паспешна адкатвацца на захад, пакідаючы пасля сябе спустошаны край і ганебную памяць. Пакінуў Слонімшчыну і Шварцэнберг з рэшткамі сваіх фарміраванняў.

Пярэдадзень паўстанцкіх падзей

Страты, панесеныя горадам ад той вайны, давалі аб сабе знаць на працягу многіх гадоў. Асабліва адчувалася гэта ў прамысловасці і гандлі. Зменшылася і колькасць жыхароў, пераважна яўрэяў, да якіх адносіны ў акупацыйны перыяд былі дастаткова суровыя з прычыны іх сімпатый да расійскіх улад. Нават у 1817 годзе насельніцтва Слоніма не дасягала яшчэ даваеннага ўзроўню і складала ўсяго 2408 чалавек.

Калі горад усё ж такі паступова аднаўляў прамысловасць, то вёскі нібы замерлі ў галечы. Сяляне, што падзяляліся на памешчыцкіх, манастырскіх (царкоўных), казённых, гарадскіх і вольных, адрозніваліся вельмі нямногім: усе яны плацілі кабальныя падаткі, адбывалі павіннасці. Аднак асабліва цяжка жылося прыгонным сялянам. Яны складалі пераважную большасць насельніцтва павета, на тэрыторыі якога размяшчаліся маёнткі землеўладальнікаў Пуслоўскіх, Мікульскіх, Стравінскіх, Ржапеніцкіх, Мілачэўскіх, Замойскіх, Валовічаў, Багушэвічаў, Герубовічаў, Пратасевічаў, Сапегаў, Храптовічаў, Тызенгаўзаў. Праўда, пасля 1831 года ўладанні Сапегаў сталі ўласнасцю казны, а яшчэ раней землі Храптовічаў набылі Пуслоўскія. Быценьскія ўладанні Тазенгаўзаў перайшлі да Патоцкіх. Валодалі цэлымі вёскамі і Межаеўскія, Палубінскія, Юндзілы, Слізні, Сегені і інш.

Тэрыторыя ж павета заставалася нязменнай амаль з часоў Жыгімонта Аўгуста. Паводле прывілею, выдадзенага ў Пётркаве 10 красавіка 1565 года, граніца яго пачыналася на поўнач ад упадзення ракі Зэльвы ў Нёман і ішла парэччам яе ўгару, а затым ракой Ражанкай; далей дарогай, што вядзе да Бярозы, адкуль праз раку Ясельду даходзіла да возера Скробаўскага, адтуль да вытокаў ракі Палонкі і затым рэчышчам ракі Моўчадзі аж да вусця яе ў Нёман, ложам якога дасягала пункту выйсця, г. зн. упадзення ракі Зэльвы ў Нёман.

Суседні Слоніму Альбярцін з памешчыцкага двара і невялічкай вёскі Юрздыкі ў пачатку XIX стагоддзя стаў ператварацца ў прамысловы куст. Тут з 1806 года пачала працаваць медная, а з 1811 года суконная фабрыкі. У 1823

годзе драўляна-земляной плацінай-дамбай з двума шлюзамі было перагароджана рэчышча ракі Ісы, што дазволіла мясцоваму памешчыку Ф. Пуслоўскаму стварыць штучнае возера і прымяніць вадзяны рухавік, ад якога працавалі суконная фабрыка і млын. У сваю чаргу гэта дало магчымасць рэгуляваць водны рэжым на Ісе, а затым перанесці яе рэчышчы на другі бок Слоніма, пусціўшы воды ракі па спецыяльна выкапаным канале, названым Капаніцай.

У самім Слоніме і павеце ў 1815 годзе ўжо дзейнічалі 2 суконныя фабрыкі, 3 паперні, вялікая медная фабрыка і шэраг дробных прамысловых і рамонтных майстэрняў, паступова ажыўляўся і гандаль. Толькі за мяжу ў той год са Слонімшчыны адправілі 2000 чвэртак пшаніцы (чвэртка — мера аб'ёму сыпучых рэчываў, роўная 209,91 літра), 30 000 чвэртак жыта, 10 000 чвэртак ячменю, 150 коп лесу, 300 пудоў воску, 500 пудоў мёду, 2990 выраблены шкур, 100 тысяч вёдзер віна.

У 1824 годзе ў Слоніме пачала працаваць буйнейшая суконная фабрыка сенатара М. Навасельцава з 162 рабочымі і 28 ткацкімі станкамі, якая штогод давала каля 30 000 аршынаў тонкага высакаякаснага сукна рознай афарбоўкі. У 1826 годзе адкрылася суконная фабрыка Абрама Каменамосцкага. Акрамя сукна прадпрыемства выпрабляла коўдры. Мелася некалькі буйных гарбарняў, цагельняў, млыноў, дзесяткі піваварняў і броварaў, ганчарныя промыслы і інш.

На 1825 год у горадзе налічвалася ўжо 5364 жыхары, каля 700 дамоў (з іх 14 мураваных), 133 крамы. За 1800—1858 гады тут узведзена 16 новых прамысловых прадпрыемстваў, якія вывелі горад у лік важнейшых прамысловых цэнтраў губерні.

Рэзкі наплыў насельніцтва, яго скучанасць, асабліва ў яўрэйскіх кварталах, выклікалі частыя выбухі эпідэмій. Так, толькі з красавіка да ліпеня 1831 года было зарэгістравана 149 выпадкаў халеры, 86 з іх сталі смяртэльнымі. Адсутнасць лячэбніц і лекараў ускладняла барацьбу з гэтым страшным няшчасцем. Гродзенскі губернатар звяртаўся ў Віленскі універсітэт з просьбай прыслаць у Слонім 5 лекараў, але атрымаў адмову.

Царскія ўлады не ўдзялялі ўвагі ні дабрабыту мяшчан, ні іх культуры. Сачылі толькі, каб была пакорлівасць і рэгулярна выплочваліся падаткі, да таго ж яшчэ з кожных 10 двароў бралі па адной фурманцы для часовых вайсковых патрэб.

Мала дакументаў захавалася з тых часоў, але і яны сведчаць аб крайняй галечы і безабароннасці сялянства

Слонімшчыны. На ўдушэнне любой «непаслухмянасці» кідаліся вайсковыя нарады. Вінаватых збівалі розгамі перад сагнаным натоўпам, ссылалі ў салдаты, гналі ў Сібір і нават вешалі. Насельніцтва краю трымалася ў страху. Але хваляванні нарасталі.

Трывожныя 1831-ы і 1833-і

Весткі аб антыцарскім лістападаўскім паўстанні 1830 года ў Варшаве да горада даляцелі не адразу. Але ўжо ў першыя тыдні пасля пачатку падзей па трактах Слонімшчыны на захад пацягнуліся шэрыя калоны расійскіх войскаў з гарматамі і абозамі, што не магло не насцярожыць насельніцтва. Паўзлі чуткі, спачатку малазразумелыя, а затым усё больш трывожныя: паўстанне!

Спакойны і ціхі край зноў, як і ў 1812-ым, нібы калыхнула ветрам. Аб'яўленне ваеннага становішча ў Гродзенскай, Мінскай, Віленскай губернях і Беластоцкай акрузе і падпарадкаванне ўсёй улады ў заходніх губернях камандуючаму арміяй генерал-фельдмаршалу Дубіч-Забалканскаму сведчыла аб сур'ёзнасці справы і рашучых дзеяннях царызму. Рэзкі наплыў розных армейскіх фарміраванняў, якія то затрымліваліся і расцякаліся па наваколлю, то раптоўна зрываліся і накіроўваліся недзе далей, стваралі абстаноўку нервознасці і напружанасці. Слонімшчына, нібы прыфрантавая зона, поўнілася салдатамі, асабліва ўздоўж трактаў. У горадзе тэрмінова складваліся спісы будынкаў, якія можна было выкарыстаць пад размяшчэнне арміі і пад вайсковыя шпіталі. У першую чаргу ўлічваліся мураваныя збудаванні: кляштары, касцёлы, сінагогі, фабрыкі і нават прыватнае жыллё.

У студзені паступіў загад тэрмінова падрыхтаваць і абсталяваць шпіталі на 600 ложкаў, а праз пару месяцаў — і яшчэ на 2400 ложкаў з пасцелямі і камплектамі бялізны для раненых, дзеля чаго займаліся ўсе больш-менш прыгодныя будынкі горада і мястэчак, зачыняліся школы і фабрыкі, касцёлы і часткова сінагогі, выкарыстоўваліся прыватныя дамы. Толькі Жыровіцкі манастыр па загаду самога імператара Мікалая заставаўся не заняты.

З-за антысанітарыі ў арміі ўспыхнула эпідэмія халеры. Шпіталі хутка запаўняліся хворымі. Паколькі спецыяльных вайсковых казармаў не было і салдаты раскватароўваліся па сем'ях, то халера распаўсюджвалася і сярод цывільнага вясковага насельніцтва.

Для забеспячэння войска у мясцовых жыхароў забіраліся не толькі харч і фураж, але і бялізна для раненых, іншая

маёмасць. Асабліва ўскладняла сітуацыю на сяле ў час веснавых пасяўных работ пастаўка арміі транспартных сродкаў. Толькі ў красавіку 1831 года павет мусіў выдзеліць для вайсковых мэт 2186 фурманак з возчыкамі. Пагаварвалі і аб рэкруцкім наборы. У выніку недахопу рабочых рук і цяглавай сілы на вёсцы яравы клін недасейваўся, мала было і насення. Чакаўся голад.

Сітуацыя ў краі з першых месяцаў насцярожыла памешчыкаў, патрыятычна настроеную шляхту. Гвалтоўнае далучэнне краю да Расійскай імперыі не прынесла дабра нікому, насельніцтва лічыла гэтую з'яву часовай, што і будзіла ў памяці ўспаміны аб былым Вялікім княстве Літоўскім. У крытычных сітуацыях патрыятычныя пачуцці абвастраліся і ўспыхвалі з новай сілай. Разгаралася крыўда за растаптаную Расіяй волю, за зняважанае пачуццё нацыянальнага гонару, расла незадаволенасць. Патрыёты лічылі сваім абавязкам дабівацца палітычных змен і згодны былі падтрымаць любую ідэю дзеля ўваскрашэння колішняга. Паўстанне ў Варшаве давала надзею. Царызм стаўся агульным ворагам і для палякаў, і для літвінаў (г. зн. беларусаў). Таму паўстанне супраць імперыі і цара ў Беларусі сустрэлі прыхільна.

Нават у такіх складаных умовах, калі край быў наваднены вайскоўцамі і дзейнічала ваеннае становішча, рэвалюцыйна настроеныя колы Слонімшчыны вырашылі прыняць удзел у змаганні на баку паўстаўшай Варшавы. Для наладжвання сувязі з Варшавай і атрымання канкрэтных указанняў абралі маладога, энергічнага памешчыка з маёнтка Парэчча Міхала Валовіча. Гэты смелы, дужы і палітычна надзейны чалавек найбольш падыходзіў для ажыццяўлення дзёрзкай задумы. Усе шляхі, што вялі ў напрамку Варшавы, кантраляваліся мноствам яўных і таемных заслонаў, прарвацца праз іх было нерэальна. Таму намецілі прабірацца паўночным шляхам — праз Гродна і Аўгустоў.

Перадкалядным зімовым вечарам у суправаджэнні пяці вершнікаў са свайго маёнтка Міхал Валовіч конна пакінуў Слонімшчыну. Удала абыходзячы заслоны, ён дасягнуў Гродзеншчыны. Але тут нечакана сутыкнуўся з заставай. Групка суправаджэння ў цемры ночы рассеялася. Уцякаючы ад пагоні, Валовіч кінуўся з высокага абрыву з канём у пакрыты крыгамі Нёман.

Слонімшчына чакала вестак, але не дачакалася. Праз тры тыдні з такім жа заданнем прышлося адпраўляць другога пасланца. На гэты раз з расійскім пашпартам на паштовых конях амаль афіцыйна паехаў праз Брэст шляхціц Лявон Пжэцлаўскі. Але і яго экспедыцыя

закончылася безвынікова. Пжэцлаўскі, дабраўшыся да паўстанцаў, уліўся ў іх рады, так і не паведаміўшы нічога на Слонімшчыну. Няпроста было дабрацца да цэнтра і тым больш — вярнуцца назад.

Тым часам сітуацыя ў краі ўскладнялася, улада поўнасцю пераходзіла пад кантроль ваенных. Быў аб'яўлены рэкруцкі набор з 28 студзеня. Слонімскі павет, у якім налічвалася 26 278 мужчын, мусіў паставіць 156 рэкрутаў. А 9 лютага камандуючы Дубіч-Забалканскі аддаў загад адабраць ва ўсіх жыхароў павета, у тым ліку і леснікоў, усю зброю (стрэльбы, рагаціны, паляўнічыя нажы). Непадпарадкаванне загаду пагражала пакараннем згодна прыгавору ваенна-палявога суда.

З прыходам вясны сяляне пачалі прыхоўваць у лясах маёмасць і хавацца самі. Ажывіўся патрыятычны ўздым сярод інтэлігенцыі.

Яшчэ 13 лютага з Нясвіжа для больш дзейснага кантролю за мясцовасцю ў Слонімскі, Наваградскі і Пружанскі паветы была перакінута 2-ая дывізія гусараў. У Слоніме і наваколлі размясціўся яе рэзерв, куды ўваходзілі дзве кавалерыйскія брыгады пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Станковіча. Паўсюдна стаялі палкі: у Ружанах — Елізаветградскі, у Пружанах — Іркуцкі з конной артылерыяй, у Наваградку — арцыкнязя Фердынанда, у Міры — Паўлаградскі з артылерыяй. Карацей кажучы, стварыўся надзейны заслон антыцарскім хваляванням. 5 сакавіка ў Гродзенскім, Ваўкавыскім і Лідскім паветах раскватаравалiся палкі расійскай гвардыі. Воддаль ад цэнтра паўстання між расійскага войска размясціўся Літоўскі корпус, пазней — перайменаваны ў Чацвёрты. У Слоніме акрамя згаданых ужо дзвюх брыгад расійскіх (драгунаў і егераў) стаяла Літоўская конная дывізія. Віленскі тракт у хуткім часе стаў даволі небяспечным, тым больш што ён праходзіў па прыбалтыйскіх тэрыторыях. Ваенным камандаваннем Слоніму адводзілася роля своеасаблівага палітычнага рэгіянальнага цэнтра. Таму шырокімі паўнамоцтвамі, як вайсковымі, так і палітычнымі, надзяляўся генерал-лейтэнант Станковіч, што па-жандарску распраўляўся пры найменшым падазрэнні не толькі з цывільным насельніцтвам, але і з падпарадкаванымі яму вайскоўцамі. Слонімская турма была запоўнена «ненадзейнымі» салдатамі, асабліва з Літоўскай дывізіі.

У канцы сакавіка — пачатку красавіка па вёсках павета і асабліва ў Слоніме хадзілі чуткі, нібыта расійская армія адмаўляецца страляць у паўстанцаў, а Жмудзь і Літва арганізуе паўстанцкія атрады і нападае на расійскія заставы. Чуткі бударажылі насельніцтва, але, заціснутае

ў магутны вайсковы кулак, яно не магло рэагаваць на сітуацыю, насцярожана сачыла за ходам падзей.

11 красавіка паўстанцы з Віленскай губерні перайшлі на тэрыторыю Лідскага павета і забралі коней на станцыі Лапеніца і ў суседніх месцах. Гэта спыніла ўсякую сувязь з Вільняй. Паром жа на пераправе праз Нёман паблізу Лапеніцы ахоўвала рота Валагодскага палка, але яна не адважвалася пакідаць пазіцыі і прасіла падмацавання ў генерала Станковіча, які ў той час паспешна арганізоўваў абарону Слоніма і вайсковых складоў. У Наваградак ён, аднак, накіраваў казацкае падмацаванне і на ўсякі выпадак забараніў кірмаш, што меў адбыцца ў Слоніме 23 красавіка.

16 красавіка паўстанцы забралі коней на станцыі Воранава. Сувязь паміж гарадамі Гродна і Вільняй была паралізавана. Сяляне Наваградчыны, сімпатызуючы паўстанцкаму руху ў суседнім Ашмянскім павеце, спрабавалі наладзіць з імі сувязь. Расійская армія ў адной з аперацый рассеяла паўстанцкае фарміраванне Ашмяншчыны. Яго ўдзельнікі рассыпаліся па навакольных лясах, працягваючы крамольна ўздзейнічаць на сялян.

Слонімшчына, нягледзячы на складанасць сітуацыі, не толькі спачувальна назірала за падзеямі ў суседніх паветах, але і паступова рыхтавалася да больш актыўных дзеянняў. Стваралася так званае цывільнае падполле, ініцыятарам якога выступіў памешчык Казімір Валовіч — бацька Міхала Валовіча. Зручна размешчанае сярод Парэцкіх лясоў яго памесце стала своеасаблівым ядром патрыятычных груповак. Таемна збіралася зброя, праводзілася падрыхтоўчая работа па фарміраванні паўстанцкіх груп.

Прыбыўшы ў чарговы водпуск у Альберцін малодшы сын памешчыка Войцеха Пуслоўскага — карнэт расійскага Александрыйскага палка гусараў Цітус Пуслоўскі, вырашыў не вяртацца на царскую службу. Ён сабраў баявую групу аднадумцаў з памеснай і гарадской моладзі і рабочых фабрык бацькі і, узброіўшы іх, таемна перайшоў на поўдзень павета, у непрыступныя пушчы Палесся. Пры падтрымцы Пуслоўскага-старэйшага, службоўцаў і рабочых прыналежных яму фабрык у Хомску Цітус займаўся вярбоўкай і ўзбройваннем паўстанцаў, іх ваеннай падрыхтоўкай. Атрад павялічваўся даволі хутка і ў маі ўжо налічваў каля 1000 чалавек. Размяшчаўся ён у асноўным у лясах маёнтка Пуслоўскіх Плянта на памежжы з Пінскім паветам. Сярод паўстанцаў аказалася нямала сялян і службоўцаў з Слонімскага і Кобрынскага паветаў.

Не зважаючы на тое, што навакольле поўнілася расійскімі войскамі, Цітус з групай найбольш адданых і добра

ўзброеных сяброў амаль адкрыта раз'язджаў па краі і вербаваў людзей нават у Слоніме, прысутнічаў на банкетах у таварышоў. Гэта сведчыла аб захаванні насельніцтвам канспірацыі і адкрытай варожасці да царскіх улад. Фактычна даносаў на сваіх не было.

Другім значным паўстанцкім фарміраваннем на Слонімшчыне стаўся атрад Антона Бронскага, уладальніка спадчынных маёнткаў у Ісаевічах, Піроніме і на Падолі. Царская следчая камісія адносіла яго да злачынцаў першай катэгорыі, «найгалоўнейшых бунтаўшчыкоў». Рухомы атрад Бронскага, па колькасці невялікі, але размешчаны на небяспечным паўночным ускрайку павета, адыгрываў больш прыкметную ролю, чым нерухомая і амаль нікому не пагражаючая маса ўзброеных людзей Пуслоўскага. Каб пазбегнуць разгрому і блакады, ён мусіў перамяшчацца і гэтым рабіў уражанне не толькі на мясцовае насельніцтва, але і на армейскія гарнізоны. Значных сутычак з рэгулярнымі войскамі атрад асцерагаўся, захоўваючы людзей і ўдала манеўруючы ў непасрэднай блізкасці ад Наваградчыны.

Пуслоўскі і Бронскі падтрымлівалі між сабой сувязь і падпарадкоўвалі свае дзеянні адной мэце — у зручны момант, зліўшыся ў адзіны фронт, выкінуць ворага з зямлі сваіх продкаў. Кожны з іх разумеў, што сваімі дзеяннямі, нават самымі актыўнымі, не змогуць супрацьстаяць рэгулярнай шматлікай арміі праціўніка, і таму яны не распальвалі полымя паўстання, а падтрымлівалі гатоўнасць насельніцтва адгукнуцца ў патрэбны момант. Але момант той не прыбліжаўся, а наадварот, прыкметна пачаў аддаляцца. У маі царская армія актывізавала свае дзеянні. Цярпелі паражэнні рэгулярныя вайсковыя фарміраванні паўстанцаў, хоць вера ўсё яшчэ не пакідала народ.

У канцы мая з Белавежскай пушчы ў напрамку Вільні рухалася рэгулярнае вайсковае злучэнне генерала Хлапоўскага, да якога па дарозе ўсё яшчэ далучаліся паўстанцкія атрады, групы і асобныя патрыёты. Са Слонімшчыны да яго прымкнулі Р. Пжэцлаўскі з Львоўшчыны, А. Булгак з Сяргеевіч, браты Іосіф і Ізідар Мікульскія з Вензаўца і іншыя — усяго 6 чалавек. Фарміраванне Цітуса Пуслоўскага не далучылася да злучэння Хлапоўскага, хоць абодва кіраўнікі трымалі між сабой сувязь. Генерал спецыяльным кур'ерам паслаў Пуслоўскаму патэнт аб прысваенні вайсковага звання палкоўніка і загад аб стварэнні паўстанцкага палка як літоўскага рэзерву.

19 чэрвеня каля Вільні злучэнне генерала Хлапоўскага было разбіта расійскай арміяй. Аб гэтым Войцех Пуслоўскі

тэрмінова паведаміў сыну ў Плянту. Вестка тая на пэўны час нібы паралізавала паўстанцкі рух на Слонімшчыне. На Хлапоўскага ўскладаліся значныя надзеі, якія будзілі паўстанцкі настрой на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага. Цяпер надзеі гаслі. І ўсё ж у пачатку ліпеня наваградскі маршалак Кашыц давёў да ведама Цітуса Пуслоўскага, што жыхары Наваградка гатовы пачаць паўстанне, і прасіў палкоўніка звярнуцца да кіраўнікоў усіх паветаў з заклікам да адначасовага ўзгодненага выступлення. Пуслоўскі такую адозву разаслаў.

19 ліпеня па Наваградку разняслася вестка аб захопе ўзброенымі сялянамі ў Гарадзішчы ўлады і руху іх праз Каменны Брод на вёску Кушалева. Кіравалі паўстанцамі Кашыц і Межаеўскі. Захапіўшы Беліцу ў Лідскім павеце, паўстанцы раззброілі размешчаны там расійскі гарнізон, узялі амуніцыю, дазволілі жыхарам разабраць прадуктовы магазін і, пераправіўшыся паромам цераз Нёман, накіраваліся праз вёску Навіны на Наваградак. Па мясцовасці паляцела чутка, нібы атрад налічвае не менш 400 добра ўзброеных паўстанцаў, хоць Беліцу бралі не больш 150 чалавек.

Ноччу з 20 на 21 ліпеня ўся расійская адміністрацыя Наваградка ўцякла ў Нясвіж. Пакінуў горад і расійскі гарнізон з падпалкоўнікам Фелькерсамам. Ваенны губернатар Храпавіцкі паведаміў яму, што паслаць з Вільні падмацаванне ён не можа, бо свабодных войскаў у яго няма, раіў спадзявацца на генерала Станковіча.

У пятніцу 22 ліпеня паўстанцы занялі Наваградак. З дапамогай суддзі Маскевіча яны спалілі ўсе расійскія дакументы і архівы, раздалі бедным мяшчанам прадукты з магазінаў, забралі зброю і казну, выпусцілі з турмы зняволенных і пад вечар рушылі ў лес. У суботу ў Наваградак увайшоў атрад конніцы, які злучыўся з паўстанцамі, і разам яны накіраваліся ў напрамку Дзятлава насустрач калонам генерала Дэмбінскага, што адступаў з-пад Смаргоні. Па дарозе паўстанцы сутыкнуліся з войскамі генерала Станковіча, які нарэшце адважыўся на выступленне. Даўшы некалькі залпаў з трох гармат, расійскія фарміраванні адышлі ў напрамку Слоніма. 24 ліпеня войскі генерала Дэмбінскага занялі Слонімшчыну і ў Дзятлаве сталі на адпачынак. Затым праз Дварэц, Вензавец, Вялікую Волю, Дзярэчын узялі накірунак на Белавежскую пушчу. На тэрыторыі Слонімскага павета да іх далучыліся наваградскі атрад Кашыца і слонімскі — Бронскага.

Важнае значэнне ў тагачасным палітычным жыцці Слонімшчыны па-ранейшаму мелі падзеі, што адбываліся

на поўдні павета. Палкоўнік Цітус Пуслоўскі заставаўся важнай фігурай у краі. Пад яго кіраўніцтва сцякаліся паўстанцкія патокі не толькі са Слонімшчыны, але і з суседніх Кобрынскага, Пінскага, Пружанскага, Ваўкавыскага і іншых паветаў. Было нямала афіцэраў і падафіцэраў з кадравых войскаў. Палкоўнік, верны ідэі адраджэння Вялікага княства Літоўскага, не прымыкаў да чыста польскага нацыянальнага руху, трымаўся асобна. Але, бачачы, што паўстанне паўсюдна церпіць паражэнне і яго намаганні палітычнай і ваеннай сітуацыі не зменяць, распусціў свае фарміраванні, каб не падстаўляць людзей пад варожыя кулі і не асуджаць іх на кару і жорсткія праследаванні царскіх улад. Было гэта недзе ў канцы ліпеня.

Не ўсе з колішніх паплечнікаў Пуслоўскага змаглі вярнуцца да ранейшага жыцця, праўдзівей, мала хто з іх удастоіўся такога лёсу. Многія самастойна, групамі працягвалі змаганне, часта мяняючы пазіцыі, але групы тыя паступова рассейваліся. Больш заможныя і дасведчаныя ўдзельнікі паўстання знайшлі прытулак на чужыне, у эміграцыі. Іншыя ж папоўнілі насельніцтва Сібіры, нямала загінула. У тутэйшых мясцінах яшчэ доўга блукалі абарваныя, худыя здані былых герояў, адважна падняўшых зброю супраць прыгнятальнікаў.

Сам Цітус Пуслоўскі разам з дзвюма сотнямі найбольш адданых сяброў конна рушыў 28 ліпеня ў напрамку Ружан, а затым зноў павярнуў на поўдзень. У няроўных сутычках з ворагам атрымаў цяжкае раненне і толькі дзякуючы самаахвярнай адданасці сямі сваіх таварышаў дабраўся да аўстрыйскай граніцы, а затым да Львова. Галадаючы і не маючы ніякай перспектывы выжыць там, ён паслаў некалькі чалавек назад у Слонім за дапамогай. Але аднаго з яго пасланцоў — Камінскага у дарозе забілі, а другога — Каранацэвіча схапілі. Эмігранцкі перыяд жыцця Пуслоўскага не даследаваны.

А вось пра далейшы лёс Міхала Валовіча вядома наступнае. Ён трапіў у Варшаву, затым з групай эмісараў быў накіраваны цэнтрам паўстання ў Прыбалтыку з мэтай арганізацыі там прыёму і размяшчэння прыбываючага ў порт Паланга вайсковага рыштунку і зброі, адпраўленых з Англіі.

Амаль дабраўшыся да месца назначэння, яны даведаліся, што Паланга і падыходы да яе заняты рускімі войскамі. Карабель са зброяй чакаўся днямі. Належала нешта тэрмінова рабіць. І эмісары разам з прымкнуўшым камандзірам Тэльшаўскага атрада вырашылі захапіць Палангу. Разбіўшы 10 мая расійскі гарнізон у Дарбіянах,

13 мая яны пачалі штурм Палангі. Бітва была амаль выйграна, але неўзабаве рускім прыйшло падмацаванне, і гэта прымусіла паўстанцаў адступіць. Каля Таўрагі ў няроўнай бітве яны пацярпелі паражэнне. Валовіч зноў накіраваўся за падмогай у Варшаву, аднак, сустрэўшыся з корпусам Гельгута, які спяшаўся на выручку паўстанцаў, вярнуўся і ў якасці ад'ютанта генерала Шыманоўскага, прыняўшы званне ротмістра, праваяваў у літоўскай кампаніі да ліпеня. Затым у складзе корпуса генерала Роланда пераправіўся ў Прусію.

Апынуўшыся у Парыжы, Міхал Валовіч уключыўся ў эмігранцкі патрыятычны рух. Таварыства літоўскіх і рускіх земляў, што існавала там, падтрымлівала маральны дух і будзіла надзеі ў пакінуўшых радзіму беларусаў і летувісаў. Тут Валовіч блізка пазнаёміўся з вядомым ідэолагам польскай эміграцыі Іяхімам Лелевелем, які заснаваў і ўзначаліў Польскі нацыянальны камітэт, і прымкнуў да яго, хоць і прытрымліваўся патрыятычных пазіцый адраджэння Вялікага княства Літоўскага. Магчыма, пад уплывам Лелевеля ён зрабіўся перакананым дэмакратам і палітычным аналітыкам і прыйшоў да высновы: сяляне таму не сталі на бок паўстання на Беларусі, што лічылі яго шляхецкім і прапольскім. Поспех жа магчымы толькі тады, калі ў паўстанцкі рух уключыцца ўсё сялянства.

У Парыжы М. Валовіч зблізіўся з кіраўніцтвам тайнага карбанарскага Інтэрнацыянала, які ў першай палове 1833 года актыўна рыхтаваў усеагульнае выступленне прыгнечаных народаў супраць еўрапейскіх манархаў. У поспех такога паўстання ён паверыў, асабліва калі за яго падрыхтоўку і кіраўніцтва ў Беларусі ўзяўся палкоўнік Ю. Заліўскі, адзін з ініцыятараў лістападаўскага паўстання 1830 года ў Варшаве. Ідэя Заліўскага зводзілася да стварэння ў краі шырокага партызанскага руху. Ужо ў канцы 1832 года ў Францыі распачалася вярбоўка былых паўстанцаў. Іх у наступным годзе меркавалася тайна перапраўляць на Беларусь для арганізацыі там партызанскіх груп, а затым атрадаў. Па прапанове Заліўскага ўся тэрыторыя краю падзялялася на паўстанцкія акругі, што ўключалі па два паветы. Назначаўся начальнік акругі, які на месцы падбіраў бы сабе намесніка і памочнікаў. Міхал Валовіч мусіў узначаліць Слонімска-Наваградскую акругу. Сам Заліўскі збіраўся дзейнічаць на Магілёўшчыне.

Выступленне на месцах мела адбыцца ў 1833 годзе. У пачатку сакавіка змагары супраць манархаў рушылі невялічкімі групкамі ў нялёгкую дарогу праз Швейцарыю.

19 сакавіка М. Валовіч са сваім намеснікам Ю. Яцкевічам перайшлі польскую граніцу каля Быдгашча і праз аўгустоўскія тэрыторыі дабраліся да Гродзеншчыны. 4 красавіка, пражыўшы пэўны час у швагра Валовіча ў Ваўкавыскім павеце, яны былі ўжо ў Парэччы, колішнім памесці Валовічаў, канфіскаваным уладамі за ўдзел гаспадара ў паўстанні.

Тут, у закінутай смалакурні хутара Яловікі (стары фальварак Валовічаў), і пачалі ствараць патрыянскі атрад. Выйшлі на М. Песакоўскага (некалі працаваў аканомам у Яловіках), якому бацька М. Валовіча дараваў вольную. М. Песакоўскі ўзяў на сябе абавязак забяспечваць атрад харчаваннем, адзеннем, зброяй і абяцаў наладзіць сувязь з навакольнымі сялянамі. Першым ён прывёў у атрад прыгоннага Лявона Панасюка з вёскі Парэчча (яму Міхал Валовіч паабяцаў даць вольную з надзелам зямлі), а той — яшчэ двух сваіх аднавяскоўцаў — братоў Яна і Васіля Панасюкоў і Мікалая Фярадку з вёскі Барташы.

На нарадзе вырашылі як найхутчэй накіраваць Ю. Яцкевіча ў суседні павет, а затым у Вільню для сувязі з іншымі атрадамі. Яцкевіч конна адбыў па заданні, але праз некалькі дзён па дарозе ў Вільню яго арыштавалі.

Тым часам М. Валовіч папоўніў атрад сялянамі і, не чакаючы каманды з цэнтра, пачаў дзейнічаць самастойна. Меркаваў напасці адразу на пошту і, забраўшы грошы, купіць зброю, а затым выпусціць са слонімскай турмы вязняў і за іх лік падмацаваць атрад. Далей мелася на мэце шырокая барацьба за волю Айчыны, адмену прыгоннага права і надзяленне сялян зямлёй.

Аднак намеры Валовіча не ажыццявіліся. Пры першай жа засадзе каля вёскі Шундры, на шляху са Слоніма ў Вільню, невялічкі і няўзброены атрад выявіў сябе. Рапарты аб спробе нападу на пошту паляцелі ў адрас гродзенскага губернатара Мураўёва і віленскага губернатара князя Далгарукава. Апошні загадаў спраўніку тэрмінова злавіць нападаўшых, дзеля чаго выкарыстаць салдат, раскватараваных у Слоніме. Праведзеныя аблавы абапал гасцінца ад Слоніма да Задвор'я не далі вынікаў. Мураўёў накіраваў сюды ўрадніка па асобых даручэннях маёра Галянкоўскага. Жыхарам навакольных вёсак належала даносіць звесткі пра атрад, інакш ім пагражалі канфіскацыя маёмасці і пакаранне. Запалохванне зрабіла сваю справу. 13 мая Галянкоўскі паведаміў Мураўёву, што да яго прыйшоў капітан запаса былых польскіх войскаў памешчык Валовіч, уладальнік маёнтка Кіеў (у 17 вёрстах ад Слоніма), і

расказаў аб тым, як да яго вечарам заходзіў бунтаўшчык Міхал Валовіч з узброенымі людзьмі і патрабаваў сялян у свой атрад. Атрымаўшы адмоўны адказ, ён пайшоў, а пасля гэтага ў памешчыка прапалі фурман і цясляр.

Аблавы яшчэ больш узмацніліся, але атрад М. Валовіча пакінуў тэрыторыю Слонімшчыны. Яго шукалі па ўсёй Гродзенскай губерні і нават Мінскай і Беластоцкай акругах. На дарогах і пераправах выстаўляліся сакрэты.

17 мая схапілі моцна захварэўшага Лявона Панасюка і пры здзеках той назваў магчымае месца знаходжання паўстанцаў.

22 мая паблізу паштовай станцыі Дзедаў Слонімскага павета 28 арыштаваных раззброілі салдат-канваіраў і з іх зброяй 21 чалавек уцёк у лес. Каб не дапусціць злучэння гэтай групы з атрадам Валовіча, Мураўёў сцягнуў для аблавы вялікія сілы. Удалося злавіць яшчэ пяць паўстанцаў. Валовіч быў няўлоўны. Тады губернатар накіраваў сюды больш за тысячу чалавек, і нарэшце 25 мая Міхала Валовіча схапілі. На наступны дзень яго даставілі ў Гродна. Першае дазнанне рабілі пракурор Санкоўскі і падпалкоўнік корпуса жандараў Папоў у прысутнасці Мураўёва. Валовіч маўчаў.

11 чэрвеня 1833 года адбыўся суд. Акрамя М. Валовіча судзілі яшчэ 10 сялян, абвінавачаных у барацьбе супраць царскага рэжыму. 21 чэрвеня вынеслі вырак. М. Валовіча, «здрадніка, валацугу, бунтаўшчыка і кіраўніка ўзброенай шайкі», прысудзілі да пакарання смерцю праз чацвертаванне. 24 чэрвеня віленскі губернатар Далгарукаў чацвертаванне замяніў смертнай карою праз павешанне. Лявон Панасюк, Тодар Сайчук, Тамаш Васіліцкі, Ян Марцінкевіч, Ян Панасюк, Мікола Фярадка былі прыгавораны да лупцоўкі бізунамі і высылкі на катаргу. Васіля Панасюка, Аляксандра Лапко і Сцяпана Сідарэвіча пасля бізуноў адправілі рэкрутамі ў сібірскія штрафныя роты, Міхала Песакоўскага — на пасяленне ў Сібір.

Паводле архіўных дакументаў, М. Валовіча павесілі 2 верасня ў Гродне за Скідэльскай заставай, недалёка ад тагачаснай парахоўні. Далгарукаў у сваім рапарце начальству паведамляў, што адбылося тое «со всей возможной торжественностью» і каштавала Расійскай імперыі 17 рублёў. За ліквідацыю атрада Валовіча была зацверджана сума ў 4381 рубель і 42 капейкі.

Баючыся Валовіча і мёртвага, улады загадалі цела яго таемна перавезці і ноччу закапаць у вапнавым кар'еры.

Паўстанцкі рух трывожных 1831 і 1833 гадоў на Слонімшчыне фактычна стаўся рэпетыцыяй паўстання 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

Слонім усё прыкметней пашыраў свае межы, расла колькасць насельніцтва. У 1837 годзе тут налічвалася 7474 жыхары (3879 мужчын і 3595 жанчын), з іх 552 — малодшыя вайсковыя чыны.

У горадзе мелася 15 вуліц і завулкаў, з якіх 10 былі забрукаваныя, 3 гарадскія плошчы (забрукаваная толькі адна), 4 драўляныя масты, 4 прыватныя сады, 100 агародаў, 4 могільнікі, 14 касцёлаў, манастыроў і цэркваў.

Асноўнай рэлігіяй на тэрыторыі павета з'яўлялася уніяцтва. Царскія ўлады бачылі ў ім адну з прычын крамольнай непаслухмянасці насельніцтва, яго аглядцы на Захад. З мэтай пераарыентацыі царквы ў 1839 годзе уніяцтва было афіцыйна забаронена, прыходы і святыні перайшлі ў падпарадкаванне маскоўскай патрыярхіі.

На змену нядаўняй паланізацыі, таксама з прымяненнем палітычных і рэлігійных уздзеянняў, у краі ішла гвалтоўная русіфікацыя. Указам ад 18 чэрвеня 1840 года імператар Мікалай I забараніў ужыванне назвы «Беларусь», а замест яе ўводзіўся афіцыйны тэрмін «Северо-Западный край», дзейнасць Статута Вялікага княства Літоўскага на тэрыторыі Беларусі адмянялася і замест «павета» належала ўжываць рускі тэрмін «уезд». Мясцовыя традыцыі і здабыткі культуры скрозь замяняліся расійскімі. Афіцыйнай мовай ва ўсіх установах абвяшчалася толькі руская. Адначасова вёўся наступ на яшчэ моцны ўплыў каталіцызму і паланізацыю. У пачатку 40-ых гадоў пад праваслаўны сабор (адзіны ў Слоніме) быў перададзены паўразбураны і апусцелы колішні касцёл канонікаў лютэранскіх, які на працягу некалькіх гадоў перабудоўваўся з дапамогай мясцовых уладаў. У 1845 годзе разбурылі мураваны касцёл св. Міхала ў цэнтры горада (на сучаснай плошчы Леніна), у 1848 годзе нечакана згарэла адзіная ў Слоніме драўляная уніяцкая царква, у 1850 годзе знішчылі касцёл і кляштар мар'явітак, а ў 1864 годзе касцёл бернардзінцаў зрабілі праваслаўнай царквой св. Тройцы. У горадзе ліквідаваліся польскія школы, а замест іх адчыняліся рускія. Больш жорсткімі сталі і праследаванні за іншадумства.

Агульнадзяржаўны эканамічны крызіс, які паступова нарастаў, адбіўся і на прамысловасці Слонімшчыны. Калі ў 30-ых і пачатку 40-ых гадоў назіралася яе паскоранае развіццё, то ў сярэдзіне стагоддзя пачаўся прыкметны спад. Аднак яшчэ ў 1847 годзе ў горадзе і ўездзе дзейнічалі 7 суконных фабрык, 1 фабрыка дываноў, 1 палатняная, 4 па вырабу паперы, 2 медныя заводы, бровары, млыны,

гарбарні і шэраг іншых малых прадпраемстваў і майстэрняў, на якіх працавала па некалькі чалавек. Пры гэтым на пераважнай большасці прадпрыемстваў выкарыстоўваліся вадзяныя рухавікі.

Дэмаграфічны склад насельніцтва Слоніма, паводле даных Г. Гольдберга на 1846 год, выглядаў так: іудзеяў (яўрэяў) налічвалася 4983 чалавекі, каталікаў (беларусаў і палякаў) — 787, праваслаўных — 374, магаметан (татараў) — 170, лютэран і іншых — 89.

На фабрыках, заводах і ў майстэрнях горада працавала прыблізна 900 рабочых, займаліся сельскай гаспадаркай каля 320 чалавек і каля 500 жыхароў саматужна рамеснічалі. Многія (у асноўным яўрэі) вялі гандаль. Умовы жыцця былі далёка не аднолькавыя, аднак мяшчане адчувалі сябе некалькі вальней, чым казённыя сяляне, а тым больш прыгонная сялянская большасць. Гэтаму ў пэўнай ступені садзейнічаў Указ Сената ад 30 снежня 1841 года аб ільготах купцам і мяшчанам заходніх губерняў, чым урад заахвочваў хрысціян канкурыраваць у развіцці гандлю і прамысловасці з яўрэйскімі прадпрымальнікамі. І ўсё ж і гандаль, і прамысловасць Слоніма заставаліся ў руках яўрэйскага насельніцтва, якое кантралявала ўсю эканоміку горада.

У 50-ыя гады крызіс, звязаны з адсталай феадальна-прыгоннай сістэмай, што панавала ва ўсёй Расійскай імперыі, ужо патрабаваў неадкладных рэформаў, прытым грунтоўных. За гэта ў сярэдзіне XIX стагоддзя выказалася большасць дваран Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў, яны патрабавалі адмены прыгоннага права. Уладанні іх у значнай ступені былі ўцягнуты ў сферу таварна-грашовых адносін, і паншчына станавілася эканамічна нявыгаднай. Аднак яны жадалі вызваліць сялян без зямельных надзелаў. Пачынаючы з 1857 года вялася шырокая падрыхтоўка да зямельнай рэформы, у якой заходнія губерні прымалі найбольш актыўны ўдзел. Сялянскі ж рух прыспешваў той працэс.

Але прыняты ў лютым 1861 года закон аб адмене прыгону не даў крайне збяднелым сялянам чаканай волі, і гэта выклікала шырокую хвалю незадаволенасці і бунтаў. Ускладнялася ўсё яшчэ і свавольствамі мясцовых улад. Адчуваючы сябе абманутымі, сяляне цэлымі вёскамі адмаўляліся выконваць павіннасці. На Слонімшчыне з самай вясны 1861 года такія хваляванні мелі месца ў маёнтках памешчыкаў Слізеня, Калупайлавай, Корсакавых, Стравінскага, Канопкі, Галаўні, Грыневіча. У дакументах згадваюцца вёскі Дзявяткавічы, Сяркі, Сучкі,

Акунінава, Прыопль, Трыбушкі, Падлессе, Шыганы, Махначы, Забулле і інш.

Для «навядзення парадку» ў маёнткі пасылаліся вайсковыя роты, якімі камандаваў палкоўнік корпуса жандараў Прасолаў. Непакорных прылюдна збівалі розгамі і ўсё ж змушалі да падпарадкавання царом «дараванай волі».

Адмена прыгоннага права абумовіла неабходнасць і іншых рэформаў, у тым ліку дзяржаўнага ладу. Капіталістычнае развіццё краіны — на гэты шлях Расія стала ў другой палове XIX стагоддзя.— патрабавала значных пераўтварэнняў як у галіне кіравання, так і ў эканоміцы. Асабліва востра ставіліся тыя пытанні на заходнім парубежжы імперыі, дзе да сацыяльных праблем прымыкалі і нацыянальныя. Сялянскі рух паступова набываў палітычную афарбоўку, у яго ўключалася прагрэсіўная, патрыятычна настроеная інтэлігенцыя, дваранства і нават частка мяшчан. Пад уздзеяннем нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы шырыўся бунтарны настрой і ў «Северо-Западном крае». У жніўні 1861 года ўпраўляючы справамі Міністэрства ўнутраных спраў Валуеў накіраваў гродзенскаму гебернатару «Указанні аб мерах барацьбы з хваляваннямі ў краі». А ў верасні таго ж года віленскі генерал-губернатар увёў ваеннае становішча ў Вільні, Гродне, Беластоку, Бельску, Брэсце і ўездах.

У 1862 годзе ў Слоніме ў павятовай публічнай бібліятэцы пачала гуртавацца найбольш актыўная і прагрэсіўная частка інтэлігенцыі, дваранства і мяшчан. Тут наладжваліся таемныя сустрэчы, сходы, арганізоўвалася мясцовае патрыятычнае падполле, скіраванае на барацьбу з самадзяржаўем. Сярод найбольш актыўных членаў падполля дакументы згадваюць Я. Валовіча, Э. Корсака, І. Герубовіча, К. Гнаінскага, К. Пілецкага, В. Валовіча, Ю. і Е. Пратасевічаў, В. Міўгера, І. Лукашэвіча, У., В. і Г. Палубінскіх, Я. Гарбоўскага, Ф. Мікульскага, П. Орду, Э. Рагозу, Ф. Волбэка, Л. і А. Чэчатаў, А. і Э. Керсноўскіх, А. Незабытоўскага, С. Ліпскага, В. і І. Юндзілаў, І. Пякарскага, К. Мацкевіча, У. Сімановіча і інш. У жніўні 1862 года на Слонімшчыне пабываў Кастусь Каліноўскі, арганізатар і кіраўнік будучага паўстання. Слонімскі прыстаў даносіў гродзенскаму губернатару: «7 кастрычніка ў 5 гадзін вечара адзін з пасажыраў, якія праязджалі па тракце праз в. Шнейка, выкідваў скруткі папер на дарогу... Сяляне, падымаючы, звярталіся да пісьменных сваіх сабратоў, каб прачытаць. Вышэйназваны пасажыр... быў росту сярэдняга, брунет, вусоў чорных, год каля 36 ...нехта дваранін Вікенцій Каліноўскі». Тыя скруткі паперы былі газетай «Мужыцкая праўда».

Па краі несліся чуткі аб хуткім паўстанні, гучалі заклікі да бунту. І ў Слонімскім павеце таемна ствараліся падпольныя групы, збіралася зброя, порах, свінец, шырылася агітацыя за непадпарадкаванне ўладам. Разрозненыя суполкі кансалідаваліся, арганізацыйна афармляліся, размяркоўвалі абавязкі. Цывільным начальнікам Слонімскага павета абралі доктара Уладзіслава Сімановіча, вайсковым — Францішка Юндзіла, камандзірам паўстанцкага атрада — маладога памешчыка Ізідара Лукашэвіча. Вербаваў людзей у паўстанцкі атрад і забяспечваў іх зброяй і вайсковым рыштункам адстаўны ротмістр, засядацель Слонімскага павятовага суда Леў Чарняўскі. Збіралі харчаванне, боепрыпасы і вопратку Эдуард Керсноўскі і дваранін Гудовіч. Цывільным начальнікам горада стаў доктар Валяр'ян Вільчэўскі. Пасля арышту У. Сімановіча ў маі 1863 года К. Каліноўскі назначыў начальнікам Слонімскага павета памешчыка Іосіфа Стравінскага.

Слонімшчына станавілася адным з актыўнейшых асяродкаў паўстання. Сялянскі рух у краі набываў шырокі размах. З ваколіц адной толькі вёскі Плаўскія да паўстанцаў прыбылі 62 добра ўзброеныя «ахвотнікі». К. Каліноўскі канцэнтраваў у лясах каля вёскі Мілавіды (цяпер Баранавіцкі раён) значныя сілы. Тут было згрупавана каля тысячы паўстанцаў пад агульным камандаваннем падпалкоўніка Ляндэра (Аляксандра Лянкевіча). У лагеры каля Мілавідаў акрамя аб'яднанага слонімскага атрада на чале з Францішкам Юндзілам (да 300 чалавек) размяшчаўся наваградскі атрад В. Міладоўскага, ваўкавыскі — Млотака і пружанскі — Владэка (псеўданімы). 20 мая сюды наведаўся К. Каліноўскі ў суправаджэнні В. Урублеўскага. А 21 мая (2 чэрвеня) здарылася бітва пад Мілавідамі — адна з важнейшых у паўстанні, у якой супраць паўстанцаў выступілі тры роты Старайнгерманландскага палка, расквартаванага ў Слоніме, артылерыя і казакі. Камандаваў карнай аперацыяй палкоўнік А. Чартоў. Бітву паўстанцы выйгралі. На полі бою засталіся дзесяткі забітых і параненых салдат царскай арміі. Але галоўнае заключалася ў тым, што паўстанцы атрымалі маральную перамогу.

Аднак процістаяць рэгулярным войскам слаба ўзброены атрад не змог. Карныя аперацыі і аблавы адна за другой пракаціваліся па краі, прыносячы ўсё горшыя весткі для мясцовага насельніцтва. Сюды для пакарання і застрашвання гналі тых, хто прагнуў волі сабе і народу, тых, хто кінуў свой лёс на алтар змагання з чужацкай няволяй. Горад, як падстрэленая птушка, замірaў у трывозе пры кожнай такой расправе. Катавалі ж і нішчылі лепшых



Карта бітваў і сутычак паўстанцаў 1863—1864 гг.
з царскімі войскамі

сыноў. Бясконцыя канвоі ў казематы Расіі, у Сібір сталі жалобным вынікам светлых мараў народа і яго герояў.

Паўстанне ішло на спад, і ў 1864 годзе было задушана канчаткова. Вялікія людскія і матэрыяльныя страты панесла Слонімшчына. Імёны многіх герояў засталіся невядомымі.

Паводле царскага ўказу 1863 года, маёнткі, рухомая маёмасць і капіталы асоб, якія мелі дачыненне да «бунту», падлягалі секвестру. Пасля задушэння паўстання царскі ўрад пачаў яшчэ больш жорстка выкарчоўваць усе праявы нацыянальнай свядомасці, нацыянальнай годнасці. Узмацнілася русіфікацыя. Паўсюдна праводзілася замена службовых асоб, насаджваліся расійскія чыноўнікі, устанаўліваўся палітычны нагляд і заахвочваліся даносы.

І ўсё ж дзе-нідзе ды ўспыхвалі асобныя агеньчыкі народнага гневу; выказваючы незадаволенасць сельскай рэформай і жорсткай эксплуатацыяй, бунтавалі сяляне, уздымалі свой голас рабочыя. У красавіку — маі 1876 года на суконнай фабрыцы Пуслоўскага ў Альберціне ў хваляваннях удзельнічала 400 рабочых, што патрабавалі паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча. Асабліва шмат нязгоды выклікалі зямельныя перадзелы. Памешчыкі імкнуліся захаваць за сабой як мага большыя правы і па традыцыі ўладна чынілі самавольствы, сяляне ж баранілі свае інтарэсы. Так, жыхары вёскі Чамяры летам 1887 года выступілі супраць дзеянняў графа Патоцкага, які хацеў адмежаваць «спрэчныя» землі, і арганізавана адстаялі сваё права.

Тым не менш другая палова XIX стагоддзя адзначана ў Слоніме ростам прамысловай вытворчасці, гандлю і павелічэннем колькасці насельніцтва. Калі, напрыклад, у 1867 годзе ў горадзе налічвалася 10 166 жыхароў, то ў 1878 годзе іх агульная колькасць ужо дасягнула 15 351 чалавека, у тым ліку мужчын — 7835 і жанчын — 7516. Тады ў Слоніме мелася 1046 дамоў, у тым ліку 98 мураваных.

У 1878 годзе рашэннем царскага ўрада ў гарадах заходніх губерняў было рэарганізавана гарадское самакіраванне, якое традыцыйна захоўвалася тут з часоў надання магдэбургскага права. Цяпер найвышэйшым органам улады ў Слоніме стала гарадская дума, у якую ўваходзілі 24 гласныя (радныя). Яны са свайго складу выбіралі гарадскую ўправу (магістрат) на чале з гарадскім галавой. Дзейнасць управы была малаэфектыўнай на фоне эканамічнага і палітычнага жыцця горада. Толькі ў канцы стагоддзя ў сувязі з развіццём капіталістычных адносін ва ўсіх галінах вытворчасці яна пачала набываць больш



Карта Слонімскага павета. 1870 г.

уладны характар. Управа стала распараджацца значнымі фінансавымі сродкамі, уплываць на планавае і агульнае развіццё горада.

У густазабудаваным і ў асноўным драўляным Слоніме нярэдкай з'явай былі пажары. Але той, які ўспыхнуў 25 мая 1881 года, прычыніў гораду і яго жыхарам страшэнныя страты — вынішчыў цэлыя кварталы. За адзін дзень згарэлі вуліцы Ружанская, Жыровіцкая, Школьны Двор, Гандлёвая, Уланская, Маставая, Бернардынская, Студэнцкая, Замкавая, Рыбацкая, Татарская. У агні загінула 576 дамоў, шмат складоў і розных іншых збудаванняў, архіў гарадской управы, кнігі запісаў, ухвал і дакументаў яўрэйскай гміны за 400 гадоў і інш.

Пасля таго пажару цэнтр Слоніма часткова перапланавалі, расшырылі вуліцы. Забудова вялася больш упарадкавана, што сфарміравала новы выгляд старога горада. Узніклі новыя прадпрыемствы, якія забяспечвалі матэрыяламі шырокае будаўніцтва, рыхтаваліся кадры — яны актыўна выкарыстоўваліся і ў пазнейшы час.

«Слоўнік геаграфічны», выдадзены ў 1889 годзе, паведамляе, што ў 1878 годзе ў Слонімскім павеце жылі без гарадскога насельніцтва 145 764 жыхары (70 999 мужчын і 74 765 жанчын), прытым праваслаўных было 109 432, католікаў (часткова з уніятамі) — 19 358, пратэстантаў — 59, іудзеяў — 16 870 і магаметанаў — 45 чалавек. Шляхецкі тытул мелі 1269 чалавек, праваслаўных духоўных асоб (з сем'ямі) налічвалася 342, каталіцкіх — 5, іудзейскіх — 22, ваенных — 5831 чалавек. У павеце дзейнічалі 36 праваслаўных мураваных і 37 драўляных цэркваў, 1 мураваны манастыр, 6 мураваных і 11 драўляных капліц. Каталіцкіх касцёлаў было 4 мураваныя і 1 драўляны, 7 капліц мураваных і 3 драўляныя.

У 1890 годзе гарадская ўправа разбіла пры былой вуліцы Раманаўскай гарадскі парк, а побач вырас яе новы цагляны двухпавярховы будынак.

У 1896 годзе багаты слонімскі прадпрымальнік Г. Куніца праклаў адзін з першых у губерні натуральных гарадскіх водаправодаў. А перад тым на рацэ Ісе ў Альберціне В. Пуслоўскі пусціў першую ў краі гідраэлектрастанцыю. У 1897 годзе ў горадзе створана добраахвотная пажарная каманда.

Канец XIX і пачатак XX стагоддзя ў гісторыі Слоніма адзначаны размахам будаўнічых работ, прычым пасля пажару 1881 года значная частка пабудоў стала ўзводзіцца з цэглы. Для прыкладу, у 1901 годзе ў горадзе ўжо меліся 872 мураваныя дамы, у тым ліку 413 жылых (з агульнай колькасці 1607). Акрамя шматлікіх прыватных камяніц на



Тунель XIX ст. (неўстаноўленага прызначэння), раскапаны ў Слоніме ў 1970 г.

тэрыторыі колішняга прадмесця Скробава ў 1901—1903 гадах з'явіўся вялікі комплекс шматпавярховых вайсковых казармаў. Закладвалася нямала прамысловых прадпрыемстваў і майстэрняў. Большасць з 35 гарадскіх вуліц была забрукавана, цэнтральныя нават асвятляліся газавымі лямпамі. Колькасць насельніцтва Слоніма рэзка ўзрасла і дасягнула 20 906 жыхароў.

Неабходна адзначыць, што ў той жа час у горадзе працавалі толькі адно-двухкласнае павятовае вучылішча, прыходскае вучылішча з жаночым аддзяленнем, пачатковае яўрэйскае вучылішча і прыватны трохкласны жаночы пансіён. У 1891 годзе горад абслугоўвалі 1 гарадскі, 1 павятовы, 2 вайсковыя і 4 вольнапрактыкуючыя дактары і некалькі фельчароў.

Значная канцэнтрацыя рабочых на прадпрыемствах Слоніма, цяжкія ўмовы жыцця і працы змушалі іх аб'ядноўвацца ў барацьбе за паляпшэнне свайго становішча. Памочнік начальніка Гродзенскага жандарскага ўпраўлення 7 чэрвеня 1896 года пісаў у данясенні губернатару, што рабочыя вялікімі масамі робяць сходкі ў лесе, дзе абмяркоўваюць свае набалелыя пытанні, і ў іх ёсць прысланыя з-за мяжы кніжкі аб стачках. Гэта была рэакцыя ўлад на забастоўку, аб'яўленую 31 мая 1896 года рабочымі сталярных майстэрняў горада.

У 1897 годзе ў Слоніме ўжо дзейнічалі таемныя рабочыя гурткі. Яны імкнуліся забастоўкамі і стачкамі прымусіць гаспадароў фабрык і майстэрняў ісці на ўступкі: паляпшаць умовы працы, павялічваць заработкі.

У 1903—1904 гадах у горадзе ўзнікла групка арганізацыі РСДРП, якая ўваходзіла ў Паўночна-Заходні камітэт РСДРП. Намаганнямі яе членаў у 1904 годзе была створана падпольная друкарня, што месцілася ў сутарэннях дома па вуліцы Маскоўскай (цяпер Чырвонаармейская). Тут выпускаліся лістоўкі, якія распаўсюджваліся сярод рабочых і сялян Слонімшчыны, а таксама сярод салдат слонімскага гарнізона.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905—1907 гадоў адгукнуліся ў краі забастоўкамі, мітынгамі, стачкамі рабочых. У падпольнай друкарні ў лютым 1905 года выйшла пракламацыя «Да ўсіх запасных у г. Слоніме», якая заклікала салдат выступіць супраць імперыялістычнай вайны, далучыцца да рэвалюцыйна настроенага народа. У гады рэакцыі слонімская арганізацыя РСДРП была разгромлена.

Газета «Вперед» (выдавалася ў Жэневе) у нумары ад 23 лютага 1905 года паведамляла, што 800 рабочых Слонімшчыны ў знак салідарнасці з рабочымі Пецярбурга арганізавалі забастоўку. Пяцьдзесят найбольш актыўных з іх былі арыштаваны. 18 мая 1905 года страйкавалі 200 рабочых запалкавай фабрыкі Дубінбаўма. Да іх далучыліся і 120 рабочых тартака. Яны патрабавалі скарачэння працоўнага дня да 10 гадзін і павелічэння заработку на 20—30 працэнтаў.

У Слоніме ў той час дзейнічалі 29 прадпрыемстваў, у тым ліку 4 тартакі, 2 паравыя млыны, 2 фабрыкі хустак, 2 вялікія і 5 меншых гарбарняў, 3 фабрыкі фіранак, 2 фабрыкі цвікоў, 2 фабрыкі дражджэй, 2 вялікія цагельні, фабрыка машын і сельскагаспадарчага інвентару, 2 фабрыкі запалак, фабрыкі пергаміну і мыла. На гэтых прадпрыемствах працавала каля 4 тысяч рабочых.

У асяроддзі мясцовай інтэлігенцыі прыкметна абуджалася нацыянальная самасвядомасць, на пярэдні план палітычнага жыцця выходзілі вызваленчыя ідэі. У край пранікала друкаванае беларускае слова, і яно рабіла добрую справу абуджэння нацыі. Пасля 1910 года рэвалюцыйны рух на Слонімшчыне некалькі актывізаваўся, але набыць належны размах не дала ваенная кампанія.

Перад вайной Слонім налічваў ужо 23 тысячы жыхароў і быў даволі буйным прамысловым цэнтрам краю. Гандлёвыя сувязі яго выходзілі далёка за межы губерні і нават Беларусі. У горадзе дзейнічалі некалькі прыватных банкаў, філіял руска-французскага гандлёвага банка, некалькі невялікіх бібліятэк, народны дом і інш.

19 ліпеня (1 жніўня) 1914 года пачалася Руска-германская вайна. 20 ліпеня Слонімскі павет быў аб'яўлены на ваенным становішчы, у горадзе і вёсках катэгарычна забараняліся ўсякія сходы, выступленні, няўрадавыя ме-

рапрыемствы. Паліцыі даваліся правы падаўляць любыя хваляванні і беспарадкі.

Падзеі на фронце складваліся не на карысць Расіі, і ў хуткім часе Слонім стаў прыфрантавым горадам. Тысячы бежанцаў бясконцым патокам пацягнуліся на ўсход. Прамысловыя прадпрыемствы горада зачыняліся, многія вывозіліся разам з рабочымі ў глыб краіны. Горад і многія вёскі хутка пусцелі.

26 жніўня фронт дакаціўся да Слоніма. Над Шчарай разгарэлася жорсткая бітва, горад быў ахоплены полымем. Цэлых 4 дні грымелі ўзрывы, рушыліся будынкі. Рака дзяліла дзве варожыя арміі. Асабліва пацярпела Замосце (правабярэжная частка Слоніма) і цэнтр. Нешматлікае цывільнае насельніцтва ратавалася ў склепах і ямах, многія загінулі.

3 верасня горад занялі немцы. Пачалася працяглая акупацыя, якая доўжылася амаль 40 месяцаў і суправаджалася гвалтоўнымі рэквізіцыямі, мабілізацыямі ў рабочыя батальёны, расправамі ваенных улад над безабароннымі людзьмі. Гандаль прадуктамі харчавання не дазваляўся, усё выяўленае канфіскоўвала армія. Гараджане мусілі галадаць або апрацоўваць зямлю, трымаць жывёлу. Слонім, дзе засталося 9 тысяч жыхароў, нагадваў вялікую паўразбураную вёску, якая вярталася да прымітыўнай сельскай гаспадаркі і саматужных промыслаў. Цывільныя гарадскія ўлады, надзеленыя нейкімі правамі, фактычна адсутнічалі. Гаспадарыла ва ўсім ваенная камендатура.

Жыццё нібы замерла на тэрыторыі ўсяго павета. У вёсках хаты стаялі з забітымі вокнамі, рэдкія сяляне апрацоўвалі толькі нязначную плошчу зямлі і ледзь пракормлівалі сябе. Не кранутыя плугам вялікія абшары палёў зарасталі хмызняком. А насельніцтва, пакінуўшы родныя куты, тулялася бежанцамі па розных губернях Цэнтральнай Расіі і Сібіры, просячы спагады і ласкі ў чужых людзей. Акупанты ж вырубалі лясы і вывозілі ў Нямеччыну ўсё, што ўяўляла каштоўнасць і што можна было вывезці. Рабілася гэта паспешліва і гвалтоўна, бо стала відавочным, што прыйдзецца адступаць.

Незадоўга да адступлення немцаў пры пажары згарэлі ўцалелыя ад вайны слонімскія вуліцы Бэрка Ясялевіча (часткова), Андрэеўская, Падгорная, Жыровіцкая, Школьны Двор (часткова) і добры кавалак Ружанскай.

Яшчэ цяжка ўгадваўся будучы лёс краю, але на добрае надзей было мала. Руіны і запусценне чакалі працавітых людскіх рук. А на палітычным гарызонце ружавела зарыва новых, рэвалюцыйных пажараў.

ЖЫРОВІЦКАЯ СВЯТЫНЯ

Беларусы з даўніх часоў мелі свае святыя мясціны, прытулкі веры і надзей, куды сцякаўся абдзелены доляй люд, шукаючы душэўнай літасці і ўцехі. Адным з найбольш славутых такіх куткоў былі Жыровічы (Жырава) з шырокавядомым манастыром і цудатворным абразом Маці Божай Жыровіцкай, высечаным на невялічкай каменнай плітцы.


Паводле легенды, абразок той прыблізна ў 1470 годзе знайшлі пастушкі на лясной грушы. Здзіўленыя і напалоханыя яго праменным зззяннем, дзеці паведамілі аб усім мясцоваму памешчыку, які на тым святым месцы збудаваў невялікую драўляную цэркаўку і змясціў у ёй яўлены абразок. Калі ж здарыўся пажар і цэркаўка згарэла, дзіўны абразок аб'явіўся на камені побач з крыніцай. На тым месцы ўзвялі новы храм. Там зараз узвышаецца Яўленская царква, вымураваная ў 1672 годзе.

Усе згаданыя падзеі звязваюцца з імем Солтана Аляксандравіча. Ён і лічыцца заснавальнікам існуючай да нашых дзён праваслаўнай Жыровіцкай святыні, што і цяпер прыцягвае шматлікіх вернікаў. Слыннай была яна не толькі на Беларусі, але і ў Літве, Польшчы, на Украіне. На святочныя службы ў Жыровічы прыязджалі многія знакамітыя вяльможы Рэчы Паспалітай і нават каралі. Так, у 1644 годзе тут на багамоллі прысутнічаў кароль Уладзіслаў IV з жонкай, у 1651-ым — кароль Ян Казімір, у 1684-ым — Ян III Сабескі з каралевічам Якубам, у 1744-ым — Аўгуст III, у 1784 годзе — Станіслаў Аўгуст Панятоўскі і інш. Амаль усе з магнатаў і манархаў, хто наведваў святыню, ахвяроўвалі ёй немалыя сродкі ці надзялялі прывілеямі. Гэта рабіла царкву багатай і яшчэ больш славутай.

Найбольшай вядомасці дасягнулі Жыровічы ў XVII—XVIII стагоддзях. З тым перыядам звязана тут і найбольш інтэнсіўнае царкоўнае і манастырскае будаўніцтва.

Цяперашняя вёска Жыровічы з комплексам старых камяніц-помнікаў размешчана за 10 кіламетраў на поўдзень ад Слоніма пры так званым Быценьскім тракце, на невысокіх пагорках, што прымыкаюць да шырокага поплаву левабярэжжа ракі Шчары. З поўдня, захаду і поўначы вёску акружаюць пясчаныя ўзвышшы, парослыя лесам. Тут нямала цудоўных чысцюткіх крыніц, з якіх бярэ пачатак невялічкі прыток Шчары Іярданка.

Археалагічныя абследаванні ваколіц (праведзены аўтарам) сведчаць аб тым, што ў раннефеадальны перыяд у межах сучасных Жыровічаў існавала некалькі невялічкіх



Першы ліст апісання гісторыі заснавання Жыровіцкага манастыра, прадстаўленага па запыту гродзенскаму губернатару ў 1841 г.



Ікона Маці Божай Жыровіцкай з выявай святых апосталаў Пятра і Паўла. *Гравюра Л. Тарасевіча, 1682 г.*

паселішчаў, а на тэрыторыі самога манастыра, дзе цяпер узведзена Крыжаўзвіжанская царква,— умацаванае гарадзішча з ровам і валам. Паводле пісьмовых крыніц, дзесьці ў палове XV стагоддзя ваколіцы Жыровічаў належалі нейкім Гайцэвічам, а пасля смерці апошняга наследніка адышлі ва ўласнасць вялікага князя. Той сваёй граматай ад 20 сакавіка 1493 года падараваў памесце ў спадчыну ўжо вядомаму тады рэлігійнаму і дзяржаўнаму дзеячу Солтану, месцам жыхарства якога ў асноўным былі Жыровічы і Вільня. Валодаў жа Солтан Аляксандравіч і дварамі Вербскім, Шэшкінскім, Волчынам, Нясвіжскім, фальваркамі Руднікі і Юрцаў. Згодна з воляй караля і вялікага князя літоўскага Казіміра, у 1468 годзе ён наведаў Італію і Рым, у 1469-ым — Англію, затым аб'ехаў усю Еўропу, паломнічаў у Іерусалім. Меў тытулы рыцара труны Божай, носьбіта Залатога стрыха, падскарбія каралеўскага, маршалка Вялікага княства Літоўскага. Займаў пасады намесніка слонімскага (верагодна, з 1483), наваградскага (з 1486), бельскага (з 1494). Памёр Солтан Аляксандравіч недзе ў другой палове 1494 года. Намеснікам слонімскім тады ўжо быў яго блізкі родзіч Літавор Храбтовіч, які з'яўляўся і апекуном малалетняга сына Солтана — Аляксандра.

З 1495 года Жыровічы і маёнтак, куды ўваходзілі вёскі Вержбалаты, Літва, Заверша, Станева, Русакова, Залессе, Акунін і Сколдычы, належалі Аляксандру Солтанавічу, з 1516 года — «гаспадарскаму маршалку». Пасля смерці Аляксандра Солтанавіча ў 1555 годзе Жыровічы адышлі да яго сына Івана, які побач з існаваўшай ужо царквой распачаў будаўніцтва вялікага мураванага храма. Аднак будынак той не быў закончаны нібы з-за прыняцця гаспадаром пратэстанцтва. З таго часу імя Солтан стала прозвішчам роду Солтанаў.

Як паведамляецца ў «Актах Віленскай археаграфічнай камісіі», «у року сем 1565-м, месеца сентебра осмого дня, в суботу... на день нароженья Панны Марии» ў Жыровічах праходзіў кірмаш. Гэта дае падставы меркаваць, што ў паселішчы існавала менавіта Багародзіцкая царква, інакш кірмашы не прысвячаліся б згаданаму святу. І, зразумела, царква ўвесь час звязвалася з абразом Маці Божай Жыровіцкай. Аднак і цэрквы, і даходы ад іх з'яўляліся ўласнасцю памешчыка і поўнасцю залежалі ад гаспадара.

Пасля смерці Івана Аляксандравіча Солтана ўся маёмасць была раздзелена паміж чатырма яго сынамі: Давыдам, Яраславам, Іванам і Аляксандрам. Жыровіцкі маёнтак дастаўся Давыду і Яраславу. У 1587 годзе Яраслаў прадаў сваю частку Жыровічаў (сюды ўвайшлі і вёскі

Літва, Залессе, Заверша, Русакова, Сценявічы) з «палавіцаю» манастыра брату Івану за 5 тысяч коп грошай. У 1603 годзе новы гаспадар здаў маёнтак на чатыры гады ў арэнду яўрэю Іцхаку Міхелевічу з горада Хомска. Гэта быў вельмі складаны і цяжкі перыяд у гісторыі святой мясціны. Многія манахі адказаліся падпарадкоўвацца часоваму ўладару і пакінулі манастыр. Арандаваныя вёскі з дазволу Міхелевіча наваднялі гандлярамі-яўрэямі, што прыбывалі з розных куткоў краю. Яны скуплялі ў насельніцтва курэй, мёд, жывёлу і розную сельскагаспадарчую прадукцыю, адкрывалі корчмы, крамы, бровары, спойваючы і ашукваючы мясцовых жыхароў. Верагодна, яўрэі і занеслі страшную моравую хваробу, якая вынішчыла амаль палову насельніцтва, прынёсшы гаспадарцы вялікія страты. Раззлаваны Іван Солтан 6 студзеня 1605 года забіў Міхелевіча і пакалечыў некалькі яго родзічаў. Слонімскі суд сваім рашэннем пазбавіў Солтана правоў на Жыровіцкі маёнтак, які, згодна з судовай пастановай, перадаваўся ў карыстанне жонцы забітага арандатара — Эсцеры.

У 1606 годзе мсціслаўскі кашталян Іван Мялешка адкупіў у Эсцеры Міхелевіч Жыровічы з усёй маёмасцю і людзьмі, а таксама манастыр з царквою, даходам ад яе і манастырскім фальваркам. Будучы ўжо актыўным прыхільнікам уніі, ён угаварыў мясцовага свяшчэнніка Рыгора Сулу 25 ліпеня 1609 года падпісаць абавязацельства падпарадкоўвацца уніяцкаму мітрапаліту Поцію. З гэтага часу Жыровіцкі праваслаўны манастыр далучыўся да царкоўнай уніі, заключанай у Бярэсці ў 1596 годзе. Першымі уніяцкімі настаяцелямі ў ім былі: з 1613 да 1614 года — Іясафат Кунцэвіч (затым пераведзены ў Вільню і Полацк; забіты ў 1623 годзе ў Віцебску), яго замяшчаў да 1623 года ігумен Феакціст, з 1623 года — ігумен Ян Дубовіч. Жыровічы тады ўжо з'яўляліся прыгожым і вядомым у наваколлі мястэчкам, дзе акрамя цэркваў і манастырскіх будынкаў высіліся шыкоўныя мураваныя дваровыя збудаванні, крамы, карчма. Два разы на год тут ладзіліся ажыўленыя кірмашы. Праз мястэчка праходзіў важны гандлёвы шлях са Слоніма ў Быцень, Пінск — частка інтэнсіўнай транспартнай артэрыі, што злучала Прыбалтыку з гандлёвым Поўднем.

У 1613 годзе Іван Мялешка граматай, дадзенай уніяцкаму мітрапаліту Руцкаму і настаяцелю Жыровіцкага манастыра Іясафату Кунцэвічу, навечна ахвяраваў манастыр з цэрквамі і маёнткам уніяцкаму ордэну базыльянаў. Такім чынам, манастыр поўнасцю выйшаў з-пад улады памешчыкаў. Пры Мялешку (недзе прыблізна ў 1616 годзе) завяршылася ўзвядзенне галоўнага храма — Успенскага

сабора, распачатае яшчэ Іванам Солтанам. Праўда, памеры, планіроўка і афармленне збудавання некалькі змяніліся. Перад смерцю (у 1622 г.) Іван Мялешка падараваў манастыру і мястэчка Жыровічы з навакольнымі землямі, лясным масівам Вікня, вёскай Агароднікі (цяпер Стайкі) і некаторымі дваровымі будынкамі.

Недзе раней узнікла мураваная аднавежавая царква (з вінтавой лесвіцай на званіцу), што размяшчалася побач з сучаснай Яўленскай. Верагодна, гэта і быў ўжо згаданы Багародзіцкі храм, сцены і часткова вежа якога захаваліся да нашых дзён ва ўсходнім канцы колішняга жылога манастырскага корпуса.

Немалы ўдзел у будаўніцтве і пашырэнні славы святыні прымаў слонімскі староста, канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега. Толькі адным уласнаручным запісам у напрастольным саборным Евангеллі (Жыровіцкім, або Сапежанскім), зробленым 22 жніўня 1616 года пры асвячэнні сабора, ён ахвяраваў манастыру вялікую частку свайго Шылавіцкага маёнтка на левым беразе Шчары, карчму з прылягаючымі землямі, багатую царкоўную рызу, поручы, епітрахілі, архірэйскую мітру і посах, срэбную чашу і дзіскас. Падобныя прынашэнні былі не адзінкавымі. Апякунства Льва Сапегі спрыяла росквіту асветніцкіх і культурных традыцый свяшчэннай мясціны. Пры манастыры існавала вялікая па тым часе бібліятэка, а таксама архіў, вёўся летапіс храма, перапісваліся рэдкія кнігі, працавала школа.

У 1647 годзе папа рымскі Інакенцій X даў індульгенцыю, у якой гаварылася аб ачышчэнні душаў памёршых ад грахоў і пазбаўленні ад пакут памянутых у Жыровіцкім манастыры ў адведзеныя дні. Дзесьці з таго часу каля сцен манастыра і ў падзямеллі сабора пачалі хаваць самых вяльможных і багатых паноў Вялікага княства Літоўскага, прытым не без адпаведных прыжыццёвых ахвяраванняў.

Яшчэ ў 1644 годзе пасля візіту ў Жыровічы караля Уладзіслава IV мястэчка атрымала права называцца горадам. А вынікам наведвання сюды караля Яна Казіміра у 1652 годзе сталася наданне мясціне магдэбургскага права.

Аднак у час самага росквіту славы святыня зазнала страшэнныя спусташэнні. У 1655 годзе казацкія атрады Багдана Хмяльніцкага, якія дзейнічалі супольна з расійскай арміяй супраць Рэчы Паспалітай, захапіўшы Слонімшчыну, ушчэнт разбурылі манастыр і перабілі многіх яе служыцеляў. Моцна пацярпела і само мястэчка-горад, асабліва багацейшыя двары. Немалыя страты панесла наогул культурная спадчына краю. У «барацьбе за веру» знішчалася ўсё прапольскае і пракаталіцкае, а часам без

разбору і помнікі архітэктуры, мастацтва, культуры і гісторыі. У агні помсты гарэлі бясцэнныя каштоўнасці народа. Трэба адзначыць, што навакольнае сялянства, востра адчуваючы на сабе нікчэмнасць існавання і цяжар панскага прымусу, вітала і падтрымлівала казацкую вольнасць. У тых атрадах было нямала і выхадцаў з тутэйшых мясцін, якія, ратуючыся ад расправы ўладных паноў і судоў, беглі на поўдзень, папаўняючы казацтва.

Зруйнаваным і спустошаным пакідалі край расійскія палкі. Каб падняць з руін славуты калісьці манастыр і святыню, базыльянам спатрэбілася нямала сродкаў і часу. Аднак паступова мясціна адраджалася, дзякуючы ахвяраванням багатых вернікаў і дапамозе ордэна. Акрамя таго, сейм Рэчы Паспалітай у 1661 годзе сваім рашэннем зняў з Жыровічаў назаўсёды вайсковыя абавязкі і на чатыры гады пазбавіў падаткаў. Паралельна з аднаўленнем старых манастырскіх камяніц вялося і новае будаўніцтва. У 1672 годзе, напрыклад, была ўзведзена мураваная Яўленская царква, зноў стаў дзейнічаць манастыр.

Як сведчыць даследчык гісторыі царквы М. Чыстовіч, у другой палове XVII стагоддзя ў манстыры існавала друкарня. З 1701 года тут пачала працаваць філасофская школа на 300 навучэнцаў. Паступова вярталася і былая слава святыні, яе яўленай іконы.

Новым страшным няшчасцем для Жыровічаў і навакольля стаў мор 1710 года, што вынішчыў значную частку яго насельніцтва. Паводле звестак, са служыцеляў культу тут у жывых застаўся толькі іераманах Мікалай Акулевіч, які адзін пахаваў каля 600 памёршых.

Але жыццё не спынялася. Святая мясціна ж у цяжкія хвіліны станавілася прытулкам надзей. Уздыму папулярнасці манастыра і мястэчка спрыяла цырымонія каранацыі цудатворнай Жыровіцкай іконы. У 1726 годзе пастановай папскага капітула было вырашана «ўзлажыць на галовы Богадзіцяці Ісуса і Багародзіцы Дзевы ў г. Жыровіцах у храме айцоў ордэна св. Васілія Кіеўскага дзіацэза залатыя кароны». Каранацыя праходзіла 19 верасня 1730 года. Да святкавання рыхтаваліся загадзя, урачыстасці шырока рэкламаваліся. У гэтым прымалі ўдзел не толькі рэлігійныя службы, але і ўлады. З тае нагоды ў межах мястэчка пры падыходах да сабора з боку Слоніма збудавалі сем велічных трыумфальных брамаў амаль праз сто метраў адна ад адной. Першая ўзводзілася на сродкі базыльянскага ордэна і Слонімскага павета, другая — на сродкі каранатара (ад імя папы рымскага Бенедыкта XIII каранавалі ікону уніяцкі мітрапаліт Афанасій Шэптыцкі з епіскапам уладзімірскім Гадэбскім і епіскапам пінскім Булгаком), трэцяя — на

сродкі святейшага роду Поцieў, чацвёртая — дома Радзівілаў, пятая — дома Вішнявецкіх, шостая — Сапегаў і сёмая — на сродкі вялікага канцлера літоўскага Міхала Карыбут-Вішнявецкага. Самай шыкоўнай выглядала радзівілаўская брама. Яна мела два ярусы з хорамі для аркестра і васьмю аркамі.


Асаблівая ўвага ўдзялялася ўпрыгажэнню сабора. Нанова былі распісаны сцены і столі, абноўлены абсталяванне і царкоўная мэбля, аздоблены абразы, уваходы і фасады.

Незвычайная падзея прыцягнула ў Жыровічы многія тысячы людзей нават рознага веравызнання. Нібыта толькі прычашчалася каля 140 тысяч вернікаў. Загадзя ў мястэчка прыбыла пяхота, грэнадзёры і конніца вялікага канцлера і гетмана літоўскага Міхала Карыбут-Вішнявецкага. Сам працэс каранацыі прайшоў надзвычай урачыста, цырымонія працягвалася некалькі дзён і суправаджалася службамі ва ўсіх цэрквах.

Усе тыя святкаванні з яшчэ большай, чым раней, гучнасцю неслі па Беларусі і за яе межы вядомасць і славу аб Жыровічах і іх святой іконе, штогод прыцягваючы новыя тысячы вернікаў. Манастыр багацеў і разрастаўся, сканцэнтроўваў вакол сябе найбольш вядомыя рэлігійныя і свецкія таленты. Тут працавала агульнаадукацыйная школа накшталт гімназіі, мелася багацейшая бібліятэка, свае майстэрні.

Значны прыток сродкаў даваў магчымасць весці і шырокія будаўнічыя работы. Ужо ў першай палове XVIII стагоддзя быў збудаваны двухпавярховы мураваны жылы корпус, які ўключыў у сябе сцены разбуранай казакамі і рускімі войскамі Багародзіцкай царквы, а ў другім канцы — рэшткі так і не дабудаванага каталіцкага касцёла, што таксама стаяў разбураны. У гэтым стагоддзі ўзводзіліся велізарныя трохпавярховыя мураваныя будынкі па другі бок сабора, дзе знаходзіліся службовыя, школьныя, жылыя і іншыя памяшканні. Пазней тут размяшчалася ўпраўленне епіскапа і духоўнай семінарыі. У 1769 годзе на ўзгорку, дзе калісьці месцілася ўмацаванае сярэдневяковае гарадзішча, вырасла высокая Крыжаўзвіжанская царква-кальварыя па тыпу распаўсюджаных у той час касцёлаў. Працягваліся і рамонтна-рэстаўрацыйныя работы, добраўпарадкаванне манастыра і мястэчка.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) Жыровіцкі базыльянскі манастыр страціў былое значэнне, хоць яшчэ пэўны час заставаўся важным асяродкам рэлігійнай культуры і уніяцтва. У 1810 годзе сюды пераехала ўпраўленне брэсцкага епіскапа і Успенскі сабор стаў кафедральным. А з 1821 года распачалася яго рэканструк-



Жыровічы. Гравюра XVIII ст.

цыя з адначасовай прыбудовай цёплай, заглыбленай у зямлю царквы св. Васілія (цяпер Мікольская царква-цяпліца). Але работы з-за ўмяшання маскоўскай патрыярхіі і адсутнасці сродкаў расцягнуліся на дзесяцігоддзі. Ішла ўнутрыцаркоўная барацьба з уніяцтвам.

У 1828 годзе пры манастыры адкрылася уніяцкая духоўная семінарыя, якая па задуме мітрапаліта Іосіфа Сямашкі павінна была падрыхтаваць святароў для ліквідацыі уніі. Улады і маскоўская патрыярхія падтрымлівалі намаганні Сямашкі па спыненні засілля каталіцкага ўплыву на так званую заходнюю царкву. Актыўныя дзеянні ў гэтым напрамку вяліся ў 30-ыя гады пасля паўстанцкага руху на колішніх тэрыторыях Рэчы Паспалітай.

У тым жа годзе уніяцкі манастыр з Жыровічаў перавялі ў Быцень. 14 ліпеня 1829 года па ініцыятыве Іосіфа Сямашкі і групы святароў-уніятаў у Жыровічах быў падпісаны акт аб ліквідацыі уніі і перадачы прыналежнай ёй царквы ў падпарадкаванне маскоўскай патрыярхіі. Уніяцкая літаратура, абразы, дакументы, мастацкая разьба і скульптуры разам з іншай маёмасцю храмаў і манастыра па камандзе мітрапаліта дэманстратыўна спальваліся на пляцы перад Успенскім саборам. А ў 1845 годзе епіскапская кафедра і духоўная семінарыя пераехалі з Жыровічаў у Вільню.

Арэол надзвычайнасці, славутасці святыні паступова згасаў. Храмы пераходзілі на становішча звычайных прыходскіх цэркваў з мізэрнымі даходамі і ахвяраваннямі, што пазбаўляла магчымасці працягваць распачатую рэканструкцыю будынкаў. Да таго ж унутранае абсталяванне ці не поўнасцю загінула. Толькі ў 1867 годзе пры актыўных стараннях архімандрыта Мікалая Рэдуты завяршылася аднаўленне Успенскага сабора, належны выгляд набылі тэрыторыя манастыра, сад і асобныя гаспадарчыя будынкі, была падрамантавана званіца. Але ўсё тое ўжо не вярнула святыні колішнюю веліч і славу. Для Расійскай імперыі край гэты з'яўляўся бунтарскай калоніяй, і ўдушэнне памяці аб былым стала галоўнай задачай улад як палітычных, так і духоўных.

Аднак насуперак усяму Жыровічы заставаліся для вернікаў свяшчэнным куточкам і прыцягвалі тысячы паломнікаў, асабліва ў вялікія рэлігійныя святы і ў дзень Жыровіцкай іконы Маці Божай (7 (20) мая).

У першую сусветную вайну перад прыходам немцаў (1915) амаль ўсё, што яшчэ заставалася, адсюль было вывезена ў Маскву, у склепы сабора Васілія Блажэннага. У 1920 годзе па настойлівых патрабаваннях вернікаў і духавенства ікону вярнулі ў Жыровічы, астатняе ж разам з архівам і бібліятэкай у 30 тысяч царкоўных і манастырскіх кніг страчана назаўсёды.

У перыяд нямецкай акупацыі (пачалася з верасня 1915 года і працягвалася амаль сорак месяцаў) у апусцелых манастырскіх будынках пэўны час размяшчаліся нямецкія вайсковыя казармы і стайні, сад спілоўваўся на дровы. Наогул на ўсёй мясціне вайна пакінула свой разбуральны след. Але камяніцы храмаў і нязначная частка царкоўнай маёмасці ўцалелі, нават зрэдку тут і ў вайну правіліся набажэнствы.

Пасля вайны, калі Слонімшчына апынулася ў складзе Польшчы, сіламі і на сродкі прыхаджан жыровіцкія цэрквы былі адноўлены і адрамантаваны, паступова набыта маёмасць. Праваслаўны рэлігійны асяродак працягваў існаваць.

Польскія ўлады большасць колішніх будынкаў манастыра канфіскавалі, у прыватнасці ў трохпавярховых карпусах колішняй духоўнай семінарыі размясцілі польскую сельскагаспадарчую і лясную школу, да якой адышлі і іншыя збудаванні. Крыжаўзвіжанскую царкву-кальварыю захапілі католікі. Вялася барацьба за цудатворную ікону і некаторыя будынкі комплексу. Аднак, нягледзячы на шматлікія настойлівыя захады тутэйшых улад і каталіцкага духавенства, насельніцтва адстаяла свяшчэнную мясціну. У былой

Заходняй Беларусі Жыровічы заставаліся адным з важнейшых рэлігійных цэнтраў праваслаўя. Сюды з'язджаліся вернікі нават з-за межаў Беларусі, асабліва на фэсты — прастольныя святы, і ў першую чаргу на 7 (20) мая. За некалькі дзён да свята калоны з соцен і тысяч людзей, што трымалі ў руках царкоўныя харугвы, крыжы, абразы, з песнямі сцякаліся сюды на шчырую малітву і паклон святой іконе і старым царкоўным мурам, якія падзялялі долю народа на працягу стагоддзяў.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да СССР 17 верасня 1939 года сітуацыя ў краі рэзка змянілася, ды не ў лепшы бок. Праследаванні святароў, рэпрэсіі і безнаказанае хуліганства ў адносінах да храмаў і веры мелі месца ўжо ў першыя месяцы савецкай улады. Атэістычная прапаганда мела свае нядобрыя вынікі. Верачы афіцыйным уладам і «братам з усходу», людзі пачалі ўстрымлівацца ад наведвання храмаў. Асабліва гэта ўплывала на моладзь — яна, толькі хаваючыся, працягвала традыцыі продкаў. Станавілася модным выступаць супраць веры і храмаў, супраць той маралі, якую несла рэлігія. Апусцелыя і абкладзеныя вялізарнымі падаткамі святыні паступова зачыняліся. Нямала служыцеляў культу загінула ці трапіла ў канцлагеры. Жыровічы, аднак, працягвалі служыць сімвалам праваслаўнай веры, супрацьстаяць штурму атэізму і насілля.

Новая хваля веры пракацілася па тутэйшых мясцінах ў гады другой сусветнай вайны, калі пажары, расстрэлы і акупацыйны рэжым трымалі насельніцтва ў напружанні і страху. На скрыжаванні дарог амаль паўсюдна ставіліся драўляныя высокія крыжы, і вечарамі каля іх агароджы збіраліся людзі і маліліся, спявалі рэлігійныя песні. Паступова пачыналі працаваць храмы.

Не затухала ў Жыровічах праваслаўнае рэлігійнае жыццё і ў пасляваенныя гады, хоць многія будынкі савецкая улада канфіскавала. Так, напрыклад, карпусы былой духоўнай семінарыі на гэты раз заняў сельскагаспадарчы тэхнікум, да яго адышлі гаспадарчыя будынкі манастыра. У 1945 годзе пры манастыры адкрыліся багаслоўскія курсы, а на базе іх у 1947-ым створана духоўная семінарыя (названая затым Мінскай). Кіраўніцтва семінарыяй і манастыром ажыццяўлялі архімандрыт Мітрафан (Гутоўскі), якога ў 1953 годзе змяніў архімандрыт Лявонцій (Бондар), і протаіерэй Іван Сокаль. У 1956 годзе намеснікам манастыра і рэктарам семінарыі стаў архімандрыт Антоній (Мельнікаў), што прабыў на гэтай пасадзе да закрыцця семінарыі ў 1963 годзе.

У 1989 годзе пры Свята-Успенскім манастыры зноў пачала працаваць Мінская духоўная семінарыя. Рэктарам

яе цяпер з'яўляецца епіскап Навагрудскі Канстанцін. Установе вернута частка канфіскаваных калісьці будынкаў. У канцы 50-ых гадоў на тэрыторыі манастыра быў узведзены новы корпус семінарыі.


Жыровіцкая святыня з комплексам храмавых і манастырскіх пабудоў, што захаваліся да нашых дзён, цікава не толькі як унікальны рэлігійны асяродак, але і як помнік архітэктуры і гісторыі, як сімвал складанага і нялёгкага лёсу беларусаў. Гэта цудоўны астравок нашай яшчэ не раскрытай да канца, непазнанай, але вельмі каштоўнай духоўнай спадчыны.

Тут дарэчы будзе зрабіць кароткі агляд асноўных аб'ектаў комплексу як помнікаў архітэктуры.

Свята-Успенскі сабор. Узведзены ў 1565—1616 гадах, як галоўны храм манастыра. Гэта велізарны мураваны аднакупальны будынак з паўакруглай алтарнай часткай. Даўжыня яго звыш 55 і вышыня каля 40 метраў. Першапачатковы выгляд храма ні ў апісанні, ні ў гравюрах не захаваўся, а зазнаў ён не менш трох рэканструкцый. Яшчэ ў час будаўніцтва былі паменшаны задуманыя памеры, што прыкметна на ступеньчатай муроўцы апсіды. Затым выгляд збудавання значна змяніўся пасля разбурэння яго казакамі Б. Хмяльніцкага ў 1655 годзе. З пяцікупальнага сабор стаў фактычна трохкупальна-вежавым. А ў выніку апошняй рэканструкцыі, якая праводзілася з 1821 да 1867 года, набыў сучасны выгляд. З галоўнага фасада зусім зніклі характэрныя для колішняга храма вежы-купалы, у будынка з'явіліся рысы класічнай візантыйскай архітэктуры. Сляды ранейшых формаў удаецца прасачыць па рэштках вежаў, што ўцалелі ў падстрэшшы, і па адноўленых купальных скляпеннях. Інтэр'ер сабора ў асноўным захаваўся, акрамя іканастаса. З паўднёвага боку храма была прыбудавана заглыбленая ў зямлю царква-цяпліца, якая спачатку называлася Васільеўскай, а затым перайменавана ў **Мікольскую.**

Богаяўленская (Яўленская) царква. Заснавана ў 1672 годзе. (Па невядомай прычыне дата ўзвядзення яе цяпер перанесена амаль на сто гадоў — аж у 1769-ы.) Гэта прамавугольны цагляны бязвежавы адназальны будынак памерам 8 × 20 метраў. Над двухсхільным дахам узвышаецца невялікі цыбулепадобны купал на драўляным барабане. Ці існаваў купал раней — невядома. Галоўны фасад аздоблены паўкалонамі і фігурным шчытом. Сціплыя памеры і выгляд тлумачыцца, верагодна, абставінамі, у якіх будавалася царква. Працяглы час яна была адзіным дзеючым храмам Жыровіцкай святыні.

Крыжаўзвіжанская царква-кальварыя. Узведзена ба-



Від на Жыровіцкую святыню з манастырскага саду.
Здымак 1960 г.




Успенскі сабор



Богаяўленская царква



Крыжаўзвіжанская царква-кальварыя



Юр'еўская царква

зыльянамі ў 1769 годзе пад уплывам тагачасных каталіцкіх традыцый. Уяўляе сабой мураваны адназальны храм з высокай званіцай у выглядзе трох'яруснай вежы над галоўным фасадам і малой вежай над двухсхільным дахам алтарнай часткі. Прадаўгаватая прамавугольная зала перакрыта цыліндрычнымі скляпеннямі, напалову занята суцэльнай лесвіцай да алтара. Працягам яе з'яўляецца ілюзорная выява на сцяне, што стварае ўражанне глыбіні інтэр'ера. Распяцця, якое завяршала панараму, цяпер не існуе.

Юр'еўская царква. Пабудавана на старых могілках у канцы XVIII стагоддзя. Праглядваецца з любога канца паселішча. Драўляны прамавугольны ў плане будынак з алтарным прырубам цяпер ашаляваны і пакрыты двухсхільным дахам. Галоўны фасад завяршае трохвугольны шчыт з фігурнай вежачкай.

Калісьці на Юр'еўскія святы тут збіралася мноства людзей з навакольных вёсак. Тыя фэсты не абходзіліся без кірмашоў, гульняў, прадстаўленняў. Сюды прыязджалі мастакі і народныя ўмельцы.

Званіца. Узведзена не пазней XVIII стагоддзя і часткова рэканструявана ў пачатку XIX стагоддзя. Размяшчаецца



Званіца

на плошчы супраць галоўнага фасада Успенскага сабора. Уяўляе сабой мураванае прамавугольнае ў плане ўступчатае двух'яруснае збудаванне, дзе ніжняя частка нагадвае капліцу, а верхняя — даволі прасторную званіцу, завершаную паўсферычным купалам з цыбулепадобнай галоўкай на драўляным барабане.

Жылы корпус манастыра. Двухпавярховы мураваны будынак з малымі келлямі і больш прасторнымі святліцамі ўзводзіўся ў канцы XVII — пачатку XVIII стагоддзя. Мае няправільную прамавугольную планіроўку. Верхняй галерэяй злучаны з Успенскім саборам.

Корпус былой Жыровіцкай семінарыі і ўпраўлення епіскапа. Гэты трохпавярховы мураваны гмах будаваўся ў некалькі прыёмаў у XVIII стагоддзі. Архітэктурны дэкор яго сціплы і строгі. Планіровачна корпус дзеліцца на тры часткі, злучаныя паміж сабой агульнымі калідорамі. Працяглы час памяшканні адбіралі ў манастыра польскія і савецкія ўлады пад дзяржаўныя навучальныя ўстановы.

У архітэктурны манастырскі комплекс уваходзіць шэраг мураваных гаспадарчых збудаванняў, а таксама ўзведзены ў 50-ыя гады нашага стагоддзя новы корпус духоўнай семінарыі.

НЕКАЛІ ГРОЗНАЯ МЯСЦІНА

Нават не верыцца, што сучасная вёска Крэва, што на поўдні Смаргоншчыны, калісьці з'яўлялася сталіцай палітычна ўплывовага ўдзельнага княства, важным эканамічным цэнтрам краю, грознай крэпасцю. Менавіта тут 14 жніўня 1385 года была падпісана Крэўская унія — саюз Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага, якая на некалькі стагоддзяў вызначыла гістарычны лёс гэтых дзяржаў.

Знаёмства з Крэвам хвалюе кожнага, хто завітае ў тыя мясціны, асабліва калі чалавек неабыякавы да сваёй гісторыі, свайго мінулага. Незвычайным здаецца тут усё: і глыбокая даліна, усыпаная вялізнымі камянямі, і стромыя схілы ўзвышшаў над рэчкай Крэвянкай, і магутныя земляныя валы сярэдневяковага гарадзішча, што нагадваюць аб неспакойным мінулым, і найперш руіны калісьці грознага мураванага замка. Апынуўшыся тут, міжволі адчуваеш подых стагоддзяў, бачыш магутную разбуральную сілу часу, усведамляеш, як неабходна захаваць для будучыні, для нашчадкаў гэтыя суровыя сведкі гісторыі.

У пісьмовых крыніцах Крэва ўпамінаецца ўжо ў XIII стагоддзі як цэнтр Нальшанскай зямлі, Недзе прыблізна тады было даўмацавана новымі абарончымі збудаваннямі



Сярэдневяковае гарадзішча ў Крэве

старое гарадзішча над Крэвянкай, што і цяпер прыцягвае ўвагу сваёй магутнасцю. Метраў на 20 узнімаецца яно над далінай, а авальную пляцоўку (36 × 48 метраў) з усіх бакоў акружаюць 4—5-метровай вышыні валы. Уваход на тэрыторыю гарадзішча знаходзіўся з паўночнага боку, дзе прыкметны разрыў вала. Тут жа, на схіле ўзвышша, відаць сляды старажытнага могільніка, які выкарыстоўваўся абарончымі ўмацавання. Акрамя магутных земляных валоў гарадзішча-замчышча мела яшчэ і драўляную агароджу з абарончымі вежамі. Але, відаць, у канцы XIII стагоддзя такая цытадэль ужо не адпавядала абарончым патрабаванням часу. Драўляныя збудаванні, якія лёгка пляжыліся агнём і не спынялі крыжацкіх знішчальных набегаў, аджывалі свой век, тым больш на славянскім парубежжы, дзе варожая пагроза з часам нарастала. Патрабаваўся замак, чые б сцены процістаялі любым атакам і вытрымлівалі нават працяглую аблогу. А яшчэ неабходна была вада, што з'яўлялася і найлепшым сродкам барацьбы супраць агню. Менавіта такі шчыт-замак і ўзводзіўся ў Крэве з актыўным удзелам Гедыміна і яго сына Альгерда ў пачатку XIV стагоддзя. Тады Крэва ўжо не толькі было


яўна выражаным цэнтрам Крэўскай зямлі са сваімі абарончымі традыцыямі, эканамічнымі і культурнымі сувязямі, але і вылучалася значнымі людскімі рэсурсамі, здольнымі весці вялікія будаўнічыя работы і забяспечваць належную абарону.

Месцам для каменнай крэпасці выбралі ледзь прыкметнае ўзвышша ў даліне ракі Крэвянкі — там, дзе ў яе ўпадаў безназоўны ручай, пасля названы Шляхцянкай. Адразу ж прадугледжваўся невысыхаючы стаў унутры замка. У плане ўмацаванне мела форму неправільнага чатырохвугольніка з дзвюма рагавымі мураванымі абарончымі вежамі, размешчанымі па дыяганалі. Наўкола ішоў шырокі вадзяны роў. Увогуле крэпасць нагадвала рыцарскі замак крыжакоў, у ім захоўваліся традыцыі абарончага будаўніцтва ўсходніх славян, выражаныя ў першую чаргу ў наяўнасці магутнай вежы, якая дамініравала над усім комплексам, і ў іншых формах.


Абвадныя сцены вышынёй да 12 метраў і таўшчынёй каля 2,7 метра выкладваліся з буйных каменняў на вапнавай рошчыне і мелі даўжыню адпаведна каля 85, 108, 72 і 97 метраў. На вышыні больш за 4 метры яны абмуроўваліся з вонкавага боку цэглай. З унутранага боку на вышыні каля 10 метраў па ўсяму перыметру ішлі баявыя галерэі з байніцамі для вядзення бою.

Брама, якая вяла ў замак, размяшчалася ў паўночнай сцяне, запасны (патаемны) выхад быў, відаць, з паўднёвага боку за ставам.

Да вугла паўночнай сцяны звонку побач з брамай прымыкала магутная чатырохпавярховая мураваная вежа (названая Вялікай або Княжацкай) — прамавугольнае ў плане збудаванне 17 × 18 метраў вышынёй да 25 метраў. Каменныя сцены трохметровай таўшчыні звонку абкладзены цэглай. Як адзначалася, вежа мела чатыры ярусы і цокальнае памяшканне. Гэта абарончае збудаванне служыла і сядзібай князя, ва ўсякім разе пачынаючы з 1338 года. Магчыма, таму і выдзяляліся архітэктурным афармленнем верхнія паверхі (другі і трэці) вежы. Вялікія паўцыркульныя вокны яе больш нагадвалі вокны палаца. Фактычна вежа ўжо пры будаўніцтве планавалася не толькі як абарончае збудаванне, хоць такая мэта праследавалася ў першую чаргу, але і як сядзіба феадала, і як адміністрацыйны цэнтр. Недзе на другім паверсе была спецыяльна абсталяваная службовая княжацкая зала, дзе чыніліся рады, наладжваліся прыёмы. Тут жа вяліся перамовы і былі заключаны ўмовы згаданай Крэўскай уніі. Трэці паверх (ён выдзяляецца падкрэсленай дэкаратыўнасцю) адводзіўся пад княжацкія жыллёвыя палаты. З



Руіны Крэўскага замка



Рэшткі Княжацкай вежы

яго праглядвалася не толькі ўсё ўмацаванне, але і наваколле. Першы і чацвёрты паверхі займалі слугі і варта.

Уваход у вежу меўся толькі з тэрыторыі замка, але з мэтай яшчэ большай бяспекі змрочнае памяшканне цокаля было прыстасавана як яма-пастка і астрог. У гэтым падзямеллі згасла не адно жыццё нежаданых князям людзей. Асабліва згадзіўся астрог самалюбіваму і ўладнаму Ягайлу. Па яго таемнаму загаду тут па-здрадніцку задушылі вялікага князя Кейстута (роднага дзядзьку!), што атрымаў спадчыннае права на княжанне. А праз пэўны час сюды ж кінуў Ягайла і сына Кейстута — свайго стрыечнага брата князя Вітаўта. Энергічнага нашчадка велікакняжацкай улады чакаў лёс бацькі, толькі вынаходлівасць і смеласць уратавалі яго ад расправы.

У замку мелася яшчэ Малая вежа, напэўна, дабудаваная пазней у процілеглым па дыяганалі куце двара. Яна была значна меншая за Княжацкую, не перавышала 16 метраў. Прызначалася, верагодна, для службаў княжацкага намесніка, які з'яўляўся і начальнікам крэпасці. Ад гэтай вежы да брамы вяла шырокая брукаваная вуліца, абапал

яе стаялі драўляныя будынкі дружыны, чэлядзі і рамеснікаў. Далей у глыб двара месціліся гаспадарчыя пабудовы. Быў тут і свой калодзеж, побач — стаў. Цераз роў супраць брамы перакідваўся рухомы мост.

За некалькі соцень метраў на поўдзень ад замка ўзвышаецца Юркава горка. У тыя далёкія часы яна, напэўна, адыгрывала немалую ролю ў агульным абарончым комплексе старажытнага паселішча, бо і цяпер дамінуе над мясцовасцю.

Лёс замка ў значнай ступені абумовіў лёс Крэва. Прыблізна ў 1338 годзе Гедымін перадаў замак сыну Альгерду, які і жыў тут да 1345 года. Ад Альгерда мясціна перайшла да яго сына Ягайлы. Замак у той час выконваў функцыі важнай стратэгічнай крэпасці краю, а Крэва стала цэнтрам значнага ў палітычным сэнсе ўдзельнага княства. Пры такіх умовах горад хутка рос і ператвараўся ў эканамічны, палітычны і культурны цэнтр Вялікага княства Літоўскага, прыцягваючы з блізкага і далёкага навакольля рамеснікаў, купцоў і вольны люд. Гандлёвыя шляхі звязвалі Крэва з Вільняй, Ашмянай, Менскам, Лідай і іншымі гарадамі.

Але нядоўга квітнела і развівалася маладая сталіца. Стаўшы польскім каралём, Ягайла ў 1387 годзе перадаў княства і замак свайму брату Аляксандру-Віганду, пасля смерці якога ў 1391 годзе яно страціла значэнне ўдзелу, а Крэва ператварылася ў звычайны горад, падначалены велікакняжацкаму намесніку. Паступова згасалі яго гандлёвыя і культурныя сувязі. Прыходзіў ў заняпад і непрыступны калісьці замак. А ў 1433 годзе муры часова захапілі атрады бунтарнага Свідрыгайлы, што змагаўся за велікакняжацкую ўладу з Жыгімонтам.

У 1503—1506 гадах Крэва моцна пацярпела ад нападу крымскіх татараў. З тае пары гучная слава замка пачала паступова заціхаць, хоць у сярэдзіне XVI стагоддзя тут яшчэ некаторы час жыў князь Андрэй Курбскі, які ўцёк з Расіі. Не ўратавала Крэва ад заняпаду і наданае яму ў XVII—XVIII стагоддзях магдэбургскае права.

Асабліва значныя разбурэнні нанесла замку нямецкая акупацыя і трохгадовая лінія фронту ў першую сусветную вайну. Праўда, і да гэтага ён ужо сто гадоў ляжаў у руінах, быў зусім непрыгодны ні для абароны, ні для жылля. Пасля вайны польскія ўлады правялі частковую кансервацыю збудавання. Аднак прайшоў час, і ад тых работ не засталося і следу.


Разбураецца помнік і цяпер, на што хацелася б звярнуць увагу Таварыства аховы помнікаў і мясцовых улад.

У 1981 годзе падчас камандзіроўкі ў Смаргонь мне

ўдалося даследаваць замак і археалагічныя аб'екты навакольля. Стоячы ля тых мураў, сэрцам адчуваў боль за непапраўныя страты такой багатай гістарычнай спадчыны, страты дарагой памяці аб продках, іх славе.


КАЛІ І КІМ ЗБУДАВАНЫ ХРАМЫ-КРЭПАСЦІ

На беларускай зямлі архітэктурныя помнікі з пяцівекавой гісторыяй — рэдкасць. Вельмі шмат ліхалецця пранеслася над краем. Але нібы насуперак усяму больш за пяць стагоддзяў стаяць на Гродзеншчыне два храмы-крэпасці: адзін узвышаецца на мяжы Зэльвенскага і Слонімскага раёнаў, побач з вёскай Сынковічы, другі — на мяжы Шчучынскага і Лідскага раёнаў, недалёка ад вёскі Малое Мажэйкава (цяпер паблізу храма — чыгуначная станцыя Скрыбаўцы). Гэта мураваныя праваслаўныя цэрквы з магутнымі сценамі, вуглавымі абарончымі вежамі, вінтавымі лесвіцамі ўнутры іх, складанай сістэмай байніц, высокімі франтонамі, упрыгожанымі дэкаратыўнымі нішамі, і стромым дахам. Ужо некалькі стагоддзяў збудаванні прыцягваюць увагу вучоных загадкавасцю, але пакуль грунтоўна не даследаваліся. Загадкавага ж у іх шмат: і знешні выгляд — па форме нагадваюць старажытны замак, і само падабенства двух помнікаў між сабой, хоць раздзелены яны немалой адлегласцю, і размяшчэнне — на водшыбе ад важнейшых шляхоў і населеных пунктаў, і цаглянае, а не драўлянае будаўніцтва, што было неўласціва тагачасным праваслаўным вясковым храмам, і мудрагелістае дэкаратыўнае афармленне. А галоўнае — як стала магчыма на сціплыя ахвяраванні вясковага прыхода ўзвесці такія велічныя камяніцы? Да таго ж надта заблытаныя звесткі аб часе заснавання і фундатарах цэркваў. Праўда, паводле некаторых старажытных дакументаў, дата іх узвядзення вызначалася даволі канкрэтная. У адносінах да Сынковіцкага храма называўся 1407 год, а да Маламажэйкаўскага яшчэ больш дакладна: 10 мая 1407 года. З гэтай нагоды ў маі 1907 года шырока адзначаўся 500-гадовы юбілей царквы, што, відаць, і штурхнула польскага археолага Юзэфа Ядкоўскага на знаёмства з помнікамі і пісьмовымі матэрыяламі аб іх, якія тады яшчэ можна было адшукаць у царкоўных архівах або кансісторыі. Вынікам яго даследавання з'явіўся апублікаваны ў 1915 годзе артыкул «Цэрквы, прыстасаваныя да абароны ў Літве і Літоўскай Русі», дзе даваліся апісанні аб'ектаў і некаторыя



Сынковіцкі храм. Сучасны выгляд

гістарычныя даведкі аб іх. Даследчык меў на мэце звязаць узнікненне храмаў з канкрэтнымі асобамі — мясцовымі ўладальнікамі, але звестак аб памешчыках у ваколіцах Сынковічаў і Малога Мажэйкава ў гістарычнай літаратуры і дакументах XV стагоддзя не знайшоў. Першыя ўпамінанні аб такіх адносіліся ўжо да XVI стагоддзя. У адной з крыніц згадвалася дата будаўніцтва Маламажэйкаўскага храма (1407 год) і ўказвалася, што ён узведзены Шымком Мацкевічам. Фактычна ж, як змог устанавіць Ю. Ядкоўскі, Мацкевіч жыў у XVI стагоддзі. Дата, прыведзеная ў дакуменце, і гады жыцця нібыта фундатара царквы разыходзіліся на стагоддзе. Належала згаджацца або з названай дакументамі датай заснавання храмаў, або з указаным там імем фундатара — тутэйшага памешчыка. І Ю. Ядкоўскі абраў апошні, бо разумеў: такое будаўніцтва ў глухамані было непасільна вясковым прыхаджанам на іх мізэрныя ахвяраванні, ды і недарэчна. Помнікі вельмі адрозніваліся па архітэктуры ад сельскіх праваслаўных храмаў. Падобныя збудаванні маглі фінансаваць толькі заможныя памешчыкі. Тыя меркаванні і вызначылі напрамак пошуку матэрыялаў і накіраванасць логікі мыслення вучонага. Многія факты не стыкаваліся, але іх можна было абысці маўчаннем ці прыкрыць разважаннямі.



Фрагмент паўднёвага фасада Маламажэйкаўскага храма

Ю. Ядкоўскаму ўдалося адшукаць некалькі пісьмовых крыніц аб Маламажэйкаўскай царкве, вакол якіх і складвалася схема яго вывадаў. Так, ён спасылаецца на дакумент 1648 года і дае такую вытрымку: «Отец Феодосий Воротынский, протопоп Лидский, до книг метрополитальных... в Новогрудку будучи, покладал и ку актыкованью подал лист ограничный церкви Мало-Можейковской Мурованой грунтов, лесов сеножатей, самого седлиска и прочих принадлежностей, сходно старо-давнаго фундушу, учыненнаго чрез зошлого его милости пана Шимка Мацкевича Шкленскаго, подконюшаго Виленского, державцы Ушпольскаго, Пенянского и Радунскаго, наданых и належачих на тую ж церковь Мурованую, а повете Лидском лежачую и им побудованую року 1407 Мая 10 дня». Далей даследчык цытуе дакумент 1542 года: «Я, Шимко Мацкевич, подконюший Виленский, державца Ушпольский, Пенянский и Радунский, ознаймую всим посполите теперешным и на потом будучым, кому бы то ведати належало, иж надаю на церковь Божю мурованую в повете Лидском лежачую, Можейковскую з Именя мого дворного Можейкова Великого с пашни своей дворной от жыта, ячменя и пшеницы десятую копу записываю теж (з будынком) з полем з сеножатю, которое поле на пять бочок и тож поле Нечуйковщизна, которое поле на тры бочки. Который колвек у тое церкви свещенник будет, повинен будет за мое здорове и за моих прырожоных в четвер молебен светому Миколе пети (отправить-вар), а в суботу службу Божью и панихиду пети ни в чым не выступуючи з того постановеня моего, а свещенник, который коли колвек будет на тые дни ладан и просвиры а по смерти моеи жона моя и дети мое тое если их мети буду так теж и близные мое и хтоз кольвек в прыйдущий век тое имене мое Можейков Велики в повете Лидском лежачое держати будет с того постановеня моего ни в чом не выступаючы мают во светию десятину до тое церкви давать, так теж жона и дети мое мают дати чоловека, службу на име Андрейца Василевича и з детьми его в туюж церковь выж речоную. А хто бы парушыл той мой запис штом я записал ку Пречистой Божой Матце, той со мною разсудится перед Богом. Писан в Можейкове, Лета от воплощеня Сына Божего тысеча петсот сорок второго двадцать осмого мсца мая».

Як бачым, другі тэкст — завяшчанне Мацкевіча — складзены ахвярадаўцам, калі храм ужо існаваў і памешчыку Шымку Мацкевічу не належаў. Бо калі б ён узводзіўся гэтым памешчыкам і належаў яму, то ці была б патрэба ў падобным дакуменце? Значыць, Мацкевіч не прычыніўся

да будаўніцтва царквы і жыў значна пазней, паколькі ў завяшчанні нават не згадвае, калі і кім яна заснавана.

Першы ж прыведзены дакумент пісаўся больш чым праз дзвесце гадоў пасля згаданай у ім даты будаўніцтва храма і сто гадоў пасля напісання Мацкевічам свайго завяшчання. І калі другі — сведчанне свайго часу, то першы — пераказ іншых сведчанняў, прытым, відавочна, не зусім дакладных. Адносна даты ўзвядзення храма сумненняў не ўзнікае. Відаць, пратапоп Варатынскі карыстаўся надзейнымі і дакладнымі звесткамі ці пісьмовымі крыніцамі, інакш не называў бы чысло і месяц, у тым фактычна не было неабходнасці, хапіла б і года. Праўдзіва ўказвае ён і на завяшчанне Шымка Мацкевіча, учыненае на карысць царквы. А вось кароткае слова «им» («им побудованую») або ўстаўлена ў тэкст зацікаўленай асобай пазней, або памылкова напісана аўтарам, бо прайшло ўжо шмат часу і, верагодна, асоба фундатара сцерлася з памяці народнай і ў дакументах не значылася.

Такім чынам, выснова Ю. Ядкоўскага, скіраваная на перанясенне даты будаўніцтва Маламажэйкаўскага храма на стагоддзе пазней — з XV у XVI — і дапасаванне часу ўзвядзення такога нетрадыцыйнага, але вельмі падобнага на далёкі Сынковіцкі храм збудавання да перыяду жыцця памешчыка Шымка Мацкевіча, выглядала зусім неперакананаўчай. Гэта змусіла аўтара шукаць дадатковыя аргументы для падмацавання сваёй пазіцыі. Так, даследчык раіць звярнуць увагу на архітэктурныя формы і дэталі маламажэйкаўскай царквы, каб пераканацца ў тым, што яна заснавана не раней першай паловы XVI стагоддзя. Вучоны параўноўвае яе са збудаваннямі, узведзенымі ў XVI стагоддзі, у прыватнасці з Мірскім замкам, але чамусьці не з храмам у Ішкалдзі (1472) цяперашняга Баранавіцкага раёна ці храмам у Сапежышках (XIV) на сучаснай тэрыторыі Летувы.

Між іншым, прыводзіць Ю. Ядкоўскі і наступнае паведамленне: «Пры ўкладцы дашчанай падлогі ў час рамонту царквы ў 1871—1872 гадах (да таго часу падлога была цагляная) знаходзілі шмат пахаванняў пад цэглай, і на некаторых з іх меліся каменні з выбітымі на іх крыжамі, абведзенымі кругамі. На адным камені аказаўся надпіс: «Христов раб иерей Авраам» і выбіты год 1469. Дарэчы, камень той пакінуты на тым жа месцы. Ён сведчыць, што ў 1469 годзе пад падлогаю Маламажэйкаўскай царквы, ужо безумоўна існаваўшай, быў пахаваны, магчыма, адзін з першых яе духоўных служыцеляў іерэй Авраам. Факты пахавання пад падлогаю храмаў заслужаных людзей не адзінкавыя. Ускоснае пацвярджэнне

таго — мармуровая дошка, умураваная ў паўднёвую сцяну царквы недзе ў пачатку XIX стагоддзя, з наступным надпісам (яго прыводзіць Ю. Ядкоўскі):

D.O.M.
MORTALIBUS EXUVIZS
I.M.D. SZYMKO MASKO JUNDZILLOVICZ
M.N.M.D.L.
HIC AB AO MDLXXXIV. QVIESCENTIS
FUNDATORIS ECCLESIA HUIUS
I.M.D. CASIMIRUS KOSTROVICKI
CO. ET HERES CIS COLLATOR
AEDE SACRA RESTAURATA
HOC MONUMENTUM MDCCCVIII
D.D.D.

Дошка з'яўляецца пазнейшым надмагільным помнікам нейкіх родзічаў Шымка Мацкевіча (чамусьці Юндзіловіча), памёршага ў 1584 годзе. Родзічы, відаць, мелі зацікаўленасць і лічылі продка фундатарам царквы, што пацвярджаецца надпісам. Яны маглі ўнесці і дапіску ў прыведзены вышэй дакумент Феадосія Варатынскага.

Паколькі Маламажэйкаўскі і Сынковіцкі храмы згадваліся пісьмовымі крыніцамі як адначасовыя збудаванні, Ю. Ядкоўскі ў сваёй публікацыі не мог абысці Сынковіцкі помнік маўчаннем.

На жаль, у архіве Сынковіцкай Міхайлаўскай царквы самымі старажытнымі аказаліся яе «Генеральная візіта» 1720 года, метрычны запіс з 1762 года і апісанне царквы, складзенае кобрынскім ігуменам Андрэем Бенецкім у 1746 годзе. Традыцыйна ж лічылася, што храм збудаваны ў 1407 годзе. Але кім? На гэтае пытанне адказу не было, успамінаў не захавалі ні людзі, ні дакументы.

Паводле Ю. Ядкоўскага, многія даследчыкі, каго цікавіла мінулае Сынковіцкай царквы, спрабавалі даведацца, каму ў XV—XVI стагоддзях належаў маёнтак Сынковічы, уладальнік якога заснаваў храм-замак. Пошукі дакументаў вынікаў не далі.

Як зазначае вучоны, у актах Літоўскай метрыкі маецца вельмі цікавая грамата 1576 года, што датычыць Сынковічаў, а менавіта «Привилей Пану Ивану Есману на торг в ден недельный в ыменью его Сынковичах». Ім кароль Стэфан Баторый дазваляў у паселішчы ярмаркі ў нядзелю і корчмы, пазбаўленыя збораў на карысць казны. Даследчык адразу ж робіць выснову: устанаўліваць кірмашы ў вёсцы, дзе няма царквы, было б недарэчна, таму факт існавання Сынковіцкай царквы ў 1576 годзе

неабвержны. А грамата была дадзена Есьману, верагодна, праз некалькі гадоў пасля заканчэння працяглага будаўніцтва храма. Такім чынам, Ю. Ядкоўскі лічыў, што яму ўдалося выявіць не толькі тутэйшага ўладальніка канца XVI стагоддзя, але і ўстанавіць, што царква ў Сынковічах узводзілася вельмі доўга і завяршыліся работы пры памешчыку Івану Есьману прыблізна ў 70-ыя гады XVI стагоддзя. Іншых дакументаў, падмацоўваючых такі вывад, аўтар не прыводзіў. Напэўна, яны адсутнічалі. Але гэтага было дастаткова, каб сцвярджаць, што храм заснаваны ніяк не раней пачатку XVI стагоддзя.

Нават у такіх адвольных вывадах аўтар дапускаў вялікую разбежку ў часе заканчэння будаўніцтва: пачатак стагоддзя — і 70-ыя гады. Для пераканання ў верагоднасці сваіх меркаванняў Ю. Ядкоўскі зноў жа прыбягаў да параўнання і называў Троіцкую царкву ў Вільні, Кодэнскую царкву, той жа Мірскі замак, якія ўзводзіліся ў пачатку XVI стагоддзя і мелі шмат канструктыўных элементаў, падобных на сынковіцкія. Гэта ў першую чаргу тычылася дэкаратыўнага афармлення фасадаў, хаця вядома, што ў будаўнічай практыцы мінулага асобныя дэталі маглі выкарыстоўвацца ў пэўных варыяцыях на працягу стагоддзяў.


Дарэчы, спасылаючыся на крыніцы, даследчык прыводзіць наступнае паведамленне: «Айцец Е. Міхайлоўскі на адным з малых званоў (Сынковіцкай царквы.— *В. С.*) знайшоў надпіс: «ANNO DOMINI 1460». Аднак нібы не звяртае на дату ніякай увагі. А між іншым, ніколі званы не заказваліся задоўга да будаўніцтва храма, калі, можа, нават ідэі такой не існавала. Напрошваецца думка: храм у Сынковічах у час адліўкі звана ўжо мусіў існаваць і, можа, не адзін дзесятак гадоў.

Такім чынам, вывады зробленыя Ю. Ядкоўскім на аснове прыведзеных ім сведчанняў, не толькі непераканаўчыя, але і спрэчныя, яўна тэндэнцыйныя. І іх можна было б не ўлічваць, калі б не сенсацыйная папулярнасць і жывучасць менавіта падказанага вучоным падыходу да датавання помнікаў і ў наш час.

Амаль усе даследчыкі архітэктуры ў адзін голас заяўляюць: і Сынковіцкі, і Маламажэйкаўскі храмы ўзніклі ў самым канцы XV — пачатку XVI стагоддзя. Праўда, не гавораць, ці будавалі іх названыя Ю. Ядкоўскім памешчыкі. Гэта значыць, успрынята палова вывадаў польскага археолага, а яны грунтуюцца на фундатарскай аснове. Атрымліваецца, што публікацыя Ю. Ядкоўскага — найбольш аўтарытэтнае даследаванне, якое датуе гэтыя

цікавейшыя архітэктурныя помнікі Беларусі. А яно, аб чым ужо гаварылася, выклікае сур'ёзныя сумненні.

Прыведзеныя Ю. Ядкоўскім сведчанні больш схіляюць да думкі аб будаўніцтве абедзвюх цэркваў не памешчыкамі Мацкевічам і Есьманам, а па ініцыятыве і на сродкі адной нейкай вельмі ўплывовай і заможнай асобы і ў адзін час. На гэта ўказваюць і падабенства храмаў, і аддаленасць іх ад старых населеных пунктаў, і сімвалічны вонкавы выгляд.



Фрагмент франтона і вежы Сынковіцкага храма

Думаецца, датаванне помнікаў толькі на аснове параўнання іх з іншымі аб'ектамі без уліку ініцыятара ўзвядзення — малапераканаўчае. Тлумачэнне, быццам з'явілася новая традыцыя ў вясковым храмавым будаўніцтве, згодна з меркаваннямі некаторых даследчыкаў, гэтак жа не апраўдана, як і магчымасць заснавання такіх храмаў сіламі і сродкамі сельскіх прыходаў. Па ўсім відаць, ініцыятарам і фундатарам цэркваў была асоба з патрабаваннямі і густам не радавога памешчыка. Магчыма, мелі месца нейкія ахвяраванні, модныя ў магнацкіх і княжацкіх сем'ях у XV—XVI стагоддзях. Паводле гістарычных згадак, не толькі кароль Ягайла і вялікі князь Вітаўт ахвяроўвалі на ўзвядзенне храмаў вялікія сродкі, але і іх жонкі і нават прыбліжаныя. Напрыклад, стараннямі жонкі Вітаўта Ганны Святаславаўны ў Брэсце збудавана Крыжаўзвіжанская царква, якая ў пісьмовых дакументах упамінаецца пад 1412 годам. Нямала падобных дароў учыніла і каралева Бона.

А калі так, то ўзнікае пытанне: каму ж сталася пасільна будаўніцтва храмаў-крэпасцей у аддаленасці ад значных населеных пунктаў і тагачасных цагляных промыслаў? Прытым, як мяркуецца, цэрквы ўзводзіліся не з мэтай пашырэння праваслаўя, а з нейкай сімвалічнай мэтай. Інакш яны мусілі б стаяць у паселішчах і не насцярожваць вернікаў сваім ваенным выглядам. Праваслаўю такое не ўласціва.

Немалаважным у гэтай сувязі з'яўляецца і наступны гістарычны факт. Калі ў 1382 годзе князь Вітаўт, пераапрануты ў адзенне жанчыны-служанкі, уцёк з крэўскага астрога, то, ратуючыся ад пагоні карных атрадаў Ягайлы, ён накіраваўся на поўдзень і пэўны час, пакуль існавала пагроза, хаваўся ў глухіх беларускіх закутках. Недзе са Слонімшчыны, дзе да таго княжыў яго бацька князь Кейстут, Вітаўт таемна накіраваўся за падтрымкай і дапамогай да крыжакоў. Ужо стаўшы вялікім князем, ён неаднаразова наведваў Слонімшчыну. Быў тут і ў 1407 і ў 1409 гадах. Магчыма, падзеі, звязаныя з тым трывожным і рызыкоўным часам у жыцці князя, і паслужылі прычынай заснавання згаданых храмаў як крэпасцей-сімвалаў на месцах найбольшых небяспек. У 1407 годзе спаўнялася роўна 25 гадоў з часу яго выратавання ад ганебнай расправы ад рукі стрыечнага брата.

Ускоснымі доказамі таго, што абодва храмы ўзведзены па ініцыятыве і волі вялікага князя Вітаўта, могуць служыць і данесенае пісьмовымі крыніцамі датаванне 1407 годам, і адсутнасць вядомай насельніцтву канкрэтнай асобы фундатара (будаўніцтва ажыццяўлялася за кошт вялікага князя, г. зн. дзяржавы), і візіт Вітаўта з жонкай у тым годзе на Слонімшчыну, і сімвалічнасць форм, і падабенства цэркваў, і размяшчэнне воддаль ад старых шляхоў, у глухіх мясцінах, і выкарыстанне асобных (пачатковых) рыс готыкі, зусім неўласцівых праваслаўным храмам той пары, і выгляд абарончага замка пры адсутнасці іншых прыкмет, спрыяючых абароне, і традыцыйнае аб'яднанне ў народнай памяці абодвух помнікаў, нібы архітэктурных блізнят, і нейкая таямнічасць, якая ўвогуле ахутвае збудаванні. Вялікі князь мог не тлумачыць насельніцтву прычыны свайго ахвяравання і чаму святыням нададзена такая форма.

ТУТ УЛАДАРЫЛІ САПЕГІ

Найважнейшай славутасцю пасёлка Ружаны, што ў Пружанскім раёне Брэстчыны, з'яўляюцца рэшткі вялікага архітэктурнага комплексу на пагорку побач з рачулкай. Гэта руіны колішняга палаца, помніка XVI—XVIII стагод-


дзяў. Гісторыя тых збудаванняў непадзельна звязана з радаводам вядомых магнатаў Сапегаў, якія ў мінулыя стагоддзі ўпарта сапернічалі з Радзівіламі і Агінскімі за дзяржаўныя тытулы, палітычны ўплыў і ўладу ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай. Сапегам належалі палацы не толькі ў Ружанах, але і ў Дзятлаве, Дзярэчыне і іншых мясцінах Беларусі. У гістарычнай літаратуры ёсць звесткі, што ўжо ў пачатку XVI стагоддзя яны мелі ў Ружанах (Ржаной) багатыя ўладанні. Сюды ў госці да Яна Сапегі, ваяводы падляшскага, прыязджаў нават польскі кароль Жыгімонт Стары. А ў 1617 і 1644 гадах тут гасцяваў кароль Уладзіслаў IV, якога прымалі канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега і яго сын Казімір.

Ружанскі палацавы комплекс — вынік працы не аднаго пакалення майстроў і архітэктараў. Ён узводзіўся і перарабляўся на працягу амаль трох стагоддзяў. Галоўны двухпавярховы крыжападобны корпус палаца будаваўся ў асноўным у XVI стагоддзі, хоць работы працягваліся яшчэ і ў пачатку XVII стагоддзя. Пачаткова палац меў тры вежы, якія надавалі яму выгляд замка. У цэнтры будынка размяшчаліся парадныя залы і вестыбюль з лесвіцай на другі паверх, у бакавых частках — жылыя пакоі і рабочыя кабінеты, архіў і бібліятэка. Пад палацам знаходзіліся двухпавярховыя скляпеністыя падвалы. Кожны каралеўскі візіт прыносіў уладальнікам новыя дароўныя граматы і пашыраў багацці, у гонар і памяць аб чым у вялікай параднай зале ўстанаўліваліся мармуровыя дошкі з адпаведнымі надпісамі.

Староста слонімскі Леў Сапега (Ружаны ўваходзілі ў Слонімскае староства) адначасова займаўся добраўпарадкаваннем мястэчка. Пры ім ў паселішчы з'явіліся мураваны Троіцкі касцёл (існуе і цяпер) і некалькі збудаванняў на тагачасным рынку, былі выбрукаваны вуліцы і пад'езды да палаца, пасаджаны бульвары.

У 1698 годзе войскі шляхецкіх канфедэратаў разбурылі Ружаны, а збудаванні палаца моцна пашкодзілі. Шведскі кароль Карл XII, захапіўшы паселішча 14 красавіка 1706 года (ішла Паўночная вайна), убачыў яго зруйнаваным і зусім апусцелым.

Не скора вярнуліся ў палац раскоша і бляск. Хоць аднаўляўся ён ужо ў першай палове XVIII стагоддзя, грунтоўную ж перабудову ажыццявіў канцлер Аляксандр Сапега ў 70—80-ыя гады. У выніку пашкоджаныя вежы разабралі, а да галоўнага параднага фасада прыбудавалі накладны порцік са спаранымі калонамі і вуглавымі пілястрамі, завершаны высокім трохвугольным франтонам са скульптурным афармленнем, што надавала палацу



Від на парадную браму і галоўны корпус палаца ў Ружанах

большую велічнасць і прыгажосць. Адначасова ўзводзіліся новыя збудаванні. Абапал параднага двара перпендыкулярна палацу выраслі двухпавярховыя мураваныя карпусы, якія злучаліся з ім паўцыркульнымі ў плане аркадамі. Ва ўсходнім корпусе размясціўся прыдворны тэатр, у заходнім — карцінная галерэя. Уезд на парадны двор вёў праз трохпралётную трыумфальную браму, упрыгожаную разнымі геральдычнымі картушамі з моранага дубу. Брама злучалася з двума двухпавярховымі мураванымі жылымі флігелямі. Такім чынам, вакол двара ўтвараўся замкнуты ланцуг будынкаў. Тут жа былі разбіты аранжарэі і дэкаратыўныя алеі сквера. Усе гападарчыя і дапаможныя пабудовы вынесены за межы ансамбля, куды выходзілі бакавыя вароты. На стылі архітэктурнага комплексу адбіліся рысы позняга барока і класіцызму. У рамонтных работах прымаў удзел прыдворны архітэктар магнатаў Ян Самуэль Бекер.

У адноўленым палацы 12 верасня 1784 года Аляксандр Сапега прымаў апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, які накіроўваўся на сейм у Гродна.

З найбольш важных культурных каштоўнасцей палаца варта адзначыць вялікую бібліятэку, багаты рукапісны

архіў, а галоўнае — тэатр. Пісьменнік Юльян Нямцэвіч, які па запрашэнні канцлера прысутнічаў на оперным спектаклі трупы, вельмі станоўча ацаніў і дэкарацыі, і ігру акцёраў — сялянскіх дзяцей, выхаваных пры мясцовай прыдворнай школе.

З 1786 года пры палацы працавалі невялікая фабрыка шаўковых паясоў, шпалераў, абрусаў з гербамі і суконная фабрыка. Апошняя праіснавала амаль да паловы XX стагоддзя.

Аднак ужо ў канцы 80-ых гадоў палац у Ружанах пачаў траціць сваё значэнне, а яго гаспадары перабраліся ў Дзярэчын. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795), калі Ружаны і Дзярэчын адышлі да Расійскай імперыі, Сапегі ўцяклі ў Францыю, кінуўшы свае ўладанні. У 1810 годзе палац і фабрыкі ў Ружанах за 1000 рублёў набыў нейкі яўрэй Пінас.

Цудоўныя будынкі архітэктурнага комплексу выкарыстоўваліся пад жыллё і цэхавыя памяшканні суконнага прадпрыемства. Унутраная планіроўка, а часткова і фасады палаца ўвесь час змяняліся — гэтага вымагала вытворчасць. Для фабрычнай каналізацыі былі выкарыстаны падвалы, а ў некаторых з іх сушыліся сыравіна і прадукцыя. На першым паверсе галоўнага корпуса жылі гаспадары фабрыкі, а на другім — месціліся склады. Будынкі ніколі капітальна не рамантаваліся.

На фабрыцы Пінасаў у канцы мінулага стагоддзя працавала каля 200 рабочых, якія ўжо з 1903 года вялі барацьбу за паляпшэнне сваіх умоў працы і эканамічнага становішча. Асабліва актывізаваўся тут рабочы рух ў 1905 годзе.

У жніўні 1914 года ад пажару, што пачаўся ў драўлянай прыбудоўцы, дзе знаходзіўся памывачны цэх, згарэў галоўны корпус колішняга палаца. Але невялічкая ткацкая фабрыка існавала тут да 1944 года, пакуль яе не спалілі немцы падчас адступлення з горада. У мураваных флігелях пры параднай браме да 1965 года размяшчаўся кафельны цэх. Затым усе будынкі некалі цудоўнага архітэктурнага ансамбля былі закінуты, і час стварыў свой разбуральны прысуд. На жаль, гэта агульны лёс усёй нашай спадчыны, нашай культуры ў страшны гістарычны перыяд «будаўніцтва светлай будучыні».

ЛІТАРАТУРА

Антоний (Зубко) архиепископ. Воспоминания о греко-униятской церкви в Западном крае. СПб., 1889.

Антоний (Мельников) митрополит. Жировицкий монастырь в истории западнорусских епархий. (Рукопись). Одесса, 1964.

Батюшков П. Н. Белоруссия и Литва. СПб., 1890.

Волкайте-Куликаускене Р. К вопросу этнической принадлежности грунтовых могильников Центральной Литвы I—VIII вв. н. э.: Проблемы этногенеза и этнической истории балтов. Вильнюс, 1985.

Восстание 1863—1864 гг. в Литве и Белоруссии: (Материалы и документы). М., 1964.

Всеобщая история архитектуры. М., 1968. Т. 6.

Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья. М.-Л., 1962.

Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1990.

Жукович П. Н. Неизданное русское сказание о Жировицкой иконе Божией Матери // Изв. отд. рус. яз. и словесности. СПб., 1912. Т. 17. Кн. 2.

Жучкевич В. А. Топонимия как источник исследования этногенеза белорусов // Этногенез белорусов. Мн., 1973.

Збор помнікаў гісторыі і культуры. Брэсцкая вобласць. Мн., 1984.

Збор помнікаў гісторыі і культуры. Гродзенская вобласць. Мн., 1986.

Зверуго Я. Г. Археологические работы в Слониме // Беларускія старажытнасці. Мн., 1972.

Иодковский И. И. Церкви, приспособленные к обороне в Литве и Литовской Руси // Древности. Тр. комис. по сохранению древ. памятников, состоящей при Императ. моск. археол. о-ве. М., 1915. Т. 6.

Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 1. Памятники каменного века. Мн., 1968.

Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 3. Памятники бронзового века. Мн., 1976.

Караткевіч В. Б., Калугін А. М. Помнікі Слоніма. Мн., 1983.

Кочубинский А. Территория доисторической Литвы // Журн. М-ва нар. просвещения. 1891, № 1.

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.). Мн., 1959.

Малышевский И. И. Западная Русь в борьбе за веру и народность. СПб., 1898. Ч. 2.

Мелешко В. Слоним: Ист. очерк. Мн., 1962.

Мельниковская О. Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. М., 1967.

Митрофанов А. Г. Территория распространения и проблема происхождения культуры штрихованной керамики // Тезисы докладов по археологии Белоруссии. Мн., 1969.

Моор Х. А. О древней территории расселения балтийских племен // Сов. археология. 1958. № 2.

Нидерле Л. Славянские древности. М., 1956.

Николай (Редуто) архим. Жировицкая чудотворная икона Божей Матери и Жировицкая обитель. Вильна, 1867.

Пех Г. И. Раскопки древнего Слонима // Древности Белоруссии. Мн., 1966.

Полное собрание русских летописей. СПб., 1843. Т. 2.

Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы. Мн., 1955.

Римантене Р. К. Стоянки раннего неолита в юго-восточной Литве // Древности Белоруссии. Мн., 1966.

Рылко М. И., Шпыркова И. Г. Слоним: Ист.-экон. очерк. Мн., 1981.

Седов В. В. Археология и проблема формирования белорусов // Этногенез белорусов. Мн., 1973.

Смірноў А. П. Кастусь Каліноўскі ў паўстанні 1863 года. Мн., 1959.

Супрун В. Г. Памятники каменного века и эпохи бронзы в бассейне среднего течения р. Щары. // Древности Белоруссии. Мн., 1966.

Таутавичюс А. З. Балтские племена на территории Литвы в I тысячелетии н. э. // Из древней истории балтских народов. Рига, 1980.

Топоров В. Н., Трубачев О. Н. Лингвистический анализ гидронимов Верхнего Поднепровья. М.: АН СССР. 1962.

Третьяков П. Н. Восточнославянские племена. М., 1953.

Филин Ф. П. Образование языка восточных славян. М.-Л., 1962.

Чантурия В. А. Архитектурные памятники Белоруссии. Мн., 1982.

Чистович М. Очерки истории западнорусской церкви. СПб., 1884. Т. 2.

Штыхов Г. В. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 2. Памятники железного века и эпохи феодализма. Мн., 1971.

Aleksandrowicz Br. Z przeszlosci Slonima i ziemi Slonimskiej. Slonim, 1939.

Antoniewicz W. Pradzieje ziem Polskich Polska, jej dzieje i kultura.T. 1.

Balinski M., Lipinski T. Starozytna Polska... Warszawa, 1846. T. 3.

Charkiewicz W. Rok 1812. Slonim, 1939.

Goldberg G. Zarys dziejow miasta Slonima. Slonim, 1934.

Iwaszkiewicz J. Litwa w roku 1812. Krakow, 1912.

Kozlowska-Studnicka J. Rok 1831. Slonim, 1939.

Lorentz St. Wycieczki slonimskie. Slonim. 1933.

Lowmianski H. Studja nad poczatkami spoloczenstwa i panstwa Litewskiego. Wilno, 1931. T. 2.

Slownik geograficzny Krolewstwa Polskiego i innych krajow slowianskich. Warszawa, 1889. T. 10.

ЗМЕСТ

Слова пра аўтара 3
Прыцягненне (Замест прадмовы) 5
Ці балцкі ў нас субстрат? 24
Называліся літвінамі 43
Загадкавае племя 46
Варыяцыі на тэму росаў (русаў) 49
Імёны нашых далёкіх продкаў 55
Штрыхі з мінулага Слонімшчыны 56
Ад зямлі Услонімскай 56
У складзе Расійскай імперыі 76
Год 1812-ы 79
Пярэдадзень паўстанцкіх падзей 84
Трывожныя 1831-ы і 1833-і 86
У час пераломны 96
Жыровіцкая святыня 107
Некалі грозная мясціна 124
Калі і кім збудаваны храмы-крэпасці 130
Тут уладарылі Сапегі 138
Літаратура 142

Навукова-папулярнае выданне

СУПРУН Васіль Рыгоравіч

ЗА СМУГОЮ ЧАСУ
(Даследаванні і меркаванні)

Загадчыца рэдакцыі *Л. І. Круглова*
Рэдактар *В. І. Дрозд*
Мастацкі рэдактар *І. А. Дзямкоўскі*
Фота аўтара
Тэхнічныя рэдактары *М. І. Ванкевіч, С. І. Стараверава*
Карэктары *Я. А. Лукошка, Л. К. Сямёнава*

Набор і вёрстка выкананы на камп'ютэрнай тэхніцы выдавецтва «Полымя». Падпісана да друку 23.02.94. Фармат 84 × 1081/32. Папера друк. № 2. Гарнітура "Тип Таймс". Афсетны друк. Ум. друк. арк. 7,56. Ум. фарб.-адб. 7,86. Ул.-выд. арк. 8,21. Тыраж 9000 экз. Выд. № 9071. Зак. 5082. Выдавецтва «Полымя» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 432. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11. Друкарня «Победа». 221023, Маладзечна, В. Таўлая, 11.